Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 25 снежня 1981 г. ● № 52 (3098) ● Выходзіць з 1932 г. ● Цана 8 кап.

Зімовыя забавы.

Фотаэцюд Э. ЭЛЬКСІНА.

ПОСТУП ТЫДНЯ

БІЯГРАФІЯ, ЯКАЯ СТАЛА БІЯГРАФІЯЙ КРАІНЫ

Ва ўсіх бібліятэках рэспублікі ў гэтыя дні афармлены кніжныя выстаўкі, прысвечаныя 75-годдзю з дня нараджэння Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева. Мовай кніг, публікацый з газет і часопісаў, шматлікага ілюстрацыйнага матэрыялу расказваецца пра змястоўны жыццёвы шлях чалавека, які з'яўляецца верным прадаўжальнікам спраў Уладзіміра Ільіча Леніна, прыкладае ўсе сілы і намаганні для таго, каб савецкі народ жыў радасна, шчасліва, у міры і дружбе.

Вялікая кніжная выстаўка «Гэта нашай краіны біяграфія» працуе ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна. Амаль трыста кніг, партрэтаў, фотадакументаў, ілюстрацый, газетных і часопісных артыкулаў прадстаўлена на ёй. Кожны з гэтых матэрыялаў — яркі штрых да біяграфіі Леаніда Ільіча Брэжнева.

Першы раздзел выстаўкі — «На пераломе эпох» — праўдзівы і хвалюючы расказ аб тым, як у былой царскай Расіі наспявалі рэвалюцыйныя падзеі, як расійскі пралетарыят ішоў у авангардзе барацьбы за новае жыццё. Сярод гэтых змагароў былі і рабочыя-металургі Каменскага — горада, у якім таварыш Л. І. Брэжнеў нарадзіўся, горада, дзе ён вырас, далучыўся да актыўнага працоўнага жыцця. Шматлікія матэрыялы і расказваюць аб гэтым перыядзе, калі пачатак працоўнай біяграфіі Леаніда Ільіча супаў з першымі крокамі маладой Савецкай Рэспублікі. «...Па нацыянальнасці я рускі, па паходжанні — карэнны пралетарый, патомны металург», — піша Л. І. Брэжнеў у сваіх «Успамінах».

У наступным раздзеле змешчаны экспанаты, у якіх адлюстраваны даваенны перыяд жыцця Л. І. Брэжнева. Уступленне ў рады ленінскай партыі ў 1931 годзе, праца на заводзе, вучоба ў металургічным інстытуце, кіраўніцтва рабфакам. Сапраўды, «гэта нашай краіны біяграфія», сапраўды, гэта біяграфія ўсяго савецкага народа.

З асаблівым хваляваннем чытачы знаёмяцца з раздзеламі «1418 вогненных дзён і начэй», «На адроджанай зямлі» і «Урокі цаліны». Кнігі Л. І. Брэжнева «Малая зямля», «Адраджэнне», «Цаліна», А. Грэчкі «Бітва за Каўказ», зборнік матэрыялаў «Подзвіг Новарасійска», газеты, часопісы. Што ні матэрыял, то праўдзівы расказ праз жыццё, вартае самых велічных палотнаў, жыццё-подзвіг. У імя Радзімы, у імя свайго народа, у імя будучыні ўсяго чалавецтва. І ў гады вайны, і ў мірны час Л. І. Брэжнеў быў і застаецца салдатам, які заўсёды знаходзіцца на пярэднім краі змагання за свабоду, незалежнасць, шчасце.

Заключныя раздзелы гэтай прадстаўнічай выстаўкі — праўдзівы расказ аб той сапраўды тытанічнай рабоце, якую праводзіць Л. І. Брэжнеў, будучы Генеральным сакратаром ЦК КПСС і Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, аб яго найвялікшым укладзе ў справу міру і міжнароднай разрадкі.

У экспазіцыі — работы Л. І. Брэжнева не толькі на рускай мове, але і на беларускай, пераклады на мовы народаў свету. Увесь свет чытае творы вернага марксіста-ленінца, і ўвесь свет прыслухоўваецца да яго голасу — голасу чалавека і камуніста, які верыць у будучыню чалавецтва і робіць усё для таго, каб будучыня гэта не была азмрочана новай вайной. Характэрныя лічбы — толькі ў нашай краіне кнігі Л. І. Брэжнева выдаваліся 1882 разы на 82 мовах народаў СССР і замежных мовах агульным тыражом 115 мільёнаў экземпляраў.

З выстаўкай «Гэта нашай краіны біяграфія» пазнаёміліся ўжо сотні наведвальнікаў.

ТЭМАТЫЧНЫ ПАКАЗ ФІЛЬМАЎ

У кінатэатрах беларускай сталіцы, палацах культуры і клубах працягваецца тэматычны паказ хранікальна-дакументальных фільмаў «Партыя — розум, гонар і сумленне нашай эпохі». Сярод стужак асаблівую цікавасць у наведвальнікаў выклікаюць тыя, у якіх расказваецца пра яркае жыццё таварыша Л. І. Брэжнева, яго змаганне за справу міру і міжнародную разрадку.

У праграме паказу фільмы «Уручэнне Залатога медаля міру Л. І. Брэжневу», «Бязмежны давер партыі і народа», «Леанід Ільіч Брэжнеў у Казахстане», «Візіт Л. І. Брэжнева ў Чэхаславакію», «Брэжнеў у Баку» і іншыя.

КНІГА-ПАДРУЧНІК, КНІГА-ПРЫКЛАД

У актавай зале Глускай санаторна-лясной школы адбылася чытацкая канферэнцыя па новай кнізе Л. І. Брэжнева «Успаміны». «Аўтар успамінаў, — сказаў настаўнік В. Лаўрыновіч, — удзячны лёсу за тое, што ён даў яму «ўрокі жыцця і на сялянскім полі і пад дахам завода». Кніга гэтая — падручнік жыцця для кожнага».

На канферэнцыі выступілі ветэраны вайны В. Зайцава, Г. Ерашэнкаў, а таксама настаўнікі Л. Саковіч, Н. Коўганава. Члены школьнага літаратурнага аб'яднання «Званок» гаварылі аб жыцці Л. І. Брэжнева.

У заключэнне была паказана літаратурна-музычная кампазіцыя «Слава сыну працоўнага народа».

В. АФОНІН.

МАГУТНЫ СТЫМУЛ

Камуністы Саюза пісьменнікаў Беларусі на адкрытым партыйным сходзе, які адбыўся 22 снежня ў Доме літаратара, абмеркавалі задачы партыйнай арганізацыі, што вынікаюць з рашэнняў лістападаўскага (1981) Пленума ЦК КПСС і прамовы, з якой выступіў на ім Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў.

У сваім дакладзе сакратар партыйнага бюро СП БССР В. Адамчык нагадаў аб патрабаваннях партыі да літаратараў на сучасным этапе будаўніцтва камунізму ў нашай краіне, прааналізаваў стан паасобных жанраў у беларускай літаратуры, заклікаўшы таварышаў па пяру актыўней развіваць баявую пісьменніцкую публіцыстыку.

Прамоўцы, якія выступілі ў абмеркаванні даклада, — адказны сакратар часопіса «Беларусь» Ф. Собаль, пісьменнікі-камуністы Л. Гаўрылкін, М. Гіль, Г. Далідовіч, І. Шамякін, — горача адобрылі рашэнні лістападаўскага Пленума ЦК нашай партыі, успрыняўшы іх разам з палажэннямі, сфармуляванымі ў прамове Л. І. Брэжнева, як праграму дзеяння і магутны стымул для творчасці пісьменнікаў Савецкай Беларусі.

З УЗНАГАРОДАЙ!

За заслугі ў развіцці беларускай савецкай кінематаграфіі, тэатральнага мастацтва і ў сувязі з сямідзесяціпяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў пісьменніка ГУБАРЭВІЧА Канстанціна Лявонцьевіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

ЭКСЛІБРЫС У ВІЛЬНЮСЕ

У вільнюскім Палацы выставак адкрылася традыцыйная, ужо трэцяя па ліку, выстаўка экслібрыса Літвы, Латвіі і Эстоніі, арганізатары якой запрасілі прыняць удзел у ёй у якасці гасцей беларускіх мастакоў. Свае работы паказалі 11 майстроў кніжнага знака з Мінска. Вялікую цікавасць у наведвальнікаў выклікалі экслібрысы братоў У. і М. Басалыгаў, А. Кашкурэвіча, М. Лазавога, М. Селешчука, Г. Ціхановіча.

М. МІНКЕВІЧ.

«ЖЫВОЕ СЛОВА» — ЮБІЛЯР

У спісе народных калектываў сталіцы нашай рэспублікі значыцца тэатр «Жывое слова» Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. Арганізаваў гэты калектыў кандыдат педагагічных навук, дацэнт А. Каляда.

Гэтымі днямі ў інстытуце адбылося ўшанаванне тэатра з нагоды яго 15-годдзя. У госці да самадзейных артыстаў прыехалі вучні з Блонскай і Мар'інагорскай сярэдняй школы № 2, над якімі шэфствуе калектыў; настаўнікі, якія, будучы студэнтамі, займаліся ў гэтым тэатры.

Шмат аб чым нагадалі самадзейныя артысты ў той вечар. За гэтыя гады падрыхтаваны праграмы «У сям'і адзінай», «Ленін і цяпер жывей за ўсіх жывых», «Вянок» (прысвечана М. Багдановічу), «Памятайце, людзі», «Людзьмі звацца», «Любоў зямная» і іншыя.

Па пуцёўках ЦК ЛКСМБ тэатр неаднаразова выступаў на камсамольскіх будоўлях. За вялікую плённую работу па прапагандзе мастацкага слова, высокія творчыя дасягненні і актыўны ўдзел у культурным абслугоўванні працоўных яму прысвоена званне народнага.

Закончыўся вечар выступленнем удзельнікаў калектыву.

К. УЛАДЗІМІРАЎ.

АГЛЯД АГІТБРЫГАД

«Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!» — пад такім дэвізам на Віцебшчыне праходзіць абласны агляд-конкурс агітацыйна-мастацкіх брыгад і агіттэатраў.

Цікавыя праграмы і даволі высокае выкананне паказалі на занальным аглядзе ў Глыбокім агіткалектыў «Веснік» мясцовага раённага Дома культуры, агітбрыгады «Рытм» Пятроўшчынскага сельскага Дома культуры Глыбоцкага раёна, «А што ў вас?» Павяцкага сельскага Дома культуры Міёрскага раёна.

Арганізавана прайшоў агляд у Полацкай зоне. Тут паспяхова выступіла агітбрыгада «Веснік» Зялёнкаўскага сельскага Дома культуры, калектыў Полацкага РДК і агітбрыгада цэха № 6 завода шкловалакна.

Адзначаны таксама агітбрыгады «Глыбачаначка» Глыбачанскага сельскага Дома культуры Ушацкага раёна, калектыў Ушацкага РДК за праграму «Справы казачныя» і агітбрыгада вучэбна-вытворчага камбіната пры РДК.

Усе гэтыя калектывы будуць прымаць удзел у заключным туры агляду-конкурсу ў Віцебску.

В. БАЖАНАЎ.

ПІСЬМЕННІК, БАЕЦ, ТРЫБУН

Восемдзесят гадоў назад нарадзіўся вялікі савецкі пісьменнік, чалавек надзвычайнай душэўнасці і тактоўнасці, палымяны камуніст-ленінец Аляксандр Фадзееў, аўтар шырокавядомых твораў «Маладая гвардыя», «Разгром», «Апошні з Удэгэ» і іншых. Увогуле, ягоная творчасць — яркая, на дзіва змястоўная старонка ў гісторыі ўсёй савецкай шматнацыянальнай літаратуры. Гэтаксама значная і сама асоба А. Фадзеева, жыццё якога таксама варта кніг.

Пра шматграннасць таленту пісьменніка, пра яго мастакоўскую празорлівасць, пра чалавечнасць і прынцыповасць і ішла гаворка ў Доме літаратара на ўрачыстым вечары, прысвечаным 80-годдзю з дня нараджэння А. Фадзеева. Прыгадваліся таксама цесныя сувязі яго з беларускай зямлёй, якую ён любіў.

Адкрыў вечар і вёў сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР і Літаратурнай прэміі імя А. Фадзеева І. Чыгрынаў. Слова пра А. Фадзеева сказалі народны пісьменнік Беларусі І. Шамякін, П. Кавалёў, М. Лужанін, У. Юрэвіч. Артысты мінскіх тэатраў выканалі фрагменты з твораў пісьменніка.

Фота Ул. КРУКА.

ТАКОЕ НЕ ЗАБЫВАЕЦЦА

«Чалавек на вайне» — так называўся гэты вечар, што адбыўся ў Доме літаратара. Беларускія пісьменнікі, сярод якіх нямала ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, члены іх сем'яў, журналісты сабраліся, каб ва ўрачыстай абстаноўцы адзначыць 40-годдзе разгрому нямецка-фашысцкіх войск пад Масквой.

Адкрыў вечар і вёў намеснік начальніка палітычнага ўпраўлення Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, пісьменнік А. Сульянаў. Народны пісьменнік Беларусі І. Шамякін, пісьменнікі Р. Няхай, Л. Прокша, А. Русецкі і іншыя гаварылі аб значэнні перамогі пад Масквой, аб тым вялікім укладзе, які ўнёс савецкі народ у разгром гітлераўцаў, вызваліўшы не толькі сваю зямлю, а і выканаўшы гістарычную місію па вызваленні народаў Еўропы ад карычневай чумы нямецкага фашызму. Пісьменнікі-франтавікі прыгадвалі эпізоды са сваіх баявых біяграфій.

На здымку: вядзе вечар А. Сульянаў.

Фота Ул. КРУКА.

У САЮЗНЫМ ДРУКУ

У дзесятым нумары «Библиотечки «Красная звезда» змешчаны лепшыя нарысы пра камандзіраў Савецкай Арміі, — творы гэтыя ў свой час публікаваліся на старонках газеты. Сярод іх нарыс Міхася Парахневіча «Таварыш камандуючы».

●

Пад рубрыкай «Дыялогі» ў дзесятым нумары часопіса «Литературное обозрение» прапанавана гутарка В. Іпатавай з народнай паэтэсай Узбекістана Зульфіёй. У «Дыскусійным клубе» з артыкулам «Галактыка душы» выступае Н. Шляхавая. Сярод іншых аўтараў яна разглядае творы А. Адамовіча і В. Быкава. У гэтым жа нумары М. Тычына рэцэнзуе раман В. Адамчыка «Чужая бацькаўшчына», які выйшаў у перакладзе на рускую мову ў выдавецтве «Советский писатель».

ВАСІЛЬ КОРЖ — ЛЕГЕНДА І РЭАЛЬНАСЦЬ

Сярод апошніх работ беларускіх кінематаграфістаў фільм «Трэцяга не дадзена», створаны рэжысёрам І. Дабралюбавым па сцэнарыі А. Асіпенкі, М. Пяцігорскай і І. Балгарына, па праву карыстаецца заслужанай папулярнасцю ў шматлікіх гледачоў. Цікавасць іх выклікае ўжо само жыццё галоўнага героя стужкі — праслаўленага партызанскага камандзіра, а потым старшыні калгаса ў роднай вёсцы Васіля Захаравіча Каржа.

Васіль Корж — легенда і рэальнасць... Корж у жыцці і Корж на экране... Пры абмеркаванні фільма аб гэтым часта ідзе гаворка. І тады стваральнікі стужкі прыходзяць гледачам на дапамогу, расказваючы аб сваёй працы над фільмам, аб мастацкім увасабленні вобраза В. Каржа.

Адно з такіх абмеркаванняў адбылося нядаўна ў рэспубліканскім Доме работнікаў мастацтваў. Прысутныя з цікавасцю слухалі рэжысёра І. Дабралюбава і выканаўцу галоўнай ролі В. Белахвосціка.

На здымку: выступае І. Дабралюбаў.



Г. СЕЧКА.

СОТЫ СПЕКТАКЛЬ «І ЗМОЎКЛІ ПТУШКІ»

Прэм'ера спектакля «І змоўклі птушкі» ў пастаноўцы Б. Эрына на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы адбылася чатыры гады назад. Тады гледачы ўпершыню змаглі далучыцца да складанага жыцця герояў яшчэ аднаго выдатнага твора пісьменніка, у якім, як і ва ўсёй творчасці І. Шамякіна, тэма сучаснасці цесна, востра звязана з тэмай Вялікай Айчыннай вайны, з памяццю аб гадах усенароднага змагання з фашызмам і з памяццю, якая ніколі не даравала і не можа дараваць здрады.

У час сотага спектакля гледачы зноў убачылі сваіх любімых акцёраў — народнага артыста СССР З. Стому, заслужаную артыстку рэспублікі М. Захарэвіч і іншых, дзякуючы майстэрству якіх п'еса набыла доўгае сцэнічнае жыццё. І зноў, як і ў першы раз, у зале не было раўнадушных...

А. ВІШНЕЎСКІ.

На здымку: Іван Пятровіч Шамякін дзякуе ўдзельнікам спектакля.

Фота Ул. КРУКА.

«ЮНАЦТВА»—ДА ЮБІЛЕЯЎ

«Паэзія Я. Купалы — гэта квітнеючы і чароўны сад, дзе сабраны водар беларускай зямлі» — гэтыя словы Якуба Коласа надрукаваны на вокладцы кнігі Янкі Купалы «Лірыка», якая выйшла ў выдавецтве «Юнацтва». Гэты зборнік паэзіі адрасаваны ў першую чаргу чытачам сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту.

Аўтар прадмовы і ўкладальнік кнігі У. Гніламёдаў, мастак М. Купава. Дарэчы, у гэтым выдавецтве сёлета ў серыі «Мая першая кніжка» выйшаў зборнік Я. Купалы «Алеся», а ў «Школьнай бібліятэцы» — трылогія Я. Коласа «На ростанях».

В. АКОЛАВА.

Рыгор Барадулін у Літве

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Рыгор Барадулін часта выязджае за межы рэспублікі, сустракаецца з чытачамі ў розных гарадах Савецкага Саюза. Даўнія сувязі ў яго з зямлёй братняй Літвы. Нядаўна творчыя дарогі зноў прывялі Р. Барадуліна сюды, дзе многае напамінае аб плённасці літаратурных узаемасувязей і культурнага супрацоўніцтва паміж нашымі народамі.

У Вільнюсе адбыўся вялікі літаратурны вечар, прысвечаны 60-годдзю ўтварэння СССР і адначасова творчасці двух паэтаў-пабрацімаў — Р. Барадуліна і лаўрэата прэмій камсамола Літвы і Дзяржаўнай прэміі Літоўскай ССР Альгімантаса Балтакіса. Р. Барадулін на гэты вечар быў запрошаны не выпадкова. Толькі што ў выдавецтве «Вага» ў серыі «Сузор'е» пабачыла свет кніга яго выбраных паэтычных твораў «Бусел на страсе», якую на літоўскую мову пераклаў А. Балтакіс.

На вечары А. Балтакіс расказаў аб плённасці творчых сувязей паміж Беларуссю і Літвой, прачытаў свае вершы, а таксама вершы Р. Барадуліна на літоўскай мове. Творы Р. Барадуліна гучалі і па-руску.

А потым выступіў Р. Барадулін. Ён пазнаёміў прысутных са сваімі перакладамі твораў літоўскіх паэтаў, а таксама прачытаў уласныя творы, прысвечаныя Літве.

Аналагічны вечар прайшоў і ў горадзе Друскініункай.

В. СЯРОДКА.

У ВЯНОК ПАЭТУ

СВЯТКУЕ ЯРАСЛАЎЛЬ...

90-гадовы юбілей М. Багдановіча шырока адзначаны ў горадзе над Волгай. На будынку былой мужчынскай гімназіі, якую закончыў паэт у 1911 г., змешчана мемарыяльная дошка (цяпер тут галоўны корпус універсітэта). У абласной газеце «Северный рабочий» надрукаваны пераклады вершаў Багдановіча на рускую мову («Ізноў пабачыў я сялібы», «Маладыя гады», «Даўно ўжо целам я хварэю»), а таксама юбілейны артыкул В. Рымашэўскага «Калі вырвалася песня на волю».

15 снежня ў актавай зале Яраслаўскага педінстытута імя К. Д. Ушынскага адбыўся агульнагарадскі літаратурны вечар, прысвечаны памяці М. Багдановіча. З дакладам аб жыцці і творчым шляху паэта выступіў дырэктар абласнога мастацкага музея В. Рымашэўскі. Аб выдатнай ролі Багдановіча ў развіцці беларускай літаратуры і культуры, яго наватарскіх пошуках і здабытках, непарыўных сувязях з братнімі славянскімі літаратурамі гаварыў прафесар Мінскага інстытута культуры М. Грынчык.

Паэт В. Зуёнак прачытаў свае вершы, прысвечаныя памяці М. Багдановіча. Яраслаўскія паэты і перакладчыкі Ю. Бародкін, І. Смірноў, М. Глазкоў, Д. Панамарэнко, У. Сокал выступілі з чытаннем сваіх новых твораў.

На ўспамін аб гэтай цікавай сустрэчы і для ўмацавання творчых кантактаў беларускія пісьменнікі падаравалі бібліятэцы педінстытута свае кнігі, газетныя і часопісныя матэрыялы аб святкаванні юбілею ў Беларусі, а таксама факсімільнае выданне славутага «Вянка».

Г. МІХАЙЛАЎ.

ГОРКІ...

Юбілей Максіма Багдановіча шырока адзначаны ў Горкім, былым Ніжнім Ноўгарадзе, дзе аўтар «Вянка» пражыў ледзь не палову свайго жыцця (1896—1908 гг.). Тут ён вучыўся ў гімназіі, далучаўся да культуры, літаратуры, мовы роднай зямлі, здабываў веды, набіраўся паэтычнай моцы. Тут ён, дапытлівы падлетак, разам са сваім бацькам хадзіў у госці да Максіма Горкага, зачаравана слухаў вялікага пісьменніка...

«Горьковская правда», «Ленинская смена», «Горьковский рабочий» да 90-годдзя Максіма Багдановіча змясцілі артыкулы, новыя пераклады яго вершаў, выкананыя горкаўскімі паэтамі. А 16 снежня ў памяшканні абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна адбыўся вялікі літаратурны вечар, прысвечаны выдатнаму беларускаму паэту.

Вечар адкрыў адказны сакратар Горкаўскай пісьменніцкай арганізацыі Іван Бережной. Ён коратка ахарактарызаваў творчасць Максіма Багдановіча, пазнаёміў прысутных з гасцямі — беларускімі літаратарамі, якія спецыяльна прыехалі з Мінска для ўдзелу ў юбілейных урачыстасцях. Затым слова для даклада атрымлівае Вячаслаў Рагойша. Ён падрабязна спыніўся на асноўных момантах жыцця і творчасці класіка беларускай літаратуры, падкрэсліў непераходзячае значэнне гэтай творчасці не толькі для беларускай, але і для еўрапейскай літаратуры. Крытык і літаратуразнавец Таццяна Кабржыцкая расказала пра ролю Максіма Багдановіча ў мацаванні ўсходнеславянскага літаратурнага пабрацімства. Уладзімір Паўлаў і Уладзімір Скарынкін прачыталі свае вершы, прысвечаныя Багдановічу, роднай зямлі, дружбе народаў. Горкаўскі паэт і перакладчык Аркадзь Бараховіч пазнаёміў прысутных з ніжагародскім перыядам жыцця сям'і Багдановічаў. Свае новыя пераклады вершаў Багдановіча прачытаў паэт, дацэнт Горкаўскага універсітэта Генадзь Бядняеў.

На вечары прысутнічалі пляменніцы Максіма Багдановіча Наталля Глебаўна Кунцэвіч, Анастасія Глебаўна Бараховіч і Таццяна Глебаўна Селіваноўская.

У абласной бібліятэцы да юбілею пісьменніка была разгорнута выстаўка кніг і публікацый, прысвечаных творчасці вялікага сына зямлі беларускай. Усеагульную ўвагу звярнуў на сябе славуты «Вянок» з аўтографам паэта, што захаваўся ў сям'і адной з яго пляменніц.

Беларускія літаратары пад час паездкі ў Горкі азнаёміліся з выдатнымі культурнымі мясцінамі горада, наведалі музей А. М. Горкага і М. А. Дабралюбава, майстэрню народнага мастака РСФСР П. І. Гусева. Яны былі прыняты загадчыкам аддзела культуры Горкаўскага абкома партыі Л. В. Сакаловым.

В. КАЧАНОВІЧ.

МАГІЛЁЎ...

Заціхлі чароўныя гукі мелодыі славутай «Зоркі Венеры». У зале ўсталявалася незвычайная цішыня. На сцэне партрэт Максіма Багдановіча з лічбамі «1891 — 1981». За авальным сталом наўкола сядзяць адзінаццаць дзяўчат у белых блузках з узорамі жытнёвых васількоў. Яны па чарзе чытаюць вершы, гавораць пра жыццёвы і творчы шлях паэта.

Ідзе літаратурны вечар «Вянок цудоўных песень», які праводзяць навучэнцы групы «В» другога курса тэатральнага аддзялення Магілёўскага культасветвучылішча імя Н. К. Крупскай пад кіраўніцтвам выкладчыцы А. Галавачовай. А ўступнае слова на вечары зрабіў выкладчык В. Ермаловіч.

Самадзейныя артысты выступілі таксама ў бібліятэчным тэхнікуме імя А. С. Пушкіна, на фабрыцы мастацкіх вырабаў, у прафесійна-тэхнічным вучылішчы горада, у калгасах і саўгасах раёнаў, а потым і ў абласной радыёстудыі.

Літаратурныя вечары, прысвечаныя 90-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, праведзены і ў Магілёўскім педагагічным інстытуце імя А. Куляшова, на прадпрыемствах, ва ўстановах і школах Магілёўшчыны. У абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна, ва ўсіх масавых і школьных бібліятэках афармлены кніжна-ілюстраваныя выстаўкі, праводзяцца агляды літаратуры, прысвечаныя жыццю і творчасці юбіляра.

В. АРЦЕМ'ЕУ.

І МАЛАДЗЕЧНА

На працягу снежня гэтага і студзеня наступнага года ў залах Маладзечанскай музычнай школы будзе экспанавацца выстаўка твораў мастакоў горада, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча. У экспазіцыі прадстаўлена больш чым 65 работ прафесійных мастакоў і навучэнцаў народнай студыі самадзейнай творчасці, якой кіруе Ю. Герасіменка.

Хвалюючым было адкрыццё выстаўкі, якое ператварылася ў сапраўднае свята мастацтваў.

Яшчэ на першым паверсе наведвальнікі ўбачылі выстаўку дзіцячых малюнкаў паводле вершаў Багдановіча, якія выкананы навучэнцамі музычнай школы. Побач прадстаўлена фотадакументальная выстаўка партрэтаў Максіма Багдановіча і яго родных, здымкаў мясцін, дзе жыў паэт.

На другім паверсе «пачыналі» экспазіцыю чатыры яскравыя і паэтычныя вітражы, прысвечаныя Багдановічу. Гэта работы ўдзельнікаў студыі самадзейнай творчасці — Уладзіміра Багданава, Валянціны Буцько, Святланы Гоўзбіт і Святланы Варанішча.

Аснову выстаўкі склалі творы чатырох мастакоў, членаў Саюза мастакоў СССР — сталых майстроў Ядвігі Радзялоўскай і Канстанціна Харашэвіча, і маладзейшых — Аляксандра Пашкевіча і Юрыя Герасіменкі, творы якіх неаднойчы экспаваліся на рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках. Цікава прадстаўлены на выстаўцы жывапісныя і графічныя работамі Мікола Аўчыннікаў, Васіль Лазоўскі, Пётр Гулевіч. Мастацкія творы перамяжоўваюцца ў выставачнай зале з пятнаццаццю лістамі — строфамі з вершаў Багдановіча.

Пасля агляду выстаўкі ў актавай зале адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае юбілею паэта, і святочны канцэрт. Аснову яго склалі песні на вершы Максіма Багдановіча, інструментальныя п'есы і рамансы беларускіх кампазітараў.

Т. ГАРАНСКАЯ.

ВЫСТАЎКІ

ЧАЛАВЕК, ЯКІ ЁН ЁСЦЬ

У Дзяржаўным мастацкім музеі БССР — чарговая выстаўка. На гэты раз лепшымі сваімі творамі прадстаўлены заходнеберлінскі мастак, член праўлення Таварыства германа-савецкай дружбы Заходняга Берліна Крыстаф Ніс. Жывапісныя палотны, гравюры, акварэлі, шматлікія малюнкі творцы можна аб'яднаць адной назвай — «Чалавек, які ён ёсць». К. Ніса цікавіць шматграннае жыццё людзей, тое, што аб'ядноўвае іх сёння, і тое, да чаго яны імкнуцца ў наш неспакойны век, калі з кожным днём усё вастрэй паўстае пытанне захавання міру на планеце, збяражэння цывілізацыі.

Дарэчы, адна з работ К. Ніса так і называецца — «Чалавек, які ён ёсць». Назвы іншых твораў таксама лаканічныя — «Кампучыя», «Узброеныя рабочыя», «Помнік рабочаму»... У экспазіцыі ёсць і тэматычныя цыклы, як, напрыклад, «Бойня ў Чылі».

Т. ШОСТАК.

З КАГОРТЫ ПЕРШЫХ

У аддзеле мастацтва Чарнігаўскага краязнаўчага музея экспануецца зараз выстаўка работ вядомага савецкага графіка З. Гарбаўца, творчая біяграфія якога пачыналася ў нашай рэспубліцы. Ён быў у ліку тых, хто пачынаў беларускую савецкую ксілаграфію. Ураджэнец Чарнігаўшчыны, першапачатковую мастацкую адукацыю ён атрымаў на радзіме, вучыўся ў М. Тарлоўскага, вучня славутага В. Сярова.

З 1923 года лёс звязаў З. Гарбаўца з Беларуссю. Спачатку ён жыў у Мінску, а затым у Віцебску. З'яўляючыся на працягу шасці гадоў выкладчыкам Віцебскага мастацкага тэхнікума, графік шмат часу і сіл аддае творчай рабоце.

У Віцебску З. Гарбавец прымаў актыўны ўдзел у рабоце акружнога таварыства краязнаўства, для якога аформіў два выпускі зборніка «Віцебшчына», зрабіў свае першыя кніжныя знакі.

У 1929 годзе З. Гарбавец едзе ў Маскву, дзе вучыцца ў П. Паўлінава і В. Фаворскага. Зробленыя ім крыху пазней ксілаграфічныя партрэты Я. Купалы і Я. Коласа, У. Лугаўскога, Э. Багрыцкага, Б. Пастарнака, Я. Смелякова, М. Бажана для выдавецтва «Федэрацыя» сталі прыкметнай з'явай савецкай графікі.

У апошнія дзесяцігоддзі З. Гарбавец працаваў у асноўным над ксілаграфічным пейзажам, а таксама выканаў вялікую серыю кніжных знакаў, выдадзеных у 1973 годзе ў выглядзе альбома.

А. ПАДЛІПСКІ.

ЗАХАПЛЕННЕ СТАЛА ПРЫЗВАННЕМ

Аляксей Гамін нарадзіўся на Саратаўшчыне, але назаўсёды свой лёс звязаў з беларускай зямлёй. Цяпер працуе мастаком-афарміцелем ільнозавода, шмат гадоў кіруе гурткам выяўленчага мастацтва Крупскага раённага Дома піянераў, а вольны час аддае творчасці. Хвалюе самадзейнага мастака тэма Вялікай Айчыннай вайны, неўміручы подзвіг савецкага народа ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, нямала работ прысвячае ён нашым сучаснікам, сярод якіх лётчык-касманаўт СССР, ураджэнец Крупскага раёна Уладзімір Кавалёнак.

Асаблівае месца ў творчасці А. Гаміна, займае пейзаж. Такія работы, як «Капгаснае поле», «Пара сенакосная», «Рака Нача», «Пейзаж з возерам» і іншыя, прыцягваюць увагу шчырасцю, непасрэднасцю аўтарскіх інтанацый.

І, вядома, заслугоўвае ўхвалы зварот мастака да вобраза народнага песняра Беларусі Якуба Коласа. А. Гамін наведаў коласаўскія мясціны і стварыў такія карціны, як «Дубы ў Альбуці», «Дом, дзе жыў Я. Колас», «Смольня» і іншыя.

Работы А. Гаміна паказваліся на многіх рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках самадзейных мастакоў, цяпер з імі можна пазнаёміцца ў кінатэатры «Кастрычнік» у Мінску, дзе Мінскі абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы арганізаваў персанальную выстаўку самадзейнага мастака.

А. КОЛЫШ.

НАЗІРАЛЬНАСЦЬ ПЛЮС МАЙСТЭРСТВА

Тыя, хто ў гэтыя дні карыстаецца паслугамі Мінскага аэрафлоту, вольны перад рэйсам час могуць правесці з цікавасцю. Для гэтага дастакова наведаць выстаўку, якая працуе тут жа... у будынку аэрафлоту. «Лясныя знаходкі і фантазія» — так называецца экспазіцыя, падрыхтаваная членам секцыі «Прырода і творчасць» Беларускага таварыства аховы прыроды І. Яцанчуком.

Ветэран вайны і працы, Іосіф Паўлавіч цяпер пенсіянер, знаходзіцца на заслужаным адпачынку. Але, як кажуць, сядзець без справы не можа. Бываючы ў лесе, наведваючы паркі, І. Яцанчук уважліва прыглядаецца да дрэў, адшукваючы карэнні замыславатых перапляценняў, загадкавыя сучкі і галіны. Знайсці іх — дастаткова звычайнай цікаўнасці і назіральнасці, а астатняе ўжо за майстэрствам...

В. СЯРДОБАЎ.

ПАКАЗВАЮЦЬ ДЗЕЦІ

Своеасаблівай творчай справаздачай юных барысаўчан сталі выстаўкі іх твораў, якія адкрыты ў фае кінатэатра «Радзіма», у дзіцячай і стаматалагічнай паліклініках, у вітрыне салон-магазіна. Аўтары іх — навучэнцы гарадской дзіцячай мастацкай школы, гурткоў Дома піянераў, агульнаадукацыйных школ.

Цікавасць гледачоў прыцягваюць жывапіс, лінагравюры, роспіс тканін, інкрустацыя саломкай, самаробкі з прыродных матэрыялаў, вырабы са шкла, чаканка, гравюры, малюнкі.

Г. СТАНКЕВІЧ.

АНКЕТА «ЛіМа»

Прапануем чарговую публікацыю адказаў на пытанні анкеты «ЛіМа», з якой рэдакцыя звярнулася да вядомых навукоўцаў рэспублікі. Нагадаем пытанні анкеты:

1. Якія буйныя змены адбыліся ў вашай галіне, што наблізілі акадэмічную навуку да патрэб народнай гаспадаркі? Якія перашкоды былі на гэтым шляху?

2. Якую ролю, на вашу думку, адыгрывае навукова-тэхнічная рэвалюцыя ў павышэнні ўзроўню навуковых даследаванняў?

3. Што вы можаце сказаць пра інтэграцыю і дыферэнцыяцыю ў галіне фундаментальных навук?

4. Што такое калектыўная праца ў навуцы?

5. Як уплывае прафесія вучонага на фарміраванне яго духоўнага аблічча?

6. Якую ролю ў жыцці сучаснага вучонага-прыродазнаўца адыгрываюць літаратура і мастацтва? Ці задавальняюць яны толькі патрэбу ў прыгожым, ці да таго ж яшчэ з'яўляюцца арганічнай часткай любога творчага працэсу?

ХАТЫЛЁВА Любоў Уладзіміраўна, Акадэмік АН БССР, доктар біялагічных навук, прафесар. Віцэ-прэзідэнт Усесаюзнага таварыства генетыкаў і селекцыянераў. Прэзідэнт Беларускага таварыства генетыкаў і селекцыянераў. Заслужаны дзеяч навукі БССР.

Асоба вучонага — АСОБА чалавека

Л. У. ХАТЫЛЁВА,

дырэктар Інстытута генетыкі і цыталогіі АН БССР

1. У сучаснай навуцы аб жыцці адбываюцца адкрыцці такога маштабу, што яны дазваляюць гаварыць нават пра рэвалюцыю ў біялогіі. Сюды належыць аднесці расшыфроўку кода генетычнай інфармацыі, сінтэз генаў, поспехі ў даследаванні рэкамбінатных малекул ДНК.

Асаблівая цікавасць да генетыкі выклікаецца тым, што яна вывучае асноўныя ўласцівасці арганізмаў, менавіта, спадчыннасць і зменлівасць.

Найбольш інтэнсіўнае развіццё генетыкі ў Беларусі звязана з пераходам у 1953 годзе на работу ў Акадэмію навук і БДУ імя У. І. Леніна акадэміка АН БССР Мікалая Васільевіча Турбіна. Чалавек глыбокай навуковай эрудыцыі, выдатны арганізатар навукі, Турбін за параўнальна кароткі тэрмін не толькі стварыў навуковую генетычную школу, але і паспрыяў шырокаму развіццю даследаванняў па генетыцы ў рэспубліцы.

Ужо ў 1955 годзе ў Інстытуце біялогіі АН БССР ствараецца аддзел генетыкі, які ў 1966 годзе быў пераўтвораны ў асобны інстытут.

Імклівае развіццё генетыкі зрабіла рэвалюцыянізуючы ўплыў на ўвесь комплекс біялагічных навук і прыродазнаўства ў цэлым. Вялізныя дасягненні генетыкі былі ярка прадэманстраваны на XIV Міжнародным генетычным кангрэсе, які адбыўся ў Маскве ў 1978 годзе.

З кожным годам узрастае яе роля ў розных галінах чалавечай дзейнасці, у прыватнасці, медыцыне, сельскай гаспадарцы, ахове навакольнага асяроддзя. Сёння генетыка — гэта тэарэтычная аснова селекцыйных работ па павышэнні прадуктыўнасці сельскагаспадарчых раслін і жывёл.

Выступаючы ў Алма-Аце ў 1974 годзе Л. І. Брэжнеў сказаў: «Сельская гаспадарка мае патрэбу ў новых ідэях, здольных рэвалюцыянізаваць сельскагаспадарчую вытворчасць, у пастаянным прытоку фундаментальных ведаў аб прыродзе раслін і жывёлы, якія могуць даць біялогія, генетыка, малекулярная біялогія».

Побач з традыцыйнымі метадамі скрэшчвання і адбору, селекцыянеры цяпер шырока выкарыстоўваюць метады генетычнага кантралявання тых або іншых функцый арганізма, штучнага павышэння спадчыннай зменлівасці — мутагенезу, аддаленай гібрыдызацыі, генетычнай рэгуляцыі з'яў гібрыднай сілы — гетарозісу. Дарэчы, выкарыстанне апошняга дазваляе за кароткі перыяд павысіць ураджайнасць на 20 — 30, а некаторых культур і на 50 працэнтаў. Вось чаму гібрыдныя, гетарозісныя гатункі ідуць на змену звычайным.

З прычыны таго, што велічыня гетарозісу знаходзіцца ў залежнасці ад асаблівасцей бацькоўскіх форм, якія выкарыстоўваюцца для скрэшчвання, сур'ёзная ўвага была нададзена распрацоўцы прынцыпаў падбору пар і, галоўным чынам, ацэнцы камбінацыйнай здольнасці кампанентаў, гэта значыць, здольнасці забяспечваць пры скрэшчванні пэўны эфект гетарозісу.

Гэтая работа ўпершыню ў краіне была выканана беларускімі генетыкамі і атрымала распаўсюджанне ў розных селекцыйна-генетычных установах Савецкага Саюза.

Сярод новых генетычных метадаў селекцыі раслін вялікае месца належыць эксперыментальнай паліплоды, якая вядзе да скачкападобнага павелічэння колькасці генетычнага матэрыялу ў клетцы, што выклікае змяненне яго біяхімічнай і фізіялагічнай актыўнасці.

Выдатныя вынікі паказвае трыплоідны гібрыд «Беларускі полігібрыд-31», выведзены беларускімі генетыкамі пад кіраўніцтвам акадэміка М. Турбіна і член-карэспандэнта АН БССР У. Борматава. Гэты гібрыд цукровых буракоў вызначаецца высокай цукрыстасцю. Другім прыкладам эфектыўнага выкарыстання з'явы паліплоды ў селекцыі з'яўляецца тэтраплоідны гатунак азімага жыта «Белта», атрыманы калектывам беларускіх селекцыянераў на чале з прафесарам М. Мухіным.

Генетыкі прапануюць і метад вывядзення паліплодных гатункаў шляхам скрэшчвання розных відаў раслін з наступным падваеннем колькасці храмасом. Прыкладам такога гібрыда з'яўляецца трыцікале, якое атрымліваецца ад скрэшчвання пшаніцы з жытам. У некаторых выпадках трыцікале «наследуе» высокае ўтрыманне бялка ў пшаніцы і лізіна ў жыце.

У нашай лабараторыі эксперыментальнага мутагенезу пад кіраўніцтвам У. Валодзіна створаны формы яравой пшаніцы і ячменю з высокім утрыманнем бялку. Адна з мутантных форм пшаніцы «Радзіял», якая вызначаецца яшчэ і высокай ураджайнасцю, перададзена ў дзяржаўнае гатункавыпрабаванне.

У апошнія гады поспехі генетычнай інжынерыі ў бактэрыях сталі пэўным стымулам у развіцці даследаванняў па генетычнай трансфармацыі вышэйшых арганізмаў. У нашай краіне такія даследаванні ўпершыню пачаты ў нашым інстытуце сумесна з Усесаюзным навукова-даследчым інстытутам прыкладной малекулярнай біялогіі і генетыкі УАСГНІЛ.

Даследаванні па генетычнай трансфармацыі раслін маюць не толькі важнае тэарэтычнае значэнне для разумення малекулярных асноў функцыянiравання генома, але, у перспектыве, дадуць магчымасць распрацоўваць прынцыпова новыя метады селекцыі сельскагаспадарчых культур.

Шырока разгорнуты ў інстытуце даследаванні па матэматычнай генетыцы. Поспехі ў развіцці гэтага кірунку ў даследаваннях не толькі ў Беларусі, але і ў цэлым па краіне, звязаны з імем выдатнага генетыка, які шмат гадоў працаваў у нашым інстытуце, акадэміка АН БССР Пятра Фаміча Ракіцкага.

Усё актыўней уваходзіць генетыка ў дзейнасць многіх навукова-даследчых інстытутаў, вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. У гэтай сувязі нельга не адзначыць вялікія дасягненні беларускіх селекцыянераў-бульбаводаў, у прыватнасці, акадэміка АН БССР і УАСГНІЛ П. Альсміка. У Беларускім навукова-даследчым інстытуце жывёлагадоўлі, у Віцебскім ветэрынарным інстытуце вядуцца актыўныя даследаванні па селекцыі і развядзенні розных відаў жывёлы. У Мінскім медыцынскім інстытуце, Інстытуце медыцынскай генетыкі і Беларускім дзяржаўным інстытуце ўдасканалення ўрачоў распрацоўваюцца праблемы медыцынскай генетыкі.

2. Адказ на гэтае пытанне можа падацца парадаксальным. Справа ў тым, што навукова-тэхнічная рэвалюцыя, якая спрыяе інтэнсіўнаму развіццю ўсіх сфер чалавечай дзейнасці, прывяла да змен у навакольным асяроддзі, змен, якія павінна вывучаць генетыка. З другога боку, скажам, без самых дасканалых прыбораў (а гэта адно з дасягненняў менавіта эпохі НТР) мы б не змаглі расшыфраваць генетычны код, не змаглі б мець такія зрухі ў генаінжынерыі, малекулярнай генетыцы і г. д.

3. Трэба пагадзіцца з вучонымі, якія, адказваючы на гэтае пытанне вашай анкеты, сцвярджалі, што сёння ніводная галіна навукі не можа паспяхова развівацца без выкарыстання самых розных ведаў. Нават у мовазнаўстве зараз некаторыя задачы рашаюцца пры дапамозе ЭВМ. Што тычыцца біялогіі, дык яна апынулася на перакрыжаванні многіх навук, і перш за ўсё хіміі, фізікі і матэматыкі. Прыродазнаўства пасля стогадовага перыяду дывергенцыі, расчлянення на асобныя дысцыпліны, уступіла ў эпоху аб'яднання, сінтэзу здабытых ведаў і метадаў даследавання. Адбываюцца складаныя працэсы дыферэнцыяцыі і інтэграцыі навукі аб жыцці, ствараюцца новыя метады і тэхнічныя сродкі пазнання, ажыццяўляецца ўзаемапранікненне метадаў сумежных навук, нараджаюцца новыя напрамкі даследаванняў на стыках многіх дысцыплін.

Дарэчы, аб дыферэнцыяцыі навуковых даследаванняў сведчыць сама структура Акадэміі навук, якая складаецца з розных навуковых інстытутаў.

4. Я лічу, што час ламаносавых не адышоў і ніколі не адыдзе. Талент у навуцы не менш прыкметная з'ява (і неабходная), чым у літаратуры і мастацтве. Навука не можа развівацца без вучоных — генератараў ідэй, вучоных, адметных сваімі незвычайнымі здольнасцямі.

Выпрабаванне з дапамогай лазера (лабараторыя Беларускага політэхнічнага інстытута). Фота Я. ПЯСЕЦКАГА.

І ўсё ж бурнае развіццё навукі, характэрнае для другой паловы нашага стагоддзя, думаецца, тлумачыцца не толькі з'яўленнем мноства плённых, я б сказала, геніяльных ідэй, а і самім характарам навуковых даследаванняў — калектыўнай навуковай працы. Нават вельмі буйному вучонаму не хопіць сіл і энергіі давесці да канца сваю навуковую ідэю. Тут не абысціся без агульных намаганняў калектыву аднадумцаў. Праўда, ва ўсім гэтым ёсць і свае праблемы — маральныя. Асабіста я—за свабодную дыскусію, за тое, каб перамагала таленавітая думка, плённая ідэя, каму б яна ні належала.

5. Калі чалавек рашае прысвяціць сябе навуцы? Асабіста для мяне гэтае няпростае рашэнне выспела на студэнцкай парце. Чаму менавіта тады? Думаю, што пад уплывам маіх настаўнікаў, якія змаглі прывіць мне любоў да навуковай працы.

Настаўнік. Не так даўно ў «Комсомольской правде» быў змешчаны вельмі цікавы артыкул Аркадзя Райкіна «Настаўніку нашы апладысменты», у якім ён з вялікай цеплынёй успамінае настаўнікаў ленінградскай школы, дзе вучыўся ў далёкія цяпер ужо гады. Людзі гэтыя былі страсна захопленыя сваёй справай, яны рабілі ўсё, каб даць вучням не толькі веды, а і прывіць ім любоў да навукі, мастацтва. Менавіта ўрокі фізікі, піша аўтар, вызначылі шлях у навуку яго аднакласніка, цяперашняга акадэміка, фізіка з сусветным імем Я. Зяльдовіча. Так, інтарэсы, прыхільнасці фарміруюцца ў чалавека вельмі рана, яшчэ ў школе. Я не хачу сказаць, што ва ўсіх дзяцей аднолькавыя здольнасці, і хочаш ісці, напрыклад, у фізікі —ідзі ў фізікі, хочаш у артысты — ідзі ў артысты. Але ж колькі ў нас не вырастае будучых фізікаў толькі таму, што таленавітаму юнаку ў час не падказалі, не дапамаглі.

Наўрад ці праваменна гаварыць пра фарміраванне асобы менавіта вучонага. Навуковая дзейнасць не робіць чалавека ні лепшым, ні горшым за прадстаўнікоў іншых прафесій. І дзейнічаюць у навуковым асяроддзі тыя ж самыя маральныя катэгорыі. І калі, бывае, даводзіцца слухаць пра «навуковую» добрасумленнасць, я, прызнацца, не разумею, пры чым тут вызначэнне «навуковая». Добрасумленны чалавек будзе добрасумленным і ў навуцы, і на здабычы вугалю. І добрасумленнасць, і прынцыповасць, і сумленнасць, і шчырасць, і многія іншыя якасці выхоўваюцца ў чалавека, як кажуць па-руску, «с младых ногтей». Так што для мяне асоба вучонага неаддзельная ад асобы чалавека.

6. Думаю, што апошняе пытанне вынікае з папярэдняга. Я ведаю калег, якія, пры ўсёй сваёй занятасці, горача цікавяцца мастацкай літаратурай, не могуць жыць без музыкі, тэатра. Ведаю і такіх, якія не чытаюць нічога, акрамя спецыяльнай літаратуры. Іх мне шкада. Але зноў-такі, усё залежыць ад выхавання — ад сям'і, у якой раслі, школы, дзе вучыліся, сяброў, блізкіх людзей.

Я асабіста, бязмерна захапляючыся мастацкім геніем Талстога, Дастаеўскага, Чэхава, не перастаю здзіўляцца і іх здольнасці паглыбляцца ў чалавечую сутнасць, разгадваць тайны чалавечай псіхалогіі, спадчыннасці — усім тым, чым сёння займаецца біялогія, псіхалогія, генетыка.

КРЫТЫКА, БІБЛІЯГРАФІЯ

З УЛІКАМ НАДЗЁННЫХ ПАТРЭБ

Патрэба ў напісанні такой кнігі, як «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. 1917—1940», выспела даўно. Нягледзячы на тое, што ў апошнія гады з'явіліся шматлікія працы, у якіх даследуецца як творчасць асобных пісьменнікаў, так і спецыфіка развіцця жанраў, стыляў, метадаў у беларускай літаратуры, асаблівасці паэтыкі, студэнты да сённяшняга дня практычна не мелі ніводнага падручніка па гісторыі беларускай савецкай літаратуры. Яго неабходнасць стала асабліва відавочнай тым, хто сам выкладае курс роднай літаратуры студэнтам. Вось чаму ў аўтарскі калектыў увайшлі пераважна выкладчыкі БДУ імя У. І. Леніна і педагагічных інстытутаў.

Увогуле ж «Гісторыю...» пісалі шаснаццаць чалавек—кожны са сваім стылем, сваёй манерай даследавання. Аднак жа яна атрымалася завершанай і цэласнай у сваёй агульнай задуме — дапамагчы студэнту авалодаць курсам, паглыбіць яго ўяўленні пра заканамернасці літаратурнага працэсу 20—30-х гадоў. Прымальная і сама кампаноўка матэрыялу, размяшчэнне яго ў такім парадку, калі спачатку даецца панарама, шырокі грамадска-літаратурны фон, а затым у яго «ўпісваюцца» манаграфічныя раздзелы пра творчасць паасобных пісьменнікаў.

Аглядныя раздзелы «Літаратура 20-х гадоў» і «Літаратура 30-х гадоў» даюць магчымасць убачыць першыя крокі маладой беларускай савецкай літаратуры на шляху авалодвання метадам сацыялістычнага рэалізму, асэнсаваць гістарычную ролю літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», ацаніць ролю Камуністычнай партыі ў кансалідацыі пісьменніцкіх сіл, выхаванні іх у духу пралетарскага інтэрнацыяналізму. У артыкулах на багатым фактычным матэрыяле прасочаны тэндэнцыі пераадольвання схематызму, дэкларацыйнасці паэзіяй 20-х гадоў, паглыбленне лірычнага пачатку ў паэзіі 30-х гг. Паказаны працэс асваення беларускай прозай новых для яе жанравых форм аповесці і рамана, тэндэнцыі стварэння вобраза новага героя—змагара за сацыялістычныя ідэалы.

У абедзвюх частках падручніка заслугоўваюць увагі раздзелы «Літаратура Заходняй Беларусі» і «Крытыка і літаратуразнаўства» (аўтары У. Калеснік і М. Мушынскі). Нельга не прызнаць, што да апошняга часу літаратура Заходняй Беларусі неяк выпадала з агульнага кантэксту грамадска-літаратурнага працэсу 20—30-х гг. Яе прыгадвалі мімаходзь, калі размова заходзіла пра паэзію М. Танка, абмяжоўваючы гэту гаворку імёнамі М. Танка, П. Пестрака, В. Таўлая ды М. Машары. Між тым, паводле слушнай заўвагі У. Калесніка, заходнебеларуская літаратура — гэта творчасць той часткі беларускага насельніцтва, якая з красавіка 1921 па верасень 1939 года вымушана была жыць на тэрыторыі, далучанай на аснове Рыжскага мірнага дагавора да буржуазнай Польшчы. Гэта была літаратура, якая выспела на хвалі нацыянальна-вызваленчага і рэвалюцыйнага руху і выяўляла інтарэсы, жыццёвыя ідэалы трох мільёнаў беларусаў на так званых «усходніх крэсах». Аўтар бачыць асноўныя заканамернасці развіцця прагрэсіўнай заходнебеларускай літаратуры ў паглыбленні сувязі пісьменнікаў з рэвалюцыйным рухам, Камуністычнай партыяй, у сцвярджэнні ідэі ўз'яднання з Савецкай Беларуссю. Здабыткі яе ў 20-я гады У. Калеснік звязвае з імёнамі паэтаў-рамантыкаў У. Жылкі, Л. Родзевіча і Г. Леўчыка. Шлях да авалодвання ідэйнымі прынцыпамі сацыялістычнага рэалізму ў заходнебеларускай літаратуры 30-х гг. аўтар прасочвае на творах М. Танка, М. Васілька, П. Пестрака, Б. Таўлая і іншых, чыя творчасць пасля верасня 1939 г. «арганічна ўвайшла лепшымі сваімі здабыткамі ў агульнанацыянальную скарбніцу беларускай літаратуры».

У артыкуле «Крытыка і літаратуразнаўства» М. Мушынскі крок за крокам даследуе станаўленне і развіццё беларускай савецкай крытыкі і літаратуразнаўства, для якіх галоўным ў 20-я гг. была неабходнасць «сцвердзіць сябе як спецыфічную форму творчасці, усвядоміць якасную навізну сваёй метадалогіі ў параўнанні з метадалогіяй дакастрычніцкай пары». Аўтар дае аб'ектыўную ацэнку «Гісторыі беларускай літаратуры» М. Гарэцкага, літаратуразнаўчай дзейнасці І. Замоціна, Я. Барычэўскага, А. Вазнясенскага, М. Піятуховіча і іншых, звяртае ўвагу на супярэчлівы характар іх даследаванняў, памылкі і спробы пераадолець загачы вульгарна-сацыялагічнага падыходу да літаратуры. Вялікую ўвагу ўдзяляе даследчык аналізу праграмных выступленняў тэарэтыкаў літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша» і «Полымя». Характарызуючы літаратурнае жыццё 30-х гг., М. Мушынскі акцэнтуе ўвагу на гістарычнай ролі вядомай пастановы ЦК ВКП(б) «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый» (1932).

Манаграфічныя раздзелы «Гісторыі...» прысвечаны разгляду творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, М. Чарота, У. Дубоўкі, К. Крапівы, К. Чорнага і іншых пісьменнікаў, чые творы, напісаныя ў 20—30-я гг., маюць непераходнае значэнне. На адным дыханні, з пачуццём асабістай улюбёнасці ў рамантычна-звонкую паэзію Я. Купалы і М. Чарота напісаны артыкулы М. Яроша і М. Мішчанчука. Аўтары імкнуцца да аб'ектыўнай ацэнкі творчасці гэтых паэтаў, разглядваюць яе ў кантэксце літаратурнага працэсу таго часу, што дае магчымасць убачыць і глыбей адчуць усю важкасць і значнасць літаратурнай спадчыны Я. Купалы і М. Чарота.

Грунтоўна напісаны артыкул М. Налівайкі пра творчасць Я. Коласа. Асабліва хораша, прачула вядзецца размова пра «Новую зямлю». Ствараецца ўражанне, што даследчык пісаў не крытычны артыкул, а проста яшчэ раз «усмак» перачытваў выдатную паэму і, не могучы схаваць свайго захаплення, шчыра дзяліўся ім з чытачом.

Прыемнае ўражанне навуковай глыбінёй, даследчыцкай дапытлівасцю, высокай літаратуразнаўчай культурай робяць артыкулы пра У. Дубоўку, К. Крапіву і К. Чорнага (аўтары Ю. Пшыркоў, А. Семяновіч, А. Рагуля). Кожны з даследчыкаў ідзе сваім шляхам да адной мэты — паўней раскрыць перад чытачом грамадзянскі воблік, творчую індывідуальнасць выдатных мастакоў слова.

Вельмі добра, што ў «Гісторыю беларускай савецкай літаратуры» ўпершыню ўведзены манаграфічныя раздзелы пра творчасць М. Зарэцкага і П. Галавача. Іх напісалі А. Майсеенка і М. Луфераў. Цяпер, калі названыя артыкулы арганічна ўпісаліся ў структуру падручніка, неяк па-новаму бачыцца ўся значнасць творчасці абодвух празаікаў. Больш таго, міжволі напрошваецца пытанне: як гэта мы маглі даваць адносна поўнае ўяўленне пра беларускую літаратуру 20—30-х гадоў, абыходзячы глыбокай увагай М. Зарэцкага і П. Галавача?

Цікавым атрымаўся артыкул М. Яфімавай пра творчасць Я. Маўра. Даследчык глыбока ведае спецыфіку дзіцячай літаратуры, захоплена расказвае пра майстэрства выдатнага аўтара шэрагу твораў для юнацтва і падлеткаў.

У артыкуле пра П. Галавача, асабліва, калі даецца аналіз аповесці «Спалохі на загонах» і рамана «Праз гады», варта было б, на нашу думку, больш увагі ўдзяліць майстэрству пісьменніка, стылявой палітры названых твораў.

Некалькі супярэчлівым уяўляецца артыкул пра З. Бядулю. Думаецца, што аўтар залішне катэгарычны ў трактоўцы вобраза галоўнага героя аповесці «Салавей», калі заяўляе, што «вобраз Сымона-Салаўя падаецца ў станаўленні», што гэта «вобраз шматграчны», што З. Бядуля засведчыў «дасканалае майстэрства стварэння сацыяльна акрэсленага, індывідуалізаванага, псіхалагічна пераканаўчага мастацкага вобраза».

У цэлым першая «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. 1917—1940» робіць добрае ўражанне. Гэта салраўды глыбокае даследаванне, якое дапаможа студэнтам паспяхова авалодаць курсам беларускай савецкай літаратуры.

Лідзія ПРАШКОВІЧ.

Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. 1917—1940. Пад агульнай рэд. М. Лазарука і А. Семяновіча. Мінск, «Вышэйшая школа», 1981.

АКТУАЛЬНАЯ РАЗМОВА

Пад старшынствам Э. Ялугіна адбылося пасяджэнне камісіі СП Беларусі па навукова-фантастычнай і прыгодніцкай літаратуры.

Перад прысутнымі выступіў намеснік начальніка ўпраўлення па палітыка-выхаваўчай рабоце Міністэрства ўнутраных спраў БССР Г. Іваноў. Ён пазнаёміў удзельнікаў пасяджэння з некаторымі надзённымі задачамі праваахоўных органаў у святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС і заклікаў пісьменнікаў актыўна ўключыцца ў конкурс на лепшы нарыс пра супрацоўнікаў міліцыі і ў літаратурны конкурс, аб'яўленыя МУС СССР.

З дакладам аб стане беларускай навукова-фантастычнай літаратуры выступіў кандыдат філалагічных навук С. Саладоўнікаў. Беларусь павінна мець багатую навукова-фантастычную літаратуру — такі быў лейтматыў даклада, у якім зроблены агляд дасягненняў у развіцці гэтага жанру за 20—70-я гады. На сённяшні дзень склалася незайздросная сітуацыя: навукова-фантастычныя творы пішуць лічаныя адзінкі. Асноўную прычыну такога стану дакладчык бачыць у памылковым падзеле літаратуры на «сур'ёзную» і «несур'ёзную» і ў адносінах да твораў навуковай фантастыкі ў рэдакцыях газет і часопісаў.

Стан прыгодніцка-дэтэктыўнага жанру — такая тэма даклада, з якім выступіў У. Шыцік. Былі прааналізаваны паасобныя творы, якія ўбачылі свет у апошнія гады. Як істотную з'яву, дакладчык адзначыў тое, што на першае месца цяпер выходзяць дэтэктывы, пабудаваныя на дакументальнай аснове. Тормазам для развіцця жанру У. Шыцік назваў пазіцыю выдавецтваў, рэдакцый газет і часопісаў, заснаваную ўсё на тым жа падзеле літаратуры на «сур'ёзную» і «несур'ёзную».

Галоўны рэдактар выдавецтва «Юнацтва» Я. Каршукоў паведаміў, што пачнецца выпуск «Бібліятэкі прыгод і фантастыкі». За 5 год свет убачаць 26 кніг, у тым ліку каля дзесяці—беларускіх аўтараў. Запланавана выпусціць у гэтай серыі калектыўны зборнік навукова-фантастычных апавяданняў, а таксама зборнік зарубежных дэтэктываў. На жаль, у партфелі выдавецтва пакуль што мала новых арыгінальных твораў беларускіх аўтараў-фантастаў. Трэба спадзявацца, што пісьменнікі ажывяць работу ў гэтым жанры. Выдавецтва пойдзе ім насустрач.

Дэтэктыў наш павінен перамяніцца, сказаў Г. Папоў. Ён павінен быць не толькі займальным чытаннем, але і даваць інфармацыю для роздуму. На парадку дня стаіць патрэба філасофскага дэтэктыва. Узорам для нас можа служыць «Злачынства і пакаранне» Ф. Дастаеўскага.

Аб праблемах дэтэктыўна-прыгодніцкага жанру гаварылі таксама К. Тарасаў, Н. Цыпіс і В. Мыслівец. Перыёдыка і прыгодніцка-дэтэктыўныя творы — тэма выступлення рэдактара газеты «На страже Октября» С. Шахновіча.

На пасяджэнні выступіў сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Б. Сачанка. Нам патрэбны, сказаў ён, высокамастацкія творы прыгодніцка-дэтэктыўнага і навукова-фантастычнага жанраў. На жаль, тут у нас ёсць упушчэнні, і мы павінны палепшыць работу камісіі па навукова-фантастычнай і прыгодніцкай літаратуры. Ёсць ідэя арганізаваць у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выпуск альманаха «Прыгоды і фантастыка». Сакратарыят праўлення Саюза пісьменнікаў мяркуе, што трэба правесці конкурс на лепшы твор прыгодніцкага і фантастычнага жанраў. Гэтыя мерапрыемствы, як і ініцыятыва выдавецтва «Юнацтва», павінны служыць ажыўленню жанраў, пра якія гаварылася на пасяджэнні.

Кнігапіс

Г. МАРЧУК. Ад поўначы да світання. Зборнік аднаактовых п'ес. Пераклад з беларускай В. Баскінай-Осіпавай, У. Іскрыка і аўтара. Мінск, «Полымя», 1981.

Імя Георгія Марчука вядома чытачам і гледачам. Яго артыкулы, рэцэнзіі рэгулярна змяшчаюцца ў рэспубліканскім друку, а казка «Чаканне сабакі Тэафіла» пастаўлена Дзяржаўным тэатрам лялек БССР. Сцэнічнае жыццё набылі — у самадзейных калектывах і ў народных тэатрах і — шматактовыя п'есы Г. Марчука. «Люцікі-кветкі» і «Новыя прыгоды Несцерні». І вось новая сустрэча з аўтарам.

У зборнік «Ад поўначы да світання» ўвайшло дзевяць аднаактовых п'ес. Прадмову «Сатыра і лірыка» напісаў доктар мастацтвазнаўства А. Сабалеўскі.

А. ВІШНЕЎСКІ.

А. ДЗЯЛЕНДЗІК. Аперацыя «Мнагажэнец». П'есы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1981.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» ў апошнія гады робіць добрую справу, выпускаючы выбраныя драматургічныя творы беларускіх пісьменнікаў. Нядаўна з'явілася яшчэ адна кніга, якая дае магчымасць чытачу зноў сустрэцца з героямі Анатоля Дзялендзіка, знаёмымі па спектаклях. У зборнік увайшлі п'есы «Аперацыя «Мнагажэнец», «Амазонкі» і «Гіпапатам».

В. БЛІЗНЮК.

М. ВЫШЫНСКІ. У полі, за сялом... Апавяданні. Для малодшага ўзросту. Мінск, «Юнацтва», 1981.

Міхась Вышынскі расказвае пра справы сённяшніх школьнікаў. Яго апавяданні, што ўвайшлі ў зборнік «У полі, за сялом...», — пра хлопчыкаў і дзяўчынак, якія вучацца і адпачываюць, сябруюць і мараць, дапамагаюць дарослым. Для творчай манеры пісьменніка характэрна лірычнасць. Асабліва паэтычныя ў творах тыя мясціны, дзе расказваецца пра прыгажосць роднай прыроды.

З. СОМАЎ.

НАДЗЁННАЯ РАЗМОВА

Ніл ГІЛЕВІЧ

ГРАМАДЗЯНСКАСЦЬ І ТВОРЧАЕ СТАНАЎЛЕННЕ ПІСЬМЕННІКА

З ВЫСТУПЛЕННЯ НА АДКРЫЦЦІ СЕМІНАРА

Беларуская літаратура няспынна папаўняецца свежымі, маладымі сіламі. Тая новая прыліўная хваля ў савецкім мастацтве і літаратуры, аб якой гаварыў на XXVI з'ездзе КПСС тав. Л. І. Брэжнеў, мае месца і ў нас, у Беларусі, і, можа быць, Беларусь належыць да тых рэспублік, дзе гэтая хваля асабліва высокая. Так, ва ўсякім разе, здаецца мне — чалавеку, які з маладых галоў стараецца рэгулярна сачыць за паяўленнем новых літаратурных імёнаў. Сапраўды, за апошнія гады падалі галасы — і часам досыць выразна і ўпэўнена—дзесяткі маладых паэтаў, празаікаў, драматургаў, крытыкаў. Ці ўсе яны ўвойдуць у літаратуру, ці ўсе сябе сцвердзяць у ёй, ці ўсе стануць яе актыўнымі творцамі, — на гэта пытанне адкажа само жыццё, бліжэйшая будучыня. Але адно зразумела, што наш клопат — клопат Саюза пісьменнікаў, камсамола рэспублікі — якраз у тым і заключаецца, каб падтрымаць і дапамагчы ім выйсці на шырокую творчую дарогу. Для гэтага мы і прыкладаем намаганні, і выкарыстоўваем розныя формы дапамогі творчай моладзі, у тым ліку і такую, як семінар, кіруючыся пры гэтым прынцыпамі і патрабаваннямі, неаднойчы сфармуляванымі ў высокіх партыйных дакументах. Хацеў бы якраз і напомніць, што нядаўна споўнілася пяць гадоў з таго часу, як была прынята пастанова ЦК КПСС «Аб рабоце з творчай моладдзю». Сам факт прыняцця такой пастановы ёсць сведчанне таго, якое агромністае значэнне надаюць партыя і ўрад краіны справе выхавання літаратурнай і мастацкай моладзі. Само сабой зразумела, што гэтым самым выказваецца і вялікі давер маладым і вялікае на іх спадзяванне. Хацелася б, каб маладыя нашы паэты і пісьменнікі добра ўсвядомілі імянна гэта. Каб зразумелі, што пастанова партыі абавязвае да многага не толькі тых, каму належыць выхоўваць новую літаратурную змену, але і саміх маладых. Абавязвае развіваць у сабе пачуццё грамадзянскай адказнасці перад народам і Радзімай за сваё слова, за яго ідэйна-мастацкую вартасць, за сваю творчую пазіцыю. Абавязвае вельмі сур'ёзна, з самага пачатку, ставіцца да сваёй літаратурнай працы, прад'яўляць да сябе высокія патрабаванні. Вось чаму мы акцэнтуем увагу на тым месцы пастановы, дзе гаворыцца, што ў дачыненні да творчай моладзі чуласць і павага павінны спалучацца з патрабавальнасцю і прынцыпэвасцю.

Вельмі старая, можна сказаць, банальная ісціна, што ў сур'ёзную, у сапраўдную літаратуру лёгкіх дарог няма, але яе даводзіцца паўтараць, таму што яна ўсё-такі забываецца. Увогуле ніхто з маладых гэтай ісціны адмаўляць не стане, кожны скажа: «Ну, вядома, а як жа!» — але на практыцы далёка не кожны імкнецца гэтым разуменнем строга кіравацца. Многія ўсё-такі выяўляюць схільнасць да таго, каб прыняць лёгкі варыянт жыцця, ці, дакладней сказаць, існавання ў літаратуры. А што гэта значыць? Чаму малады чалавек, надзелены літаратурнымі здольнасцямі, выбірае шлях, на якім не зможа сцвердзіць сябе як творчая асоба па-сапраўднаму, чаму ён становіцца на шлях неперспектыўны і нават тупіковы, марны? Гэта значыць, што яму не хапіла пачуцця грамадзянскай адказнасці, грамадзянскай сур'ёзнасці, што ён не здолеў ці не захацеў выхаваць у сабе сапраўднага грамадзяніна, што грамадзянін аказаўся ў ім у выніку вельмі слабы, кволенькі.

Ніколі яшчэ не было такога — гісторыя літаратуры ва ўсякім разе такога не ведае, — каб слабы, кволенькі грамадзянін станавіўся значным, выдатным пісьменнікам. Літаратура — справа моцных духам, справа мужных, справа апантаных вялікімі і высокімі грамадскімі ідэямі, — падкрэсліваю: грамадскімі. Адсюль пытанне аб выхаванні ў сабе грамадзяніна —пытанне першачарговай важнасці. Наўрад ці ёсць патрэба звяртацца да гісторыі айчыннай і сусветнай літаратуры, каб пацвердзіць, якімі сумленнымі, мужнымі, выдатнымі грамадзянамі сваёй эпохі былі найбольш вядомыя паэты і пісьменнікі. Зрэшты, можна некаторыя прыклады і згадаць. Хаця б сабе класікаў беларускай літаратуры: Багушэвіча, Цётку, Купалу, Коласа, Багдановіча, Гарэцкага, Чорнага... Звернем пры гэтым увагу, што сваю грамадзянскую доблесць яны пачалі праяўляць у юнацкім узросце: малады Багушэвіч удзельнічаў у антыцарскім паўстанні, Цётка — у рэвалюцыйным руху перыяду першай рускай рэвалюцыі, Колас быў адным з арганізатараў нелегальнага настаўніцкага з'езда, за што трапіў у астрог і г. д. Вялікая грамадзянская актыўнасць, вялікая нераўнадушнасць да вострых, актуальных праблем грамадскага жыцця — вось што несумненна дапамагло ім стаць у нашай літаратуры тымі, кім яны сталі. Геніяльны Ф. Г. Лорка гаварыў: «Калі і ёсць нешта, чаго паэзія не церпіць у якой бы то ні было форме, — гэта раўнадушша. Раўнадушша — прастол сатаны...» Сапраўды, калі паэт, пісьменнік з маладых гадоў не развіў у сабе нераўнадушнасці, нераўнадушных адносін да дабра і зла, да праўды і няпраўды, — справы яго кепскія. Таму што для лёсу літаратара архіважна — хто ты ёсць як чалавек і грамадзянін. Ты — змагар за дабро і праўду, за справядлівасць, за чалавечую годнасць — ці, гаворачы словамі Маякоўскага,— ты «барашек златошерстый, что заблеял и пошел»? Пытанне ставіцца так: чым ты жывеш? Якім клопатам? Чаго хочаш і дабіваешся? Чым апантаны: ці няўрымслівым жаданнем спаліць сваё сэрца ў штодзённым гарэнні, у барацьбе, на агні пакутных дум і перажыванняў, ці — нікчэмнай прагай залезці, дабрацца да сытага і бестурботнага жыцця, да камфорту? Чаго плача душа твая: ці таму, што невукі-дзікуны знішчылі каштоўны помнік нацыянальнай культуры, ці таму, што табе дасталася не тая мадэль «Масквіча», якую хацеў?

У мастацтве, у літаратуры ад сябе самога не схаваешся і не ўцячэш, прытварыцца іншым, чым ты ёсць у сапраўднасці, нельга. Дакладней — прытварыцца можна, але карысці з гэтага ніякай. Чытача не ашукаеш, ва ўсякім разе немагчыма ашукваць доўга: ён усё роўна цябе раскусіць, адчуе і скажа: «Фальш! Фальшывец ты, а не паэт! Крычыш, пампуеш пафас, а сам у свой крык не верыш. А самому — ні трохі не баліць, а ў самога сэрца даўно зарасло салам раўнадушнасці». Як пісаў некалі наш класік: «Заліў быдлячы лой валоўі твае грудзі...» Будучы паўзучым слімаком у жыцці, нельга быць крылатым арлом у паэзіі. Слімак можа запаўзці нават і высока, аж на самую вяршаліну дрэва ці на вяршыню стромы, — але ён не можа паляцець і ніколі не спазнае радасці палёту. А паэзія — гэта палёт. Палёт душы — вольмова. Праўда, часамі ёсць у яго і маладое шумавінне, аўтара «заносіць» убок. Але галоўнае — ён умее рабіць апавяданне.

Робячы свае заўвагі па канкрэтных творах У. Арлова, Я. Скрыган, засцярог яго ад натуралізму, звярнуў увагу на выхаваўчую ролю літаратуры.

Я. Скрыган прааналізаваў таксама творы Яўгена Царанкова, а потым падзяліўся сваімі думкамі пра сучаснае апавяданне, падкрэсліўшы, што гэта вельмі цяжкі жанр, які шмат вымагае ад пісьменніка.

— Я з цікавасцю прачытаў апавяданні Марыі Філіповіч,— сказаў Аркадзь Марціновіч, — і парадаваўся: у аўтара ёсць назіральнасць, ёсць мова і пэўны прафесіяналізм. Яе творы выклікаюць і эмоцыі, і роздум. Усе творы, з якімі мне давялося пазнаёміцца, закранаюць сур'ёзныя маральна-этычныя праблемы, але часам, як, напрыклад, у апавяданні «Здарэнне», некаторым яе рэчам не хапае скразной думкі, таго, што узняло б просты факт да шырокага абагульнення.

В. Тарас прааналізаваў творы маладога празаіка з Гродзеншчыны Івана Пяшко, які працуе сакратаром парткома ў калгасе.

Разглядаючы творы Васіля Ткачова, Л. Дайнека сказаў:

— Я прачытаў тры творы Ткачова і павінен адзначыць, што аўтар ідзе ад жыцця. Мне падабаецца яго цяга да філасафічнасці. Ткачоў прыйшоў у літаратуру не выпадкова, у яго свой почырк, ён велае жыццё, толькі трэба яму пазбаўляцца ідэалізацыі старой вёскі, бо ў ёй было не толькі адно добрае.

Л. Дайнека заклікаў маладых празаікаў смялей пісаць на гістарычную тэму, смялей брацца за фантастычны і прыгодніцкі жанры.

В. Хомчанка разгледзеў апавяданні Міхася Барэйшы і Пятра Рабянка, адзначыўшы станоўчае і адмоўнае ў іх творчасці.

ТЫДЗЕНЬ У КОЛАСАВЫМ ДОМЕ

ДЗЕННІК СЕМІНАРА МАЛАДЫХ ПАЭТАЎ І ПРАЗАІКАЎ

Семінар пачаўся 14 снежня. Першы дзень «семінарысты», «куратарамі» якіх былі А. Гардзіцкі і Я. Міклашэўскі, уладкоўваліся ў Доме творчасці і адпачынку ў Каралішчавічах, знаёміліся, а 15-га пачалася напружаная работа. Мы паведамлялі ўжо, што ў гэты дзень да маладых празаікаў і паэтаў прыехалі старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі М. Танк, першы сакратар праўлення СП Н. Гілевіч, загадчык сектара мастацкай літаратуры ЦК КПБ С. Законнікаў, сакратары праўлення СП А. Вярцінскі і І. Чыгрынаў, старшыня камісіі Саюза пісьменнікаў па рабоце з маладымі літаратарамі Я. Сіпакоў. Усе яны цёпла віталі ўдзельнікаў семінара; Н. Гілевіч выступіў з прамовай, якая друкуецца ў гэтым нумары «ЛіМа».

У другой палавіне дня пачалося абмеркаванне творчасці маладых паэтаў, у якім прынялі ўдзел Р. Барадулін, Т. Бондар, Л. Дайнека, В. Іпатава, П. Макаль, Ю. Свірка і Б. Спрынчан.

...Потым Леанід Галубовіч, калгасны электрык з Клецкага раёна, прызнаецца: «Я баяўся, што мае вершы трапяць да Барадуліна». Можна зразумець хваляванне і трывогу маладога паэта, калі ён убачыў свае творы ў руках прызнанага майстра паэзіі. Рыгор Барадулін дэталёва разбірае твор за творам, каб потым аб'явіць свой «прысуд»:

— Вы цікавы паэт, але вам трэба вучыцца. Падумайце пра гэта. Чаму б вам не пайсці завочна на філфак БДУ?

Рыгор Барадулін прапануе Л. Галубовічу стаць адным з аўтараў калектыўнага зборніка, які выйдзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

У другім пакоі ў гэты час ідзе разгляд твораў будаўніка з Мінска Віктара Шніпа. Малады паэт чытае: «Ласіныя сляды цвітуць крывёю». І гэты радок дае штуршок для размовы пра слова, пра яго значэнне ў вершы. Віктар прапануе другі варыянт: «Ласіныя сляды гараць крывёю». І тут Пятрусь Макаль не можа ўстрымацца, каб не пахваліць маладога калегу, просіць яго прачытаць наступны твор. Віктар чытае верш «Чалавек і звер».

— Апошнія радкі верша гучаць нечакана, — каменціруе П. Макаль. — Здавалася, гутарка ідзе пра паляванне першабытнага чалавека, але аўтар умела знаходзіць выхад у сучаснасць. Сучаснасць паэта не ў нейкай экстравагантнасці формы, а ў складзе мыслення, душы. Сапраўды сучасны паэт, застаючыся традыцыйным у форме, абапіраючыся на класіку нашай паэзіі, кажа новае пра сябе і свой час.

І тут таксама ўзнікла заклапочанасць. Чаму малады літаратар не павышае свой тэарэтычны ўзровень? Віктару раяць паступіць на філфак БДУ.

Грунтоўная гутарка адбылася і пра творчасць настаўніка з г. п. Поразава Анатоля Шушко. Яго вершы аналізавалі і В. Іпатава, і П. Макаль, і Ю. Свірка, і самі «семінарысты». А паэт і перакладчык, журналіст з Жабінкі Васіль Сахарчук так вызначыў асаблівасць творчасці А. Шушко:

— Анатоль — паэт зрокавых вобразаў.

Успомнілі яго цыкл вершаў «Калейдаскоп года», надрукаваны летась у «Маладосці». В. Іпатава перасцерагла маладога паэта ад захаплення вонкавай прыгажосцю: сяды-тады ў яго творах заўважаецца імкненне гаварыць незвычайнымі і прыгожымі словамі. П. Макаль, пахваліўшы Анатоля за віртуознасць верша, сказаў:

— Трэба валодаць словам, але не папускацца, каб слова авалодала табою, каб гульня са словам не стала самамэтай.

Анатоль, які дэбютаваў у «ЛіМе» яшчэ дзесяцікласнікам, піша мала. І гэта не засталося незаўважаным. Мусіць, тым, што паэт працуе несістэматычна, і тлумачацца асобныя зрывы ў ягоных вершах. Гутарка пайшла пра неабходнасць сістэматычнай працы, бо толькі дзякуючы ёй магчыма самаўдасканаленне, прафесіяналізацыя пісьменніка.

Добрую ацэнку ў гэты вечар атрымалі творы А. Жыгунова і іншых маладых паэтаў.

Раніцай 16 снежня гутарку з удзельнікамі семінара вёў сакратар ЦК ЛКСМ Беларусі І. Саракавік. Потым аб планах эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларусі ў адзінаццатай пяцігодцы прысутным расказаў лектар ЦК КПБ Г. Грэк.

16 снежня ў госці да «семінарыстаў» прыехаў народны пісьменнік Беларусі Я. Брыль. Завязалася шчырая і даверлівая гутарка вядомага майстра прозы з тымі, хто робіць першыя крокі ў літаратуры (запіс гутаркі падаём асобна).

Пасля абеду зноў працавалі творчыя секцыі. На гэты раз пад «абстрэл» крытыкі трапілі празаікі, якія дагэтуль прымалі актыўны ўдзел у абмеркаванні творчасці паэтаў. Зразумела, было хваляванне, былі спрэчкі і часам маладая нязгода з думкай старэйшых пісьменнікаў. Праўда, работа секцыі прозы ішла трохі вяла ў параўнанні з работай секцыі паэзіі. На жаль, не ўсе «семінарысты» мелі магчымасць раней пазнаёміцца з новымі творамі сваіх таварышаў: апавяданне або аповесць — не верш, іх цяжка ўспрыняць і ацаніць адразу. Для гэтага патрэбен час. На семінары выказвалася думка, што празаічныя творы трэба загадзя распаўсюджваць сярод яго ўдзельнікаў.

... Маладога празаіка з Полацка Уладзіміра Арлова чытачы заўважылі адразу пасля дэбюта ў «ЛіМе». Потым былі надрукаваны яго апавяданні ў «Маладосці», у маладзёжных газетах. На семінар У. Арлоў прывёз новыя творы, якія былі прыхільна сустрэты. Вось што сказаў пра творчасць маладога празаіка вядомы пісьменнік Я. Скрыган:

— Ад твораў Уладзіміра Арлова ў мяне склалася прыемнае ўражанне. У яго харошая, свая, ні ў каго не пазычаная

най, не абцяжаранай грузам хлусні і подласці. Калі ты змагаешся за месца каля карыта — забудзься на сваё месца ў літаратуры.

Будзем гаварыць шчыра: наш век, час, у які мы жывём, стварыў і стварае нямала перашкод для творчага станаўлення маладога пісьменніка — перашкод менавіта ў выглядзе небяспечных жыццёвых спакус. Спакус, якія аслабляюць у душы пазіцыю грамадзяніна, калі ім не супрацьстаяць. Спакус, паддаўшыся на якія, можна непрыкметна ператварыцца ў звычайнага мешчаніна і абываценя. Калі б мяне спыталі: што найбольш засмучае ў сённяшняй маладой літаратуры, я сказаў бы: а, відаць, перш за ўсё — слабаваты пульс грамадзянскасці, недастатковасць зместу і пачуцця важкага, сацыяльна значнага; некаторыя паэты грузнуць у пустым версіфікатарстве, у дробным інтыме, а празаікі — у бяскрылай сузіральнасці і нейкім старэчым нудзенні. Ну, нельга ж, сапраўды, мірыцца з такой жыццёвай пазіцыяй лірычнага героя, якая выказана ў адной песеньцы, змешчанай сёлета ў газеце «Чырвоная змена». Гэта песенька пра шчаслівых закаханых маладых людзей і заканчваецца яна такім пасажам:

І мы жывём з табой на свеце:
Я—для цябе, ты — для мяне!

Вось так, доўга не думаючы: я—для цябе, ты — для мяне!.. Усё астатняе на нашай неспакойнай зямлі іх не цікавіць. Але ж каго зацікавіць і такое самавыкрыццё лірычнага, з дазволу сказаць, героя? Гэта — мала сказаць — нецікава, гэта — проста агідна. На шчасце, такія ідэйна-маральныя крэда абвяшчаюцца ў друку не часта. У большасці выпадкаў нашы сённяшнія маладыя паэты і пісьменнікі імкнуцца жыць сацыяльна і духоўна значным, пранікаць у вострыя грамадскія праблемы сучаснасці. Як часта радуешся, бачачы не толькі даволі высокі прафесійны ўзровень пісьма, але і добры змест, добрае веданне жыцця і людзей, іх псіхалогіі, і жывой народнай мовы. У маю задачу не ўваходзіць тут рабіць канкрэтны крытычны разгляд, але некаторых аўтараў, у якіх я сустракаў такія творы, я мог бы назваць: у паэзіі — гэта Алег Мінкін, Уладзімір Мэрук, Змітро Марозаў, Алесь Жыгуноў, Кастусь Жук, Віктар Бяляцкі, Людміла Паўлікава, Васіль Сахарчук, Алесь Касцень, Іван Рубін, Уладзімір Мазго, Ала Канапелька, Леанід Галубовіч, Алесь Усеня, Павел Шруб, Віктар Шніп, Анатоль Шушко, Алесь Жамойцін, у прозе — Уладзімір Ягоўдзік, Мікола Варава, Міхась Барэйша, Уладзімір Арлоў, Уладзімір Саламаха, Хрысціна Лялько і многія іншыя. Не кажу пра тых, што нядаўна прыняты ў Саюз пісьменнікаў, як Любоў Тарасюк, Мікола Пракаповіч, Мікола Мятліцкі, Алесь Кажадуб. Радасна ведаць і ўсведамляць, што маладыя беларускія паэты і празікі сваімі першымі публікацыямі, першымі кнігамі жывяць надзею і веру чытачоў у вялікую будучыню роднай літаратуры, у яе высокі і сонечны заўтрашні дзень, што яны так хораша развінаюць крылы на ўзлёце. Радасна бачыць, што маладыя ідуць ад роднай зямлі — г. зн. ад вытокаў і каранёў народнай духоўнасці, што зерні, якія сеялі на родных загонах вялікія сейбіты-рупліўцы Купала і Колас, Багдановіч і Гарэцкі, Чорны і Лынькоў, Куляшоў і Мележ, не ўпалі на камень.

Дазвольце выказаць спадзяванне, што гэты семінар, абмеркаванне твораў на ім, сустрэчы і размовы, якія адбудуцца тут, будуць для вас карыснымі, паспрыяюць вашаму духоўнаму станаўленню і творчаму росту.

ЗНАЙСЦІ СЯБЕ

З гутаркі Янкі БРЫЛЯ з маладымі пісьменнікамі

— Тым, хто толькі ўзяўся за пяро, заўсёды цікава прыадчыніць дзверы ў творчую лабараторыю майстра. Іван Антонавіч, скажыце, ці ёсць у вас нейкія свае сакрэты?

— Што ж, у кожнага свае «сакрэты», выпрацаваныя гадамі, але я не збіраюся вучыць вае, бо і дагэтуль ахватней адчуваю сябе вучнем. У кожнага свой працэс пісання. Я не разумею тых, што пішуць рэгулярна, па дзве абавязковыя старонкі ў дзень ці больш. Я пішу нервова. Даволі часта, бывае, мучуся пытаннем: пачынаць пісаць ці не? Для мяне галоўнае — зрабіць чарнавік. Праходзіць нейкі час — перапісваю, пасля машынкі зноў праўлю. Тут, ведаеце, у кожнага па-свойму: адны пішуць туга, другія лягчэй. Я вельмі доўга выношваю тэмы сваіх будучых твораў. Мне часам трэба 5-10 гадоў на апавяданне. Так, напрыклад, апавяданне «Маці» выспявала з 1941 па 1957 год. Падрыхтоўка да працы над апошняй аповесцю «Золак, убачаны здалёк» таксама заняла шмат часу. Тады я многа чытаў, каб лепш увайсці ў той час. Мне здаецца, калі пісьменнік садзіцца пісаць, ён павінен вельмі добра ведаць, што новае, сваё, зможа сказаць свету. Гэта вельмі важна. Пісьменніку трэба абавязкова знайсці сваю, толькі сваю «шчыліну» ў літаратуры.

...10 мая 1945 года Мележа, Паўла Кавалёва і мяне прымалі ў Саюз пісьменнікаў. У тагачасным саюзе я быў, здаецца, сорак чацвёрты па ліку. Становішча было складанае: Лынькоў быў увесь у матэрыяле эпапеі пра Вялікую Айчынную вайну, Чорны памёр, вельмі мала пісаў Маўр. Не было ні Гарэцкага, ні Галавача, ні Зарэцкага, якія да чытача прыйшлі толькі пасля XX з'езда КПСС. У беларускай прозе на той час не вельмі было што чытаць. Сёння ж у нас ёсць што чытаць і ёсць што выбіраць. Праўда, можна і ў сталым узросце плесці вучнёўскую белетрыстыку... Твардоўскі ў адным са сваіх бліскучых артыкулаў гаварыў, што мы, празаікі, не ўмеем расказваць... Гэта бяда і нашай прозы: у некаторых творах ідуць бясконцыя, а то і бессэнсоўныя дыялогі. А празаік жа павінен умець расказваць! І вучыцца гэтаму трэба ў класікаў.

— Каго з класікаў вы любіце?

— У першую чаргу — Талстога. І, вядома, Чэхаў. Доўга жыў Гогалем, Герцэнам, адзін час вельмі любіў Гаршына. Ці люблю Шчадрына? Люблю. Якая ж гэта асалода чытаць яго і які ён сучасны! Люблю Хемінгуэя. Трэба сказаць, што раскусіў яго толькі пасля таго, як прачытаў «Па кім звоніць звон».

Калі гаварыць пра сучасных рускіх празаікаў, гэта: Астаф'еў, Абрамаў. Вялікае ўражанне на мяне зрабіла аповесць Распуціна «Апошні тэрмін». Не так даўно з асалодай чытаў апавяданні Бялова. З украінскіх класікаў люблю Кацюбінскага, з сучасных — Грыгіра Цюцюнніка. Дарэчы, таму, хто не чытаў, раю пазнаёміцца з яго творамі. Высока цаню прозу Іона Друцэ.

— Як вы ставіцеся да Шукшына?

— Шукшын — вельмі арыгінальны пісьменнік, але, на маю думку, ён да канца як празаік не раскрыўся. Смерць Шукшына — вялікая страта для ўсёй савецкай літаратуры, бо гэта быў пісьменнік з вялікай патэнцыяй, які мог багата што зрабіць.

— Каго з класікаў не любіце і чаму?

— Калі ўжо не любіш, дык які ён для цябе класік?!

— Вашы асабістыя адносіны да братоў Стругацкіх? Чаму жанр фантастыкі не лічыцца класічным?

— Ведаеце, я не люблю ні фантастыкі, ні дэтэктываў. Стругацкіх я не чытаў...

— Іван Антонавіч, ёсць звесткі, што вы пісалі вершы...

— Працуючы ў газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну», я папрасіў Крапіву прачытаць два мае рукапісы — вершаў і прозы. Кандрат Кандратавіч уважліва прачытаў іх і параіў мне пісаць прозу.

Між іншым, я шкадую, што Міхась Стральцоў не піша прозы, а вершы: такія вершы могуць пісаць і іншыя, а вось такую прозу, як пісаў Стральцоў, пішуць вельмі нямногія.

— Скажыце, што дало штуршок да напісання мініяцюр «Жменя сонечных промняў»?

— Я не пісаў іх спецыяльна. Гэта проста блакнотныя запісы. Аднойчы я паказаў іх Пімену Панчанку, тагачаснаму рэдактару «Маладосці», і ён сказаў, што іх трэба друкаваць. Дарэчы, жанр гэты не новы: згадаем, да прыкладу, Алешу, Прышвіна, Салаухіна, Бондарава, балгарына Далчава і іншых. Часамі гаворыцца, што такое трэба, маўляў, друкаваць пасля смерці, а мне здаецца, што гэта — паўнапраўная літаратура і мае права на існаванне.

— Ці задаволены вы работай маладых над словам?

— Трэба адзначыць, што мова нашых маладых празаікаў патрабуе яшчэ многага. Неяк мне далі кніжку аднаго таварыша, каб я выступіў са словам пра яе на камісіі. Прачытаўшы кніжку, я не стаў выступаць; бо гэта было бог ведае што — толькі не мова.

У сэнсе мовы харошае ўражанне на мяне зрабіла кніжка Міхася Клебановіча. З задавальненнем прачытаў у «Маладосці» апавяданні Уладзіміра Ягоўдзіка, толькі, на жаль, у абодвух творах аднолькавая канцоўка.

Высокая культура мовы — гэта вельмі важна для празаіка. Калі мы створым харошую беларускую літаратуру, яе будуць не толькі чытаць, але і любіць не толькі ў Беларусі, а і далёка за яе межамі.

На семінары ў Каралішчавічах.

Сваімі думкамі пра творчасць маладых падзяліліся П. Місько, В. Іпатава, У. Шыцік. Вынікі гаворкі падвёў крытык У. Юрэвіч. Ён падкрэсліў, што літаратура — гэта народазнаўства, і ў гэтым сэнсе добра, што моладзь звяртаецца да народных пластоў мовы. На семінары, сказаў У. Юрэвіч, выявілася высокая патрабавальнасць маладых да сябе — тое, што гэтак патрэбна празаіку і чаго яшчэ часам так нестае.

17 снежня ўдзельнікі семінара з цікавасцю выслухалі лекцыі аб стане паэзіі і прозы на сучасным этапе, з якімі выступілі намеснік дырэктара Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР У. Гніламёдаў і загадчык сектара гэтага інстытута П. Дзюбайла.

У другой палавіне дня адбылося пасяджэнне секцыі паэзіі.

Падставу для сур'ёзнай гаворкі далі вершы студэнткі філфака БДУ Алы Канапелькі. Маладыя паэты Мікола Мятліцкі і Вадзім Спрынчан адзначылі арганічнасць і палескі каларыт яе твораў. Артур Вольскі, аналізуючы вершы маладой паэтэсы, адзначыў, што ў А. Канапелькі ёсць сваё свежае палескае слова, якое хвалюе.

Інжынер Алег Мінкін пачаў друкавацца не так даўно, але той, хто чытаў яго вершы, не мог не заўважыць прыхільнасць аўтара да гістарычнай тэмы. На семінары ён пазнаёміў прысутных з вершамі з цыкла «Сяргей Палуян», якія выклікалі ва ўдзельнікаў семінара супярэчлівыя меркаванні. Яны выявіліся ў выступленнях А. Жыгунова, Л. Паўлікавай, А. Сыса і М. Барэйшы. Затым творы А. Мінкіна разгледзела паэтэса Р. Баравікова:

— Многія вершы гавораць, што Мінкін — таленавіты чалавек. Мяне радуе, што ён звяртаецца да гісторыі Беларусі, вучыцца ў М. Багдановіча. Праўда, у яго рэчах часам пануе смутак, шмат журбы.

Прыхільна былі сустрэты вершы і пераклады Вадзіма Спрынчана, які не так даўно выдаў свой першы паэтычны зборнік.

Уладзімір Мазго прачытаў падборку сваіх вершаў. Уражаннямі аб яго творах падзяліліся А. Жыгуноў, В. Сахарчук і М. Мятліцкі. Яны адзначылі добрую тэхніку верша. Празаік М. Барэйша лічыць, што грамадзянскасць у творах У. Мазго пакуль што дэкларацыйная, ёй не хапае чалавечай цеплыні. У Мазго ёсць майстэрства, ёсць культура радка, падкрэсліў П. Макаль, але яму яшчэ трэба шмат вучыцца, каб ісці наперад.

Творчасць Паўла Шруба разгледзелі Я. Міклашэўскі і П. Макаль, вершы Сяргея Украінкі — К. Цвірка.

Вечарам 17 снежня маладыя пісьменнікі трымалі справаздачу перад самым сур'ёзным і строгім суддзёй — перад чытачом: у Доме літаратара адбыўся вечар маладой паэзіі і прозы, які адкрыў і вёў Я. Сіпакоў. Вечар прайшоў паспяхова.

Напружанай па сваёй праграме была і пятніца, 18 снежня.

Раніцай з маладымі літаратарамі сустрэўся М. Лужанін. Ён расказаў пра гісторыю напісання кнігі «Колас расказвае пра сябе», пра асобу народнага паэта Беларусі.

Затым з аналізам творчасці маладых празаікаў выступіў рэдактар аддзела прозы часопіса «Маладосць» У. Дамашэвіч. Нас, супрацоўнікаў рэдакцыі, сказаў ён, парадаваў сваімі апавяданнямі Міхась Барэйша. У мінулым годзе ён стаў лаўрэатам прэміі часопіса. Гэта і стымул, і мерка, ніжэй за якую ў творчасці ўжо нельга апускацца. Густою мовай піша другі наш лаўрэат — Мікола Варава. Адразу цікавым і здольным пісьменнікам здаўся мне Уладзімір Арлоў.

Пра творчы шлях Я. Купалы, пра тое, як пісалася кніга пра народнага песняра, удзельнікам семінара расказаў А. Лойка.

Жывая і зацікаўленая гаворка адбылася ў другой палавіне дня. Да маладых празаікаў і паэтаў прыехаў загадчык аддзела культуры ЦК КПБ І. І. Антановіч. У гутарцы з «семінарыстамі» ён адказаў на шматлікія пытанні, што тычыліся актуальных праблем развіцця беларускай культуры. На гутарцы прысутнічалі першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Н. Гілевіч, загадчык сектара мастацкай літаратуры ЦК КПБ С. Законнікаў, старэйшы пісьменнік М. Лужанін, сакратар праўлення СП БССР І. Чыгрынаў і старшыня камісіі Саюза пісьменнікаў па рабоце з маладымі літаратарамі Я. Сіпакоў.

У заключэнне семінара перад яго ўдзельнікамі выступілі і адказалі на пытанні галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» С. Андраюк, галоўны рэдактар штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» А. Жук, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» В. Зуёнак, галоўны рэдактар выдавецтва «Юнацтва» Я. Каршукоў, рэдактар газеты «Знамя юности» М. Кацюшэнка, галоўны рэдактар часопіса «Неман» А. Кудравец, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» Г. Пашкоў і намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Беларусь» Г. Шыловіч.

Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі І. Чыгрынаў, які старшынстваваў на гэтай сустрэчы, звярнуўся да маладых пісьменнікаў з заключным словам і пажадаў ім поспехаў у творчасці.

А. ПІСЬМЯНКОЎ,
А. СІДАРЭВІЧ,
спецыяльныя карэспандэнты «ЛіМа».

Фадзееў і Беларусь

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Нядаўна мне давялося пазнаёміцца з адным малавядомым лістом Аляксандра Фадзеева. Асоба пісьменніка ў гэтым лісце (які, дарэчы, яшчэ цалкам не публікаваўся) раскрываецца ў некалькіх цікавых момантах. Адзін з гэтых момантаў асабліва прыцягнуў маю ўвагу. Ліст, пра які ідзе гутарка, быў напісаны Фадзеевым у 1955 годзе пасля праслухоўвання па радыё выступлення Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы Беларускай ССР і адрасаваны яе кіраўніку, народнаму артысту СССР Рыгору Раманавічу Шырму. Прывяду з ліста тое месца, якое найбольш уразіла мяне:

«Уласна беларускія песні, як народныя ў той ці іншай апрацоўцы, так і сучасныя, створаныя на народнай аснове, вельмі краналі мяне яшчэ і неяк асабіста. Я сам рускі, з рускай сям'і, але біяграфічна склалася так, што ранняе дзяцінства маё, а пасля невялікага перапынку і ўсё астатняе дзяцінства і малалецтва былі ў значнай ступені звязаны з беларускім асяроддзем (маці — фельчарка, служыла ў Мінскай губерні, на сяле, пасля ў Віленскай, а пасля сям'я наша пайшла сярод пасяленцаў — беларусаў і ўкраінцаў — на Далёкі Усход). А Вы самі ведаеце, як гэта ўздзейнічае на душу, калі ў незвычайна майстэрскім, сардэчным выкананні раптам пачуеш тое (ці роднаснае), што пела табе маці ў дзяцінстве!..»

Неспадзяванае, шчырае выказванне - прызнанне Фадзеева прымусіла мяне па-новаму глянуць на факты, у тым ліку і вядомыя, сувязей вялікага рускага пісьменніка з Беларуссю і беларускай культурай, перачытаць яшчэ раз яго мастацкія і публіцыстычныя творы, эпісталярную спадчыну. Неяк так здарылася, што даследчыкі жыцця і творчасці аўтара «Маладой гвардыі» абышлі ўвагай «беларускі» перыяд. У той жа час, як слушна пісаў Л. Якіменка ў артыкуле пра творчасць Фадзеева, «пісьменніка нельга ўявіць па-за яго біяграфіяй».

Беларуская старонка біяграфіі Фадзеева, пра якую мы дазнаемся з ліста самога пісьменніка, раскрывае вытокі пранесенай ім праз усё жыццё любові да беларускай зямлі, культуры і літаратуры яе народа. Разам з тым яна, гэта біяграфічная старонка, наводзіць на думку, што сувязь Фадзеева з Беларуссю не магла не выявіцца і ў яго ўласнай творчасці. Ці так гэта? У пошуках адказу звернемся да першага рамана пісьменніка «Разгром».

Крытыка шмат гаварыла пра тое, што майстэрства пісьменніка ў раскрыцці характараў герояў, разгортванні сюжэта засноўваецца на традыцыях Л. Талстога. Праўда, А. Луначарскі фадзееўскую творчую вучобу ў класікаў бачыў у некалькі больш шырокім выяўленні. «Форма ў Фадзеева вельмі блізкая да Талстога, з пэўным «дамешкам» Чэхава», — зазначаў ён у артыкуле «Класавая барацьба і мастацтва». З падобнымі назіраннямі крытыкаў згаджаўся і сам Фадзееў. Аднак, калі гаварыць не аб прафесійным майстэрстве, якое кожны пісьменнік выпрацоўвае ў сабе свядома, а пра суб'ектыўныя ўнутраныя імпульсы мастака як асобы, калі не адмаўляць няўлоўна - падсвядомага ў псіхалогіі творчасці, то можна заўважыць: у стрыманай манеры пісьма Фадзеева, нетаропкім развіцці дзеяння «Разгрому», прыхаваным лірызме твора, пявучай гаворцы яго асобных персанажаў праявіўся (хутчэй за ўсё не зусім усвядомлена для самога пісьменніка) уплыў і таго нацыянальнага асяроддзя, у якім рос і выхоўваўся падлетак Фадзееў. Не будзем забывацца, што «Разгром» пісаўся ім у маладым узросце, калі ўспаміны дзяцінства і юнацтва асабліва свежыя, яскравыя.

Найбольш пераканальна гаворыць сама за сябе мова рамана «Разгром». Рускі чытач, які вырас ва ўмовах моналінгвізма (адзінамоўя), знойдзе ў «Разгроме» нямала слоў, якія ён, гэты чытач, успрымае як выключна руска-дыялектныя. Аднак своеасаблівы каларыт мовы персанажаў рамана, іх індывідуалізуючыя асаблівасці складаюць не толькі рускія дыялектызмы. Такія словы, як «сумно», «шитво», «онучи», «маковки», «прясло», «бодяк», «кайстра», «лаюсь», «заводные» (у выразе «заводные лошади») і іншыя прыйшлі ў тэкст рамана з мовы тых беларусаў, сярод якіх прайшло дзяцінства Фадзеева, у асяроддзі якіх ён дабіраўся на Далёкі Усход, а пасля жыў і ваяваў там у гады грамадзянскай вайны.

Асобныя з беларусізмаў (дарэчы, некаторыя з названых слоў ужываюцца і ва ўкраінскай літаратурнай мове) выкарыстоўваюцца не толькі ў мове дзейных асоб рамана «Разгром», але і ў аўтарскай мове. Так, арганічна ўваходзіць у мову пісьменніка слова «сумно»: «Доктор перечитал письмо несколько раз, и оттого, что мигал он особенно часто, а на желтом лице все резче обозначались челюсти, каждому стало нехорошо, **сумно**...»

У некаторых рускіх выданнях «Разгрому», пры першым з'яўленні ў рамане доктара Сташынскага, даецца зноска-растлумачэнне: «Сташинский. — Прототипом для него послужил реально существовавший врач А. Сенкевич, бывший политэмигрант, в те годы — начальник партизанского госпиталя в Приморье».

Сташынскі-Сянкевіч — яшчэ адно звяно, якое лучыць Фадзеева з беларусамі і беларускай зямлёй. Зямляк і саратнік Якуба Коласа, Аляксандр Сянкевіч (1884—1939) удзельнічаў у 1905—1906 гг. у беларускім нацыянальна-вызваленчым руху. Разам з Якубам Коласам і іншымі прагрэсіўна настроенымі настаўнікамі арганізаваў у Мікалаеўшчыне нелегальны настаўніцкі з'езд. Хаваюцыся ад праследавання царскіх улад, эмігрыраваў за мяжу. Жыў у ЗША, вёў і там рэвалюцыйную работу сярод рускіх і беларускіх рабочых эмігрантаў. Скончыў з часам медыцынскі факультэт Мэрылендскага універсітэта, заняўся медыцынскай практыкай. У першыя месяцы пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Сянкевіч спрабуе праз Далёкі Усход вярнуцца ў родную Беларусь, ахопленую ў той час вайной. Але пачынаецца інтэрвенцыя японцаў на Далёкі Усход, успыхвае грамадзянская вайна, і Сянкевіч актыўна ўключаецца ў партызанскі рух, трапляе разам з легендарным Лазо і Фадзеевым у адзін і той жа партызанскі атрад.

Якуб Колас, апісваючы ў трылогіі «На ростанях» шлях дарэвалюцыйнай інтэлігенцыі да народа, паказаў Сянкевіча ў вобразе прагрэсіўнага настаўніка Садовіча. Апрача гэтага, паасобныя рысы Сянкевіча ўвасоблены ў вобразе Басагрэнкі з п'есы Коласа «Забастоўшчыкі». Ён жа, Сянкевіч, як мы заўважылі вышэй, паслужыў прататыпам і вобраза Сташынскага ў рамане Фадзеева «Разгром».

Так у творчасць Фадзеева і Коласа ўплятаецца асабісты жыццёвы матэрыял, які мае агульную грамадзянскую вартасць. Такім своеасаблівым чынам, незалежна ад жадання абодвух пісьменнікаў, адзіны матыў аб'ядноўвае іх творы; творчыя шляхі пісьменнікаў перасякаюцца незалежна ад іх асабістых чалавечых кантактаў.

Што да саміх гэтых кантактаў, то яны, пачаўшыся яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны, працягваліся ажно да 1956 года — года смерці пісьменнікаў. Фадзееў і Колас неаднойчы сустракаліся на розных пісьменніцкіх і грамадскіх форумах у Маскве, Мінску, іншых гарадах (пасяджэнні Усеславянскага камітэта, камітэта па Дзяржаўных прэміях, з'езды пісьменнікаў і г. д.). Толькі адзін факт для прыкладу. Канец студзеня 1939 года. У Маскве ў сувязі з 20-годдзем БССР праводзяцца Дні беларускай літаратуры і мастацтва. Дэлегацыя дзеячаў беларускай культуры на чале з Янкам Купалам і Якубам Коласам прыязджае ў сталіцу нашай Радзімы. 29 студзеня — творчая сустрэча з маскоўскімі пісьменнікамі ў Клубе пісьменнікаў. На сустрэчы з прывітаннем выступае А. Фадзееў, з прамовай у адказ — Якуб Колас. 2-га лютага публікуецца ўрадавы Указ аб узнагароджанні вялікай групы вядучых савецкіх пісьменнікаў ордэнамі краіны. Разам з Фадзеевым, Твардоўскім, Карнейчуком і іншымі ордэнам Леніна ўзнагароджаны Купала і Колас. На мітынгу ў сувязі з гэтай радаснай падзеяй выступілі, апрача іншых, Фадзееў і Колас.

Актыўныя творчыя і чыста чалавечыя ўзаемаадносіны звязвалі Фадзеева з многімі беларускімі пісьменнікамі. Яскравае сведчанне гэтаму—апублікаваныя артыкулы, прамовы і лісты Фадзеева. Яны даюць усе падставы гаварыць пра сур'ёзныя, уважлівыя адносіны аднаго з класікаў рускай савецкай літаратуры да беларускай літаратуры і культуры.

Творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа, М. Лынькова, А. Куляшова, П. Броўкі, Максіма Танка, Р. Шырмы, Л. Александроўскай і інш. разам з цікавымі і карыснымі назіраннямі ў другіх літаратурах і культурах Савецкага Саюза давалі Фадзееву неабходны фактычны матэрыял для шырокіх тэарэтычных разваг, абагульненняў і вывадаў. Беларусь займае «свой пачэсны пасад» у працах Фадзеева на самыя розныя тэмы: «Айчынная вайна і савецкая літаратура», «Аб савецкім патрыятызме і нацыянальнай гордасці народаў СССР», «Аб традыцыях славянскай літаратуры», «Задачы савецкай літаратуры», «Нататкі пра літаратуру» і г. д.

Аляксандр Фадзееў даў узор пранікліва тонкага разумення творчасці Янкі Купалы. «Усё, што адносіцца да дарэвалюцыйнага часу, не мае сабе роўнага па кроўнай блізкасці да мужыка, узведзенай на ўзровень самай сапраўднай паэзіі», — пісаў Фадзееў пасля выхаду ў свет «Выбраных твораў» Купалы на рускай мове ў ваенным 1942 годзе. Высока ацаніўшы купалаўскія паэмы, пісьменнік асобна выказаўся пра паэму «Яна і я»: «Паэма выключна своеасаблівая, зямная, язычаская і ў той жа час па-беларуску ціхая, акварэльная і зноў і зноў мужыцкая». «Даўно не чытаў больш чыстай кнігі», — абагульняе сваё ўражанне ад «Выбраных твораў» Фадзееў.

Высокі прафесійны ўзровень вызначае выказванні Фадзеева пра беларускую драматургію, у прыватнасці — нешматслоўны, але вельмі канкрэтны і глыбокі аналіз «Несцеркі» В. Вольскага. Карпатлівай працай над рукапісамі і першавыданнямі твораў, прыцыпавымі, дзелавымі і выключна добразычлівымі парадамі Фадзееў у многім дапамог Івану Мележу, Піліпу Пестраку, Макару Паслядовічу. Засталіся і апублікаваны яго цікавыя лісты да гэтых беларускіх пісьменнікаў, у якіх дадзены падрабязнейшы разбор паасобных твораў. Характэрная канцоўка ліста да Мележа адносна рамана «Мінскі напрамак»: «Папрацуйце ж яшчэ над сваім раманам, каб яго мог чытаць і любіць шматмільённы чытач, а не дзесяткі тысяч. Раман гэтага варты». Фадзееў-настаўнік, даючы нават суровыя ўрокі літаратурнага майстэрства, не забываўся быць беражлівым у адносінах да сваіх калег, умеў не толькі накіраваць іх, але і ў час падбадзёрыць, падтрымаць.

Рэальны жыццёвы матэрыял сувязей Фадзеева з беларускімі літаратарамі, безумоўна, значна шырэйшы за той, што зафіксаваны на старонках друку. Многія дакументы знаходзяцца ў прыватных пісьменніцкіх архівах, асобныя факты хаваюцца яшчэ ў памяці нашых сучаснікаў — будучыя даследчыкі гэтых матэрыялаў значна пашыраць наша разуменне творчага шляху Фадзеева, гісторыі развіцця шматнацыянальнай савецкай літаратуры наогул.

На ўвагу і любоў да беларускай літаратуры пісьменнікі Савецкай Беларусі адказвалі Фадзееву такой жа добразычлівасцю і любоўю. «Я шчаслівы, што мне давялося часта бачыць і слухаць Аляксандра Фадзеева, блізка сустракацца ў час гутарак і многаму навучыцца ў яго», — так мог сказаць пра яго не адзін Пятрусь Броўка.

У адказ на анкету, накіраваную Івану Мележу Алесем Адамовічам, на пытанне: «Якія пісьменнікі сусветнай літаратуры суправаджаюць Вас праз усё Ваша творчае жыццё?» — аўтар славутай «Палескай хронікі» напісаў наступнае: «У розныя перыяды Бальзак і Купала, Р. Мартэн дзю Гар і К. Чорны, Скот Фіцджэральд, Бунін, Кацюбінскі...; нязменна — Талстой, Шолахаў, Фадзееў, Дастаеўскі...»

Сёння з усёй пэўнасцю мы можам гаварыць пра традыцыі Фадзеева ў творчасці буйнейшых сучасных беларускіх пісьменнікаў. Слушна, скажам, заўважыў Л. Навічэнка, што Васіля Быкава збліжаюць з Фадзеевым «не толькі крызісныя сітуацыі, атмасфера амаль неадольнай трагічнай развязкі, але і абавязваючая мастака да паглыблення аналітычнасці праблема суровага адбора чалавечага матэрыялу «ў ваенных выпрабаваннях».

Калі прадоўжыць назіранні над творчасцю Фадзеева і Быкава, то, як мне задаецца, можна адзначыць яшчэ некалькі важных у супастаўленчым плане момантаў. Асновай твораў абодвух пісьменнікаў з'яўляецца суровая жыццёвая рэальнасць. Быкаў — пісьменнік выключна цэльны ў сваёй творчасці, большасць яго твораў напісана ў агульным з фадзееўскім «Разгромам» ключы, у той жа танальнасці.

Ужо некалькі гадоў запар Саюз пісьменнікаў СССР і Міністэрства абароны прысуджаюць савецкім пісьменнікам медалі імя Фадзеева за лепшыя творы на ваенна-патрыятычную тэматыку. Гэтыя медалі з гордасцю носяць тры сучасныя беларускія пісьменнікі — Максім Танк, Алесь Адамовіч і Іван Чыгрынаў, у творчасці якіх фадзееўскія традыцыі ўвасобіліся надзвычай арганічна. Несумненна, традыцыі Фадзеева-раманіста, Фадзеева-антыфашыста дабратворна сказваюцца на ўсёй сённяшняй беларускай літаратуры, найперш выяўляюцца ў яе антываенным, гуманістычным пафасе.

У нашай рэспубліцы ў даваенны і пасляваенны час творы Фадзеева неаднаразова выдаваліся як у арыгінале, так і ў перакладзе на беларускую мову. «Супраць цячэння», «Апошні з Удэгэ», «Разгром», «Маладая гвардыя»... Творам гэтым далі другое жыццё такія вядомыя беларускія літаратары, як Ц. Гартны, М. Гарэцкі, М. Лужанін, М. Хведаровіч, А. Звонак і інш. Інсцэнізацыя рамана «Маладая гвардыя» была ажыццёўлена Дзяржаўным акадэмічным тэатрам імя Янкі Купалы. На сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР ставілася опера Ю. Мейтуса «Маладая гвардыя», напісаная па матывах аднайменнага рамана.

Беларусь, памяць пра якую пісьменнік пранёс праз усё жыццё , аддзячвае Фадзееву сваёй любоўю і прызнаннем.

Таццяна КАБРЖЫЦКАЯ.

ПАЭЗІЯ

Раіса БАРАВІКОВА

ГЛЯНЕ РАНАК СВЕТЛА І ПРЫГОЖА...

Вечар з братам

Турботны дзень пад яблыняй
завершым,
раса калені халадком кране,
і на лістках запіша вецер вершы,
падслуханыя праз акно ў мяне.
Пра тое, што паменшала спагады,
што паглыбелі бацькавы сляды,
што хутка зоркі лёгкія над садам
пачнуць збіваць салодкія плады.
А потым ноч усё пераварожыць,
бы згаслае цяпло разварушу,
так гляне ранак светла і прыгожа
антонаўкай крамянаю ў душу.

●

Ужо не трэба шкадаваць
сардэчных слоў, размоў
кароткіх.
Замерзла ў Свіслачы вада,
даўно пры сем'ях аднагодкі.

І нехта мой настылы дом
назваў пакутніцкім астрогам,
а я заўсёды за парогам:
пад кронай ці пад ліхтаром.

А найчасцей іду туды,
дзе ў час начны прахожых мала,
дзе зажурыўся наш Купала
над снежнем ясна-маладым.

Дзе пад сумётам ліст кляновы
заве з глыбінь зямных траву,
дзе я ва ўладзе той размовы,
што людзі споведдзю завуць.

●

Вось і заві бяседу мілай.
Да слова слова не лягло.
Адно ў імгненне акрыліла,
другое — крылы абсякло.

Патрэбна птушцы быць крылатай,
а людзям людскі знаць закон,—
па ім вазьміце памагатай
пускаць няўдачы пад адхон.

●

Птушка патрывожаная свішча,
і настылі з раніцы кусты.
Хочацца на ціхае гарышча,
дзе схаваны даўнія лісты.

Сярод іх і мой няроўны почырк,
сціплае шматкроп'е цераз сказ,
каб былі сухімі ў мамы вочы,
бед не выстаўляла напаказ.

Тыя беды зведзены да рэшты,
і нязвыкла ўспыхнула шчака,—
страшна мне натрапіць там на
нешта,
што вяла шчаслівая рука.

На рыпучай з наледдзю драбіне
з дзіўнаю нясмеласцю стаю,
і купае ў снезе арабіна
ягадку прагорклую сваю.

*Патароча**

У густых арэшніках—рагоча,
у гаях калінавых — пяе.
Выбежыць да грэблі патароча,
быццам там чакае хтось яе.

А калі ў лугах сівых світае,
пад старэнькі мост бяжыць бягом,
там начныя кветкі пакідае,
і сама не знае для каго.

З'явіцца здалёку нехта прышлы,—
лотаццю прыкінецца ў вадзе,
ды напэўна той,—адною лішне,—
чалавек і вокам не вядзе.

Выплакацца з горычы захоча,
не ўгадае трапна перад кім,
людзі кажуць: гэта ж патароча,
незямной, не трэба жыць
зямным.

Ноч мяне нядаўна падманула,—
патарочу прывяла імгла,
твар яна чамусьці адвярнула,
ды з дарогі хуценька сышла.

І тады ўва мне ўзнялося смехам
тое ўсё, чым я дасюль жыла,
патароча адказала рэхам,—
і я зноўку голас падала...

Краявід з хваляй

Хвалю ўстрывожыў ветраны
ранак,
а размыты і згорблены бераг
ракі,
як ужо некаханы каханак,
што пра гэта не знаючы,
просіць рукі...

Макавей

У баразну прыляжа макавей
тады, калі ў гародах густа-густа,
пасля яго пялёсткавых завей,
у качаны завяжацца капуста.

А покуль з дзецюкамі, ой хіцёр!
Бы мёд для хлопцаў макавая
квецень,
пытаюцца ў мяне пра макацёр,
і хваляць хмель разгалы
над павеццю.

Ды аднаго не знае макавей,
і хлопцы не былі б такому
рады, —
у хмелю тым штоночы салавей
пяе—выходзь, ды не па іх
загаду.

●

Не трэба папракаць у здрадзе.
Я рада б крыкнуць сэрцу — не!
Але, як соладка ён крадзе,
усё, што лепшае ў мяне.

Таму ў кватэры нашай пуста,
таму не так, як у людзей,
маршчынкі згладжваю прад
люстрам,
каб перад ім быць маладзей.

І голас чуецца вясёлы,
а там, дзе месяц тонкі згас,
аплачуць за мяне анёлы,
усё нязбытнае між нас.

Патароча — здань, пудзіла.



Пасля снегападу. Фотаэцюд А. ГЛІНСКАГА.

НА ХВАЛЯХ ЭФІРУ

АДЗІН ДЗЕНЬ З ЖЫЦЦЯ ТАКСІСТАЎ

НОВЫ ФІЛЬМ БЕЛАРУСКАГА ТЭЛЕБАЧАННЯ

На стаянцы таксі была чарга. Людзі чакалі машын. Нехта — абвешаны клункамі, пакункамі, хтосьці — налёгку. Але ўсе некуды спяшаліся, усе спазняліся.

— От гэтыя таксісты! Ніколі іх няма, калі яны патрэбны. То яны ў парк, то на запраўку. Толькі не туды, куды трэба пасажыру, — бурчаў немалады з выгляду мужчына, перакідваючы свае пакункі з адной рукі ў другую.— Ды што казаць — рвачы! Што для іх пасажыр! А паспрабуй папракнуць, дык яшчэ аблаюць!

— А што вы ад іх хочаце? Як вы да іх, так і яны да вас. Вы на іх месцы, можа, і не так бы загаварылі. Ды што вы ведаеце пра іх работу? Вось я асабіста...

Так, мы з вамі асабіста, як гаворыцца, нічога не маем супраць таксістаў. Але ж бытуе такое ўяўленне, што таксіст заўсёды вінаваты, у той час як пасажыр — заўсёды мае рацыю. Ды і ў кіно, і ў літаратуры склаўся пэўны стэрэатып таксіста — хапугі і грубіяна.

А на самой справе — што мы ведаем пра іх работу? А, можа, і ў іх існуюць тыя ж праблемы, што і ў нас, пасажыраў?

Відаць, менавіта такое пытанне задалі сабе аўтары новага дакументальнага фільма, створанага на рэспубліканскім тэлебачанні. Аўтар сцэнарыя — Т. Лунёва, рэжысёр — А. Рудэрман, аператары — С. Фрыдлянд, Л. Броўтман, гукарэжысёр — І. Муратава, рэдактар — А. Бабкова.

І на пачатку яны быццам і не аспрэчваюць стэрэатыпнае меркаванне пра шафёраў таксі. Літаральна з першых кадраў нам прапануюць эпізод (відаць па ўсім, падрыхтаваны, ці нават інсцэніраваны), як кантралёры спыняюць таксіста, які «забыўся» ўключыць лічыльнік. І праз хвіліну мы з вамі прысутнічаем на сходзе — тым самым, на якім у след за «злачынствам» павінна адбыцца пакаранне. На сходзе брыгады шафёраў высвятляецца, ці вінаваты таксіст, які не ўключыў «лічыльнік». І вось тут мы трапляем у атмасферу, якую не прыдумаеш знарок. Жывыя твары, жывыя галасы, жывыя людзі з іх набалелымі праблемамі...

Шафёра, якога «схапілі за руку» кантралёры, брыгадзір прапануе зняць з новай машыны. Здавалася б, што тут асаблівага? Але высвятляецца, што працаваць на старой машыне — гэт значыць, пазбавіцца прэміяльных, трынаццатай зарплаты, адным словам, трапіць у лік адстаючых. Бо выканаць план на старой машыне цяжка. (А план — 36 рублёў за дзень). Акрамя таго, працаваць на старой машыне — гэта і пасля змены заставацца ў аўтапарку на час рамонту.

Вось тут, калі гаворка пайшла пра жыццёвыя інтарэсы вадзіцеляў, яны загаварылі, не звяртаючы ўвагі ні на камеру, ні на рэжысёра. Загаварылі пра тое, што шафёр таксі трынаццаць гадзін у суткі знаходзіцца на працы. І пра тое, што трэба «даць» механіку, каб ён узяўся за рамонт тваёй машыны. І пра «складаныя» адносіны ў брыгадзе, калі адзін ставіцца да працы з поўнай аддачай, а другі абыякава. І пра брыгадны падрад, які з цяжкасцю ўкараняецца ў рабоце таксістаў. І пра тое, што зрабіць, каб гэты метад прыжыўся ў таксапарку...

Запомніўся чалавек, які з ўсёй шчырасцю і непасрэднасцю даводзіў, што машына — яго карміцелька, а для кагосьці — толькі забава, і ці можна такіх розных работнікаў уроўнываць?

Запомніўся і такі момант, калі ў абарону таварыша адзін з таксістаў выказаў меркаванне, што шафёр, які не ўключыў лічыльнік, мабыць, проста стаміўся, бо пасля трынаццаці гадзін працы сапраўды можна забыцца...

Але сход — ён таксама пасля змены. А асноўная работа — на лініі, з пасажырамі, куды і пераносіць нас кінакамера.

На маршруце вопытны вадзіцель настаўляе стажора (мы бачылі іх на пачатку фільма, і цяпер толькі чуем іх галасы). Часцей гэта голас настаўніка, які дае парады. А парады такія: «За машынай сачы, а адносін з пасажырам не псуй». Альбо: «Таксіст — псіхолаг і дыпламат. Ён сам сабе і бухгалтар, і эканаміст, і кантралёр. І чым стражэйшы кантралёр, тым лепш для вадзіцеля...»

Пры ўсёй дасціпнасці гэтых парад, яны— толькі адзін бок справы. Пра другі яе бок мы даведваемся, пабываўшы разам са стваральнікамі фільма на планёрцы, якую праводзіць дырэктар аўтакамбіната У. Русак. Вось дзе і бухгалтэрыя, і эканоміка, і кантроль! Штодзень перад пачаткам работы ўсе службы дакладваюць аб стане гаспадаркі і гатоўнасці машын. Прызнацца, з боку гэта крыху нагадвае «допрос с пристрастием».

«Колькі машын на лініі? Колькі ў рамонце? Трыццаць тры машыны не адрамантаваны? Чаму? Хто вінаваты? Людзі? Мяняць трэба такіх людзей!» — гучыць патрабавальны голас кіраўніка. У. Русак вядзе планёрку дакладна, з веданнем справы, а часам — жорстка, не ашчаджаючы самалюбства.

Тут камера назірае за героем у мінуты яго натуральных, паўсядзённых паводзін і ў выніку стварае партрэт кіраўніка — «чалавека на сваім месцы». Вось гэтыя рэпартажныя сінхронныя кіназдымкі найбольш удалыя ў фільме. Яны даюць нам адказ на пытанне, з чаго складаецца работа таксістаў. І калі б былі толькі гэтыя рэпартажныя кадры, відаць, і тады б фільм атрымаўся сур'ёзны, праблемны. Аднак, ёсць у ім яшчэ нешта, што робіць яго неадназначным, што нараджае пачуццё ўзаемаразумення да людзей гэтай прафесіі.

Добра знятыя праезды па вуліцах Мінска, ажыўленых удзень і прыціхлых уначы. Такія знаёмыя чалавечыя тыпы, выхапленыя з натоўпу на стаянках таксі. І ўсё гэта удала зманціраванае кароткімі перабіўкамі, стварае дынамічны партрэт сучаснага горада, у якім усё ўзаемазвязана. А ў выніку — жывы, часам вясёлы, падчас суровы, месцамі журботны — а ўвогуле цікавы фільм.

Узяўшы за мэту як мага больш расказаць пра людзей гэтай нялёгкай прафесіі, аўтары не пабаяліся нават увесці трагічны эпізод. На лініі памёр таксіст. Мы чуем пра гэта з вуснаў Русака, якому паведамілі трагічную вестку па тэлефоне. Хвіліна маўчання, і перад намі зусім іншы чалавек, не жорсткі кіраўнік, бескампрамісны ў сваёй патрабавальнасці, а проста чалавек, які застаецца самнасам з роздумам пра вечнае. І зноў-такі рэжысёр нібы заспеў яго знянацку: ніякага фальшу ні ў позе, ні ў выразе твару. І гэтая натуральнасць спараджае ў гледача пачуццё суперажывання.

Адным словам, у фільме, як у жыцці, ёсць месца самоце і жарту, а драматычнае пераплятаецца з камічным. На ўзроўні мантажу — дынамічнага і дакладнага па настроі — і музычнае афармленне фільма. Гэта той выпадак, калі музыкі хаця і шмат, але яна настолькі разнастайная і адпаведная адлюстраванню, што не надакучае на працягу трыццаціміннутнага фільма.

Калі ж паспрабаваць падсумаваць уражанні ад карціны, дык трэба сказаць, што яна знята з вялікай павагай да людзей, і не толькі да таксістаў, але і да звычайных прахожых, якіх ты нібы неаднойчы сустракаў на вуліцы, якіх даўно ведаеш.

Р. БАКУНОВІЧ.

КІНО

Рэха вайны

Як рэдактару, мне давялося працаваць над тэлеперадачай «Дыялогі ў глядзельнай зале» — пра абмеркаванне гледачамі новай каляровай мастацкай стужкі «Вазьму твой боль», пастаўленай на студыі «Беларусьфільм» рэжысёрам Міхаілам Пташуком паводле аднайменнага рамана Івана Шамякіна. Гаворка вялася ў рэспубліканскім Доме настаўніка, дзе сабраліся выкладчыкі гарадскіх і сельскіх школ з розных куткоў Беларусі. Па шчырых, жывых, зацікаўленых выступленнях было відаць, што стужка нікога не пакінула абыякавым. Многія гаварылі не толькі аб героях фільма, не толькі параўноўвалі іх з персанажамі рамана; яны прыгадвалі эпізоды са свайго ўласнага жыцця, успаміналі трагічныя сітуацыі, у якія траплялі ў час мінулай вайны іх блізкія, сваякі, знаёмыя. Стужка кранула іх сэрцы. Разумныя заўвагі, слушныя думкі, пытанні, з якімі звярнуліся ўдзельнікі абмеркавання да Шамякіна і Пташука, высвечваюць, на маю думку, істотныя асаблівасці гэтай экранізацыі.

Адзначалася, па-першае, што аўтарам удалося вырашыць самую галоўную задачу — укласці асноўны ідэйна-мастацкі змест вялікага рамана, які займае каля 400 старонак, у аднасерыйны фільм, засяродзіўшы ўсю ўвагу на галоўным канфлікце рамана. Ён—у маральным паядынку паміж Іванам Батраком і паліцаем Шышкам, які ў час вайны забіў цяжарную маці і пяцігадовую сястру на вачах маленькага Іванькі. І многія іншыя персанажы і сюжэтныя лініі рамана захаваны па-кінематаграфічнаму вельмі ашчадна.

Ды толькі сюжэтная завершанасць сама па сабе не гарантуе поспеху экранізацыі: мы ведаем, на жаль, шмат мёртванароджаных фільмаў, якія таксама вылучаліся паўнатой перадачы зместу першакрыніцы і, на першы погляд, захоўвалі асноўныя персанажы і канфлікты празаічнага твора. Але ім не ставала цэласнасці і арганічнасці. А гэтыя вызначальныя якасці паяўляюцца толькі пры ўмове творчага ўзаемаразумення аўтара рамана і рэжысёра-пастаноўшчыка, які павінен аб'яднаць усе намаганні вялікага калектыву стваральнікаў фільма—і ў першую чаргу аператара, мастака, кампазітара і акцёраў, — каб захаваць жанрава-стылявыя асаблівасці празаічнага твора на экране, надаць яму ідэйна-мастацкую цэласнасць і завершанасць. Ідэальны выпадак, калі творчыя індывідуальнасці аўтара празаічнага твора і мастацкая адметнасць рэжысёра - пастаноўшчыка як бы супадаюць.

У дадзеным выпадку такога супадзення няма. Дзеянне ў рамане І. Шамякіна разгортваецца павольна, паступова, персанажы абмаляваны шматбакова, іх учынкі дэталёва матываваны, псіхалагічна тонка распрацаваны, а ў фільме М. Пташука канфлікт развіваецца імкліва, стылявая дамінанта стужкі эмацыянальна больш напружаная, характары больш завершаныя і кантрастныя. Але яны, на жаль, спрошчаныя ў параўнанні з раманам.

Наогул, мяркуючы па папярэдніх фільмах, знятых М. Пташуком («Пра Віцю, Машу і марскую пяхоту», «Лясныя арэлі», «Час выбраў нас»), яго творчай індывідуальнасці ўласціва імкненне да стварэння эмацыянальна яркага і дынамічнага відовішча.

На абмеркаванні фільма адзін з настаўнікаў заўважыў істотную розніцу ў характары Тасі Батрак у рамане і ў фільме. Шамякінская гераіня не здольна была б даць аплявуху сваёй дачцэ, калі тая выказала незадаволенасць паводзінамі бацькі (ён, на яе погляд, занадта блізка прыняў да сэрца вяртанне ў вёску паліцая). Безумоўна, учынак Валі заслугоўвае асуджэння, і ў рамане гэты матыў ёсць — маладое пакаленне не павінна забываць пра вайну, пра тыя ахвяры, якія панеслі яго бацькі.

І. Шамякін пагадзіўся, што сапраўды яго Тася не здатная на такі ўчынак, але гераіня фільма М. Пташука можа і так рэзка адрэагаваць на нетактоўную заўвагу дачкі.

Наогул, многія гледачы, якія перад праглядам фільма прачыталі раман, не прынялі трактоўку вобраза Тасі Батрак у выкананні Галіны Яцкінай, не зважаючы на тое, што ў мастацкай сістэме фільма такое пераасэнсаванне зусім апраўдана.

Аўтар рамана прызнаўся, што ён не адразу прыняў і выканаўцу галоўнай ролі Івана Батрака—артыста Уладзіміра Гасцюхіна. Толькі прагледзеўшы ўжо зманціраваны фільм, вымушаны быў прызнаць правату рэжысёра, які настаяў менавіта на гэтым выканаўцы. Больш таго, М. Пташук заявіў, што без Гасцюхіна ён увогуле не ўзяўся б за экранізацыю гэтага рамана, бо на гэты персанаж выпала адказная, нават вызначальная ідэйна-мастацкая нагрузка. І тут патрэбны былі не толькі прафесійныя, але і шчырыя чалавечыя кантакты паміж рэжысёрам і выканаўцам. А добрае ўзаемаразуменне склалася паміж імі, паводле прызнання М. Пташука, яшчэ ў час работы над пяцісерыйным мастацкім тэлевізійным фільмам «Час выбраў нас».

Уладзімір Гасцюхін, які так ярка заявіў аб сабе яшчэ ў сваёй першай рабоце ў кіно (роля Рыбака ў фільме «Узыходжанне» рэжысёра Л. Шапіцька паводле аповесці В. Быкава «Сотнікаў»), з вялікім тэмпераментам, душэўнай шчодрасцю, па-мастацку пераканаўча ўзнаўляе на экране духоўны стан чалавека, які паўтары гадзіны экраннага часу знаходзіцца ў псіхалагічна экстрэмальнай сітуацыі, чалавека, які праз 35 год сустрэў ката, што забіў яго бацьку, маці і маленькую сястру.

Больш абвострана і нават схематычна ў параўнанні з раманам падаецца ў фільме вобраз паліцая Шышкі. Калі ў рамане Шышка намаляваны вонкава зусім прыстойным старцам, які пад абліччам «божага чалавека» хавае воўчае нутро, то ў выкананні артыста Івана Мацкевіча звярыная душа персанажа выяўляецца адкрыта, падкрэслена. Плакатнасць адчуваеш нават у злавесным абліччы Шышкі. Гэта робіцца акцёрам у поўнай згодзе з агульнай рэжысёрскай задумай фільма.

Удала падабраў М. Пташук юнага выканаўцу ролі сямігадовага Іванькі. Мінскі школьнік Барыс Пятрунін, уласна кажучы, не іграў, ён проста жыў у прапанаваных абставінах.

У гэтай рабоце М. Пташук паказаў уменне будаваць на экране яркае, эмацыянальна насычанае відовішча. Адкрытыя, моцныя, шчырыя пачуцці, якія выяўляе экран, патрабавалі ад рэжысёра вельмі дакладнай, выверанай і эканомнай рытміка-кампазіцыйнай будовы відовішча, каб яно не ператварылася ў эмацыянальны сумбур, каб выканаўцы не «пераірадзілі Ірада», як гаварыў славуты Гамлет, настаўляючы акцёраў.

Пры абмеркаванні гледачы выказвалі заўвагі наконт сцэны першай сустрэчы Івана Батрака з Шышкам у сельскім універмагу. Крытыкаў падтрымаў і сам І. Шамякін. Сапраўды, гэта сцэна ў рамане распрацавана падрабязна і дэталёва. Пісьменнік паступова раскрывае псіхалагічны стан антаганістаў, адносіны да былога паліцая яго аднавяскоўцаў.

Якая выразная мастацкая дэталь — пакупка Шышкам лялькі! «...О, якая лялька! з паўгадовае дзіця, з бялюткімі, як натуральныя, косамі, з блакітнымі вочкамі, у яркай блакітна-ружовай сукенцы, у чырвоных чаравічках са шнурочкамі!.. Іван увесь абліўся потам. Хацелася крыкнуць «Не прадавайце яму лялькі! Ён не мае права адорваць дзяцей! Ён жа забіваў дзяцей! Людзі! Няўжо вы не ведаеце? Ці забыліся?»... Пасля таго, як Шышка сунуў ляльку ў сваю жоўтую торбу, быццам забіў яе жывую, і пахаваў, каб не бачылі людзі, Іван зусім знясіліў...».

Апісанне першага выхаду Шышкі ў свет займае ў рамане каля сямі старонак, гэта закончаная навела, якая магла б даць матэрыял для асобнага кароткаметражнага фільма. Яе трэба было ці падрабязна распрацоўваць, што заняло б па часе каля 10—15 мінут, што замарудзіла б дзеянне, ці адмовіцца ад яе зусім. На маю думку, рэжысёр меў рацыю і тут. Нельга ў аднасерыйным фільме перанасычаць развіццё дзеяння некалькімі кульмінацыямі — існуюць жа пэўныя псіхалагічныя высновы ўспрымання гледачом эмацыянальна напружанага відовішча. Менавіта такую форму выбраў рэжысёр пры экранізацыі рамана «Вазьму твой боль», таму дзеля больш паступовага і паслядоўнага развіцця дзеяння ён павінен быў самаабмяжоўвацца, быць ашчадным, нечым ахвяраваць.

У сцэне важна было проста сутыкнуць Івана Батрака з Шышкам, каб яны паглядзелі адзін аднаму ў вочы. Напружанне гледачоў нарастае, калі яны ўступаюць у адкрытую славесную спрэчку ў час сумеснай паездкі. Гэту сцэну выдатна праводзяць і Гасцюхін, і Мацкевіч; эмацыянальнае ўз-

---

З ЛІТАРАТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Канстанцін ЦІТОЎ

БАЦЬКОЎСКАЙ СЦЯЖЫНАЙ

АПАВЯДАННЕ

Існоў я ў сваіх родных краях, зноў сяджу ў чысцюткай хаце Анфісы Данілаўны — мілай маёй бабулькі. Дарафея Ягоравіча дома няма, пайшоў на рыбалку, а Данілаўна, завіхаючыся ля печы, чакае яго, увесь час паглядаючы ў акно.

— Павінен вось-вось прыйсці. Рэдка здараецца, каб ён спазніўся, — гаворыць яна ўпэўнена, і твар, сабраны маршчынкамі ў камячок, раптам як бы разгладжваецца, святлее. — Я ўжо і чыгунок вады паставіла. Што-небудзь прынясе, дык і юшачкі наварым.

Чырвоныя водсветы агню асвятляюць яе твар і ён ад гэтага здаецца памаладзелым, нейкім натхнёным. Нават у бясколерных ўжо вачах загараюцца агеньчыкі.

Колькі гадоў Анфісе Данілаўне — сказаць цяжка. Мне і то ўжо за шэсцьдзесят пераваліла, а я ж памятаю яе бабулькай яшчэ з таго часу, калі па вуліцы ў адной саколцы бегаў. Вядома ж, тады яна была не такой старой, але гэта мне чамусьці не памятаецца, і бабка мне другой не ўяўлялася. Мабыць, таму, што ў сям'ю іх я ўвайшоў, калі быў ужо дарослым, дваццацітрохгадовым.

Было гэта так.

Вясной 1931 года я закончыў ваеннае вучылішча і, увесь апрануты «з іголачкі», з чамаданам, набітым вучылішчным каптэнармусам, сядзеў на родным паўстанку. Цягнік туды прыбыў глухой ноччу, і падвода, на якой па мяне павінен быў прыехаць хто-небудзь з родных, чакалася толькі раніцой.

Самавар з чырвонай медзі — слуп у два абхваты ад падлогі да столі — знемагаўся парай у кутку буфета.

А ў буфеце нас было толькі двое: я і незнаёмы мне малады чалавек, прыкладна майго ўзросту. І вось па яго сярод ночы прыехала падвода. Малады чалавек аказаўся маім аднавяскоўцам, студэнтам, які прыбыў на вясеннія канікулы, а прыехаў па яго дзядуля Дарафей, мілы, знаёмы мне з дзяцінства дзядок. Вядома ж, мяне ён не пазнаў, таму што з роднай вёскі я паехаў у раннім юнацтве, але я ж яго пазнаў адразу і павітаўся.

Дарафей Ягоравіч угледзеўся ў мой твар, аднак, відаць, усё яшчэ не прызнаваў, і спытаў:

— Пачакай жа, ты не Агейчыкаў старэйшы будзеш?

— Ён самы, дзядуля.

— Вось жа я гляджу, нібы знаёмы, а пазнаць не магу, — заўсміхаўся стары і другі раз пацісну мне руку: па-сялянску, трасучы. — Падводы чакаеш?

Я кіўнуў галавой.

— Наўрад ці па цябе хто прыедзе. Учора я тваю матку бачыў, дык яна казала, што цябе чакаюць на май. Значыцца, не ведаюць дома, што ты аб'явішся... Паедзеш са мною, кабылка ў мяне ночча агульная, калгасная...

Дарафей Ягоравіч так загаварыўся са мною, што нават забыўся пазнаёміць мяне са сваім госцем, які, як выявілася потым, быў сынам яго пляменніцы і называўся проста Сярогам.

Дарога шмякала пад коламі падводы. Пахла леташняй прэласцю і вільгаццю. Красавіцкі вецер, які разышоўся з паўночы, мала быў падобны на вясенні — працінаў да касцей. Я надзеў шынель, студэнт насунуў на галаву свой палітончык. Пяць вёрст праехалі незаўважна, таму што дзед Дарафей не змаўкаў ні на хвіліну, а расказваў смешныя гісторыі са свайго жыцця.

— Ты яшчэ не жанаты? — нечакана спытаў ён, калі мы крыху ад'ехалі ад паўстанка. Я адказаў, што пакуль не думаў пра гэта. — А я ў твае гады ўжо жанаты быў. Спадабалася мне адна дзяўчына — не вытрываў, ажаніўся. Прыгажуня была...

— Гэта хто яшчэ? Бабуля Анфіса?

— А ты што, думаў, яна заўсёды старэнькай ды зморшчанай была? Э-гэ, брат, мабыць, ва ўсёй нашай губерні іншай такой прыгажуні не было! Праўда, вельмі бедная была. Сірата круглая. А ў той час самым галоўным пытаннем пасаг быў, хоць і заглядваліся на яе сынкі багацеяў, ды бацькі ім жаніцца з ёй не дазвалялі. Ну, а я вырашыў, што была б у дзеўкі прыгажосць, а астатняе нажывецца. У яе нічога няма, у мяне таксама, вось і будзем разам дабро нажываць... Но-о, но-о! Бач ты, заслухалася, на хаду спіць... — Дарафей Ягоравіч патузаў лейцамі, пацмокаў на кабылку і працягваў:

— Першыя пяць гадоў мы жылі так, што ўся вёска зайздросціла — душа ў душу. Фіса ж, акрамя прыгажосці, яшчэ і іншае мела: спраўнасць, увішнасць, спрыт і гаспадарлівасць. Ужо такой гаспадыняй і рукадзельніцай аказалася, што другой такой і не знойдзеш. За пяць гадоў мы і кароўку, і коніка нажылі, сталі ў памешчыка паўтары дзесяціны зямлі арандаваць. Выгадна-нявыгадна, а ўсё свой кавалак хлеба... Ну вось мы і дома. Пакуль вашы не веда-

дзеянне яе павялічваецца ад дакладнай работы аператара В. Нікалаева, які здолеў зняць гэты эпізод вельмі дынамічна і ўражліва.

Эмацыянальна насычанае відовішча патрабавала і адпаведнага рашэння. Безумоўна, такое кампазіцыйнае і стылявое вырашэнне рамана не адзіна магчымае, і калі б «Вазьму твой боль» экранізавалі іншыя аўтары, тады рэжысёр, схільны да псіхалагічных назіранняў і псіхалагічнай распрацоўкі характараў, абавязкова знайшоў бы месца для гэтай выразнай і такой своеасаблівай па гучанні, уражлівай сцэны. Але гэта быў бы ўжо зусім іншы фільм. У дадзеным выпадку М. Пташук быў верны свайму мастакоўскаму тэмпераменту і свайму разуменню рамана І. Шамякіна.

Рацыянальна выверанная кампазіцыя фільма падрыхтоўвае гледачоў да кульмінацыі — забойства гітлераўцамі з удзелам Шышкі маці і маленькай сястры Іванькі, дзе зноў жа аператар выявіў майстэрскае валоданне камерай, гэта сцэна знята проста, без залішняй мітусні, з адной кропкі. Мы бачым забойства як бы вачамі застылага ад жаху маленькага Іванькі, што схаваўся ў падпечку. Як і Іванька, мы не ўбачылі забойства пяцігадовай дзяўчынкі, толькі пачулі яе дрыжачы галасок: «Дзядзечка, не страляйце, мне будзе больна!...» І быццам аўтаматная чарга стрэліла ў сэрца кожнага, хто бачыў гэту сцэну!

Добрага творчага саюзніка знайшоў М. Пташук і ў асобе мастака. Стрыманасць Ю. Альбіцкага тут пайшла на карысць фільму, і ўклад яго выразнай мастацкай індывідуальнасці ў агульнае вырашэнне відзён і ў знарок змрочнай афарбоўцы інтэр'ера хаты Шышкі, якая падкрэслівае злавеснасць сцэны забойства паліцая Тасяй Батрак, і ў шчодрай палітры вясёлых маляўнічых фарбаў, калі будуецца хата Батракоў, і ў выразных чорнабелых кантрастах сцэны забойства сям'і Батракоў.

Дакладна распрацаваная кампазіцыйная пабудова стужкі спрыяла акцёрам, якія выконваюць эпізадычныя ролі: і яны ствараюць запамінальныя вобразы. Пераканаўча гучыць абурэнне старшыні калгаса Астаповіча (арт. В. Тарасаў), што нейкі паліцай не дае жыцця сумленным людзям на вёсцы. Глухая, далёка прытоеная нянавісць жонкі Шышкі ў выкананні С. Станюты, якая зрэшты прарываецца вонкава супраць мужа, за тое, што ён сапсаваў ёй усё жыццё — гэта вельмі каларытны персанаж фільма. Трагічная фігура дачкі Шышкі (артыстка В. Лысечка), якая і спачувае, і ненавідзіць свайго бацьку. Яна запамінаецца гледачам, хаця актрыса вымавіла ўсяго некалькі фраз. Агідным у сваёй абыякавасці да чужога болю прыстасаванцам малюе старшыню рабачкома Якава Качанка акцёр В. Філатаў.

На мой погляд, можна смела сцвярджаць, што рэжысёр-пастаноўшчык М. Пташук паспяхова выканаў складаную задачу, якую ён паставіў перад сабой у гэтым фільме: «Я імкнуўся правесці думку аб тым, што людзі, якіх закранула вайна, ніколі пра яе не забудуць... І больш таго, дзеці людзей, якія перажылі вайну, будуць несці ў сабе боль бацькоў. Такое яно доўгае, гэта рэха вайны».

Фільм заканчваецца нямой сцэнай: Іван Батрак, даведаўшыся, што яго жонка забіла паліцая Шышку, глядзіць на нас у залу бездапаможна, боль і недарэчнасць таго, што здарылася, у яго позірку. Стужка заканчваецца шматкроп'ем...

Сапраўды, доўгае рэха болю засталося ад вайны ў душах людзей. Ніколі не будуць забыты тыя незлічоныя страты, якія панёс наш народ у час ваеннага ліхалецця — усе, хто загінуў, мелі бацькоў, сяспёр і братоў, сваякоў і блізкіх... Як ніколі не будзе дараванне тым катам і забойцам, што здрадзілі свайму народу, сваёй Радзіме. Хай сабе юрыдычна яны панеслі кару за свае злачынствы і цяпер «чыстыя» перад законам. Маральны прысуд народа вынесены назаўсёды і перагляду не падлягае.

Вадзім НЕБЫШЫНЕЦ.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

АПЛАДЫСМЕНТЫ НА ЎСПАМІН

Народнаму артысту СССР Я. ПАЛОСІНУ – 70

Не вельмі часта маем мы права выносіць у назву нататак пра акцёра такое жаданае яму і салодкае слова — «апладысменты». Яўген Максімавіч Палосін быў многія гады артыстам, які амаль абавязкова сыходзіў з падмосткаў або знікаў за кулісамі пад дружныя апладысменты глядзельнай залы. Прычым пачалося гэта яшчэ ў студэнцкія гады, калі пасля сцэнічных эцюдаў, выкананых у аўдыторыі Я. Палосіным, пачнаў пляскаць у далоні «сам» Леанідаў. Так, «сам», бо славуты паплечнік Станіслаўскага, знакаміты Міця Карамазаў, Атэла, Плюшкін, Ягор Булычоў на мхатаўскай сцэне, напярэдадні вайны не толькі вёў курс у Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва імя А. В Луначарскага, а быў і рэктарам гэтай першай у нашай краіне вышэйшай навучальнай установе па выхаванні сцэнічных кадраў.

Апладысментамі сустрэлі гамяльчане Я. Палосіна і яго аднакашнікаў, калі «курс Леанідава» стаў у горадзе на Сожы абласным тэатрам (1939 г.). Ён тады адразу заваяваў прызнанне сваімі каларытнымі персанажамі — Дармідонтам у «Познім каханні» А. Астроўскага, Ляпкіным-Цяпкіным у гогалеўскім «Рэвізоры» і дзедам Нічыпарам у камедыі «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы. А колькі апладысментаў гучала ў адрас Я. Палосіна — зноў жа скажам: «і яго баявых сяброў», — калі тэатр у чэрвені 1941 года сфарміраваў першую франтавую канцэртную брыгаду і выправіўся ў далёкі шлях — да самай перамогі нашай арміі над гітлераўскай Германіяй! Сотні і сотні кіламетраў на рахунку брыгады, артысты якой выступалі на пярэднім краі дзеючай арміі, у шпіталях, перад маршавымі ротамі, паказвалі спектаклі і канцэрты для жыхароў толькі што вызваленых ад акупантаў нашых вёсак і гарадоў. Сам Яўген Палосін лічыць артыстычную дзейнасць на фронце галоўнай школай свайго таленту, бо перад рознай аўдыторыяй — у лесе і ў бліндажы, на вакзальных дэбаркадэрах і ў шпітальнай палаце — трэба было шукаць адзіна правільныя і выразныя інтанацыі, адпаведную настрою слухачоў манеру паводзін, акцёрскія фарбы.

На фронце артыст і адчуў сябе найбольш прыдатным для камедыйнага жанру. Мабыць, самым важкім аргументам для такога рашэння быў яго поспех у ролі дзеда Шчукара, славутага шолахаўскага балагура і мудраца, чые вусны так жывапісна малююць розныя жыццёвыя прыгоды і дасціпныя байкі. У тэатральных інсцэніроўках рамана «Узнятая цаліна» і ў маналогах гэтага героя на канцэртных падмостках Я. Палосін здабываў тое, што можна смела назваць трыумфам артыста наогул: народны характар, трапнае слова, прамоўленае дарэчы і своечасова, хітраватая прымаўка, жартаўлівы жэст, арыгінальная паходка «перасмешніка», — вось арсенал, якім карыстаўся акцёр, здзіўляючы самых непасрэдных гледачоў і заўзятых тэатралаў дакладнасцю сваіх жыццёвых назіранняў і мастакоўскай патрабавальнасцю ў адборы фарбаў, дэталей, нюансаў для кожнай з роляў. А яго вядомыя паўзы, калі Я. Палосін, застаючыся «ў вобразе», заплюшчваў вочы то ў адчуванні асалоды, то ў прадчуванні хвіліны шчасця, то ў пошуку смелага заканчэння таго жарту, які вось зараз жывіць яго героя! Колькі разоў на мінскіх прэм'ерах у тэатральнай зале на вуліцы Валадарскага мінчане сустракалі апладысментамі ўжо гэтыя паўзы..

Так было і тады, калі Рускі тэатр БССР ставіў, напрыклад, «Брэсцкую крэпасць» або «Галоўную стаўку» К. Губарэвіча, дзе Я. Палосін быў і на самой справе незабыўным Мішам Кукушкіным і салдатам Сымонам Кнышам. Так было, калі тэатр, які носіць імя М. Горкага, ставіў «Варвараў» і «Ворагаў», дзе акцёр з такім сатырычным бляскам выконваў зусім палярныя па характары ролі Грышы Радазубава і генерала Печанегава. Так было з яго маляўнічым Акімам у талстоўскай «Уладзе цемры»...

Наўрад ці пералічыш усе вартыя таго сцэнічныя вобразы, створаныя выдатным майстрам сцэнічнага пераўвасаблення. Бо Я. Палосін здабыў сабе рэпутацыю дзівоснага выканаўцы і эпізадычных роляў. Матрос у натоўпе каманды на крэйсеры «Зара» або анархіст сярод «брацішак» у атрадзе, дзе ў паядынку сутыкнуліся Камісар і Важак (спектаклі «Разлом» і «Аптымістычная трагедыя»), нават самая звычайная фігура, пазначаная талентам і адметнасцю артыстычнага тэмпераменту Я. Палосіна, была цікавай і па-мастацку кідкай. І такія палосінскія персанажы пэўным чынам характарызавалі час, адлюстраваны на сцэне.

Камедыйныя і сатырычныя персанажы на падмостках часцей за ўсё выглядаюць стабільна акрэсленымі, статычнымі. Вельмі высокае майстэрства робіць іх дыялектычна рухавымі, як гэта дэманстраваў Я. Палосін. Своеасаблівыя блуканні па пакутах у перыяд рэвалюцыйнай перабудовы расійскай рэчаіснасці — такі лёс радавога салдата з мужыкоў, Сымона Кныша. З акопаў першай сусветнай ён «адкліканы» падзеямі так далёка, што ўплывае на хаду гістарычных падзей, бо ўвасабляе тып «чалавека з ружжом», мужыка, рабочага чалавека. І не так лёгка салдату самому паверыць у тое прасвятленне сваёй душы і розуму, якое адбываецца з ім у часе гэтых блуканняў. А гледачы як бы бачаць псіхалагічны пералом і прыкметныя зрухі ў светапоглядзе гэтага простага «чалавека з ружжом». Тут усё залежала ад суадносін жыццёвай праўды сцэнічнага характару з тэмпераментам артыста, які і ставіў мэтай — пераканаць гледачоў у найвялікшым уплыве ленінскіх ідэалаў на салдацкую масу.

І пакуль здароўе дазваляла Я. Палосіну, ён і пенсіянерам удзельнічаў у канцэртах, даючы прыклады адмысловай прафесійнай сталасці, якая наогул характарызуе стан і ўзровень пэўнага этапу ў развіцці рэалістычнага тэатральнага мастацтва.

Ф. ГУЛЫГА.

юць, што ты прыехаў, заходзь да нас. Хоць нечаканым, ды прошаным госцем будзеш. Данілаўна, як я чую па паху, усяго на цэлае вяселле нарыхтавала...

...Як і зараз, тады яна во гэтак жа завіхалася ля печы, гэтак жа ўсміхалася ласкава, прыадкрываючы бяскроўныя вусны.

— Бабуля Анфіса, колькі вам цяпер гадоў?

— Мне? — адрываючыся ад акна, у якім выглядала свайго рыбака, спыталася яна. — Якраз на спаса восемдзесят пяць будзе...

Я міжволі адварочваюся, каб схаваць усмешку. Калі прыязджаў у родныя мясціны гадоў дванаццаць назад, бабулі «якраз на спаса» было столькі ж сама, і па маіх падліках ёй хутка давядзецца адзначаць сваё стагоддзе. Зрэшты, спачатку не ёй. Спачатку ўся калгасная, а можа, і раённая грамадскасць адзначыць стогадовы юбілей Дарафея Ягоравіча: ён старэйшы за Анфісу Данілаўну на тры гады.

— Ідзе рыбалоў, — паведамляе бабка і бяжыць у камору.

Я прыпадаю да акна, углядаюся ў памутнелыя пасля заходу сонца далечы, але нідзе дзядулю Дарафея не бачу. Вось які яшчэ ў бабкі Анфісы зрок! Нарэшце, я ўгледзеў дзеда на палявой сцяжынцы. Шыракаполы саламяны капялюш неяк па-асабліваму ў яго ссунуты набакір. У руцэ — вядро. Па нахіле цела ў яго бок адчуваецца, што яно не парожняе.

Бабуля вяртаецца з каморы з брусом сала і вядзерцам яек. Паглядзеўшы ў акно, гаворыць:

— Блізка ўжо... Схавайся хутчэй вось сюды, — прыпадымае яна фіранку, якой завешвала ложак, хітра падміргвае, і твар яе раптам пачынае здавацца мне па-дзявочы маладым. — Няхай яму нечаканасць будзе.

Нырнуўшы за фіранку, я сядаю на ложак, затойваю дыханне і гляджу ў шчылінку між дзвюх палавінак фіранкі на дзверы.

— Гатовы прысмакі, Фіса? — не паспеўшы пераступіць парог, весела пытаецца Дарафей Ягоравіч і падымае ўгору вядро, у якім, чуваць, нешта плюхаецца.

— Ды ну цябе! — адпіхваючы вядро і выціраючы запырсканы твар фартухом, нязлосна папракае мужа бабка. — Што гэта ў цябе там так пляснула? — ужо з цікавасцю пытаецца яна.

— Э-гэ, сакрэт, — адсоўваючы вядро ад жонкі і ўвішна накрываючы яго ручніком, паведамляе дзед. — Калі сходзіш у пограб, ды прынясеш бутэлечку слівянкі для сугрэву, тады — так і быць — скажу.

— І праўда ты сёння нешта вельмі вымак, а вада ж ужо халодная. Дзе гэта ты ўмудрыўся так выкупацца?

— Ды з-за гэтага самага сакрэта давялося два разы ў ваду па грудзі залезці.

— Значыцца, ты сёння гэтых самых ментузоў падпільнаваў? — хітра прышчурваецца бабка.

— Пачакай, пачакай... А ты адкуль ведаеш? — здзіўляецца дзед.

— Ты ж мне сам з тыдзень назад расказваў, як яны ад цябе ўцяклі.

— От стары дурань! — прытворна лае сам сябе дзед. — І трэба ж было мне прабалбатацца! Цяпер не бачыць слівянкі...

— Чаму ж не бачыць? Я ж сказала, што для сугрэву прынясу, — паглядаючы на фіранку, усміхаючыся, гаворыць бабка Анфіса і выходзіць.

А я сяджу і думаю: «Мілыя вы мае старэнькія! Як жа шчасліва вы пражылі, відаць, сваё жыццё. Як зайздросцілі вам і зайздросцяць зараз тыя, хто жыве з вамі побач, разумее ўсё і ўсё бачыць...»

Думкі мае нечакана перапыняе бабка Анфіса. Адсунуўшы фіранку, яна весела сказала:

— Ну, пустэльнік, выходзь ды памагай дзеду рыбу чысціць.

Дарафей Ягоравіч некалькі імгненняў стаяў у разгубленасці, шырока расставіўшы рукі, як быў, мокры, так і кінуўся да мяне.

— Ды ты што, здурэў, стары!? — пляснула далонямі бабка, загароджваючы мужу дарогу. — Чалавек у новым касцюме, а ён такі брудны лезе...

Але мы ўжо моцна абдымаемся.

— Кажы дзякуй, што я не раўнівы, — роблена злуецца дзед. — А то, браце, надаваў бы я табе добрых кухталёў за тое, што ў чужую спальню залез.

Мы абодва смяёмся і бяромся за рыбу...

Улоў Дарафея Ягоравіча — кілаграмы тры: два ментузы грамаў па чатыры-ста, тры невялічкія шчупачкі, некалькі плотачак, акунькоў, дурных печкуроў, тры лешчыкі, без якіх, як гаворыць дзед, сапраўднай рыбацкай юшкі не бывае, і два лянівыя ліні.

— Гэтых я ў Макаравым вірку злавіў. Памятаеш, там затока ёсць? Разуўся гэта я, закасаў штаны, улез у ваду і толькі хацеў вуду сваю закінуць, як адчуваю — нешта пад нагой варушыцца. Нагнуўся я і выцягнуў вось гэтага. А другі на вудачку клюнуў...

Пакуль варылася юшка і млелі на лёгкім жары ў салдацкім кацялку, вымытыя ў салёнай вадзе і воцаце (каб мулам не пахнулі) ментузы, бабчына слівянка ўнесла ў застолле добрае вяселле. Твар Дарафея Ягоравіча расчырванеўся, вочы загарэліся, як мне падалося, зусім па-маладому. І ў Анфісы Данілаўны шчокі паружавелі, а вочы таксама засвяціліся нейкім сваім патаемным святлом. І не здзівіўся я, калі дзед спытаў у мяне:

— Колькі гэта табе цяпер?

— Хутка шэсцьдзесят адзін.

— Глядзі ты, як вырас!.. А я цябе вось такенечкім памятаю... А болей, вядома, калі ты камсамольцам па вуліцы бегаў. Памятаеш, як у лікбез амаль прымусова мяне заганяў?.. Дзякуй табе, браце, за той час! З-за твайго лікбеза я ў добрыя людзі выйшаў. Так чытаць дый пісаць падахвоціўся, што і да гэтага часу люблю з кніжкай пасядзець. Пасля лікбеза я да настаўніцы нашай, Серафімы Уладзіміраўны, — памятаеш яе? — дамоў пяць гадоў хадзіў. Замучыў яе, напэўна, але яна нічога не гаварыла і з ахвотай вучыла мяне. І маю бабу — таксама... Вось вычытаў я нядаўна ў адным часопісе, што дактары нібыта амаладжвальны сродак шукаюць, і падумалася: а што, калі б вярнуцца зноў у свае, скажам, трыццаць пяць гадоў?.. Як ты думаеш, Фіса, здорава было б?

(Заканчэнне на стар. 12).

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

ЁН — КОЛА-САВЕЦ...

Заслужанаму работніку культуры БССР Якаву БУРАКОВУ — 70

Сёлета ў Якава Георгіевіча Буракова двайны юбілей: ён адзначае сваё 70-годдзе і 50-годдзе творчай дзейнасці. Паўстагоддзя аддаў ён тэатру і амаль усе пяцьдзесят гадоў (а калі ўжо быць абсалютна дакладным—49) прайшлі ў тэатры імя Якуба Коласа.

Якава Георгіевіча з поўным правам можна назваць сапраўдным коласаўцам. І хоць ён не ўваходзіў у групу тых беларускіх студыйцаў-мхатаўцаў, з якіх быў сфарміраваны БДТ-2 (ён прыйшоў у тэатр пазней), але па духу сваім, па тым уладзе ў агульную справу тэатра, па тым, як заўзята бераж ён лепшыя традыцыі нашага калектыву—ён з поўным правам належыць да той старэйшай кагорты сапраўдных коласаўцаў, якімі ганарыцца тэатр.

Ніколі не перастаеш здзіўляцца той надзвычайнай працавітасці, самааддачы, бескарыслівасці, з якімі працуюць нашы старэйшыя таварышы. Многім 70, за 70, пад 70 — а яны, здаецца, маладзейшыя за маладых: выпраўляюцца безадмоўна ў далёкія і цяжкія вандроўкі па сельскіх клубах, не «выдыхаюцца» пасля шматгадзінных рэпетыцый. Яны, здаецца, нават хварэюць менш (а можа, проста «не дазваляюць» сабе расслабіцца і больш турбуюцца пра «здароўе» тэатра, чым пра сваё асабістае). Але галоўнае—яны па-маладому нераўнадушныя.

З якім маладым неўтаймоўным імпэтам «ідзе ў бой» Якаў Георгіевіч! Ён сцвярджае свае пазіцыі, свае перакананні заўсёды да канца. А хвалюе яго ўсё: і работа таварышаў, і матэрыяльныя справы тэатра, і атмасфера за кулісамі, і поспех або няўдача спектакля. Ён — у тэатры ўсё, што скажуць, іграць любую, самую маленькую ролю. Там, у ТРАМе, у спектаклі «Новы горад» паводле І. Гурскага, убачыў юнака галоўны рэжысёр БДТ-2 Мікалай Міцкевіч. Убачыў адразу ў двух маленькіх, але зусім розных па характары эпізодах. Сам М. Міцкевіч заўсёды востра адчуваў сцэнічную форму, надаваў ёй немалое значэнне, і выразнасць, закончанасць, яркасць формы ў рабоце зусім юнага акцёра спадабалася рэжысёру. Ён запрасіў Буракова ў свой тэатр.

З таго часу, з 1932 года, і працуе на коласаўскай сцэне Якаў Георгіевіч. Толькі вайна «забрала» яго з тэатра на 5 гадоў: з 1941 па 46-ы быў ён у арміі, у грозным 42-м стаў камуністам; пасля Перамогі вярнуўся ў родны тэатр, да сваёй акцёрскай прафесіі. Але, акрамя гэтага, яму, энергічнаму, прайшоўшаму добрую воінскую загартоўку, здольнаму дакладна арганізоўваць сябе і іншых, даручылі ў тэатры яшчэ і абавязак інспектара трупы.

Хто добра ведае тэатр, той разумее, якая гэта няпростая і турботная справа — кіраваць такой «беспакойнай гаспадаркай», як акцёрскі цэх. Якое патрэбна ўменне, цярпенне, патрабавальнасць і дабрата, каб падтрымліваць дысцыпліну, каб садзейнічаць нармальнаму ходу рэпетыцыі, каб стварыць неабходную атмасферу вакол спектакля, каб своечасова «паведаміць», «замяніць», «папярэдзіць», або, кажучы сухой мовай фармуліровак, «садзейнічаць паляпшэнню вытворчатворчага працэсу ў калектыве». І Якаў Георгіевіч бездамоўна рабіў гэта на працягу 28 гадоў!

Праўда, свае першыя крокі на гэтай пасадзе ён успамінае цяпер з гумарам: «Вярнуўся з арміі — і вырашыў наводзіць такую ж «жалезную» армейскую дысцыпліну, ну і, канечне, недзе «перагнуў палку». Тады таварышы падыходзілі і жартам пыталіся: «Яша, а дыхаць можна?»

А цяпер ветэраны тэатра яшчэ і падкажуць маладому загадчыку трупы, як трэба рабіць, каб быў парадак, «як у Буракова». І маладыя пераемнікі на гэтай пасадзе часта звяртаюцца да яго за парадай, дапамогай, тлумачэннямі. Ці не знак гэта прызнання і ўдзячнасці?

Ну, а акцёрам ён заставаўся заўсёды. Якаў Георгіевіч—цікавы, яркі характарны акцёр. Ён не іграў, як кажуць, «заглаўных» роляў, але на яго акцёрскім рахунку больш за 100 самых розных характараў, сыграных ім старанна, любоўна, з поўнай аддачай. Сярод іх такія значныя і выразныя работы, як салдат Пікалаў у «Любові Яравой» К. Транёва, Мацейка ў «Прымаках» Я. Купалы, Татарын у «На дне» М. Горкага, Хвайніцкі ў «Вайне пад стрэхамі» А. Адамовіча, камендант у «Трыбунале» А. Макаёнка, граф Кент у «Марыі Сцюарт» Ф. Шылера, Чалкін у «Трох мяшках засмечанай пшаніцы» У. Цендракова, граф Плаза-Сплаўскі («Гісторыя граху» С. Жаромскага), Сімяонаў-Пішчык («Вішнёвы сад» А. Чэхава). Можна было б назваць яшчэ шмат яркіх і выразна сыграных Бураковым эпізодаў, якія не праходзілі непрыкметнымі дзякуючы высокаму прафесіяналізму акцёра.

Цяпер лічыцца «добрым тонам», прыкметай сучаснага акцёра іграць без грыму. Якаў Георгіевіч, не баючыся праслыць старамодным, заўсёды шукае цікавы і выразны грым для кожнага свайго, самага маленькага, выхаду на сцэну. Выдатна валодаючы мастацтвам грыму, ён умее некалькімі штрыхамі стварыць яркі знешні малюнак ролі, спалучаючы яго з рэалістычнай дакладнасцю акцёрскага выканання. Вось некалькі такіх работ: Шляхцюк у «Несцерку» (дарэчы, ён іграе гэтую ролю нязменна вось ужо 40 гадоў з дня прэм'еры спектакля ў 1941 годзе) — вялікі, няўклюдны, са здзіўлена-дурнаватым паглядам і носам-бульбінай, — колькі ў ім тупасці і высакамернасці, як горда ён трымаецца і як туга думае!

Маўклівы граф Кент у «Марыі Сцюарт» — халодны надменны твар, быццам са старажытнай гравюры, пагардлівая ўсмешка, цяжкі пагляд. Вораг Марыі — бязлітасны, ён нават не прыхоўвае сваёй нянавісці.

«Гісторыя граху» — граф Плаза-Сплаўскі, сласталюбівая развяліна з рэшткамі «арыстакратычных» замашак, варты жалю мярзотнік, гатовы на любую подласць.

Камендант у «Трыбунале». Некаторыя рэцэнзенты папракаюць акцёра і пастаноўшчыка спектакля, што камендант некалькі «аблегчаны», што гэта фігура павінна быць больш страшнай, значнай — гэта ж акупант, фашыст, забойца. Але акцёр і пастаноўшчык адштурхоўваліся ў вырашэнні ад аўтарскага вызначэння жанру п'есы. «Трагікамедыя — народны лубок», а ў лубку — фарбы выразныя, ясныя: чорнае дык чорнае, белае дык белае, і можа не быць гэты персанаж разумным і значным — так, ён можа быць больш дурнаватым, смешным за хітрага, адчайнага, мужнага Калабка. Гэта ўжо ў выніку страшна, што такая вось самазадаволеная нікчэмнасць імкнулася агнём і мечам сцвердзіць на нашай зямлі свой «парадак».

Зрэшты, так ці інакш, а гэты вобраз — адна з самых цікавых работ акцёра. Як і работа ў нядаўняй прэм'еры «Вішнёвы сад», дзе Якаў Георгіевіч іграе ролю Сімяонава-Пішчыка. Зноў — старанна знойдзены знешні воблік і псіхалагічна дакладны характар: вялікі, шумны, няўклюдны («конь», як ён сам сябе называе), з парадзелымі бачкамі, крыху азызлым тварам і па-дзіцячы наіўнымі вачамі, — непасрэдны, смешны і бясконца кранальны!

Якаву Георгіевічу рана падводзіць вынікі. Ён па-ранейшаму шмат заняты ў рэпертуары, працуе па-маладому заўзята і захоплена, ён па-ранейшаму жыве інтарэсамі і справамі роднага тэатра, дапамагаючы словам і справай сваім маладым таварышам. Вось ужо шмат гадоў цікава праводзіць ён заняткі ў гуртку бягучай палітыкі для тэхнічных цэхаў. Ён жыве насычаным, цікавым, творчым жыццём.

Званнем заслужанага работніка культуры БССР, урадавымі ўзнагародамі адзначана шматгадовая самаадданая творчая праца Якава Георгіевіча. І мы, яго таварышы па тэатру, зычым яму яшчэ доўгіх плённых гадоў такога ж насычанага творчага жыцця. І горача дзякуем за яго паўвекавое самаадданае — сапраўднае служэнне мастацтву тэатра.

Галіна МАРКІНА.
Фота Ул. КРУКА.

ПРАПАГАНДУЕЦЦА НА ВДНГ

Клуб кнігалюбаў «Крыніца», які працуе пры Мінскім вытворчым аб'яднанні імя У. І. Леніна, — адзін з лепшых у Мінску. Ён аб'ядноўвае каля паўтары тысячы аматараў мастацкага слова. Толькі за апошні час праведзены экскурсіі ў Міхайлаўскае і Трыгорскае, у Ясную Паляну, па літаратурных мясцінах Падмаскоўя, адбыліся канферэнцыі чытачоў па кнігах Л. І. Брэжнева.

Стала традыцыяй арганізоўваць месячнікі грамадска-палітычнай літаратуры, агляды-конкурсы асабістых бібліятэк, запрашаць у цэхі паэтаў, работнікаў выдавецтваў.

Пры «Крыніцы» працуе народны магазін, у якім заўсёды шырокі асартымент літаратуры.

Кнігалюбы аб'яднання верныя і яшчэ адной традыцыі — кнігі з асабістых бібліятэк накіроўваць на ўдарныя камсамольскія будоўлі. Сёння мінчан з удзячнасцю ўспамінаюць будаўнікі БАМа і атамнай электрастанцыі, якая ўзводзіцца на мяжы трох братніх рэспублік. Менавіта ім перададзены бібліятэчкі кніг беларускіх пісьменнікаў.

Вопыт работы клуба кнігалюбаў «Крыніца» прапагандуецца на ВДНГ у Маскве.

У. КОБРЫН.

ПРА КУПАЛАЎСКІ КУТОЧАК

Яшчэ адно выданне, прысвечанае да 100-годдзя з дня нараджэння народнага песняра беларускага народа Янкі Купалы, пабачыла свет. Выдавецтва «Беларусь» выпусціла багата ілюстраваную каляровымі і чорна-белымі здымкамі брашуру «Ляўкі». Аўтар-складальнік Ж. Дапкюнас (тэкст пададзены на беларускай і рускай мовах) падрабязна расказвае пра гэты прыгожы куточак Беларусі, у якім з чэрвеня 1935 па чэрвень 1941 года часта бываў Я. Купала: адпачываў, працаваў над сваімі новымі творамі.

Сёння Ляўкі — мемарыяльны запаведнік. Тут беражліва захоўваецца ўсё, што звязана з біяграфіяй песняра. У брашуры змешчаны фотакопіі рукапісаў некаторых твораў Я. Купалы, напісаных у Ляўках, на здымках — прыгожыя навакольныя краявіды, будынак, у якім знаходзіцца філіял Літаратурнага музея Я. Купалы, рэпрадукцыі карцін беларускіх мастакоў...

І. КРУКАЎ.

БАЦЬКОЎСКАЙ СЦЯЖЫНАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 10—11).

— Не, лепш у сорак пяць, — усміхнулася, але чамусці пачырванела Анфіса Данілаўна.

Дарафей Ягоравіч спачатку ўскінуў свае калматыя бровы ад здзіўлення, а потым нібыта нешта ўспомніў, зарагатаў і ляпнуў сябе па лбе. — От, стары дурань, зусім забыўся табе расказаць! Ты думаеш, чаму мая баба на такі час амаладжэнне адводзіць? Падстава адна важная ёсць... Калі ты мяне канчаткова ў лікбез прынадзіў, мне было сорак сем, а Фісе маёй — сорак чатыры. Тады і здарыўся з ёй гэты выпадак. Таму лічыць яна, што чалавек — асабліва жанчына—да сарака пяці гадоў усё яшчэ дурнаваты крыху... А было гэта так...

Пабыў я адзін раз на лікбезе і надта ж спадабалася там. Ну, і вырашыў сваю Фісу сагітаваць. А яна — ні ў якую. «Сорамна мне,—кажа,—сядзець за партай у школе побач з маладымі». Пачаў я настойваць, а яна — у слёзы. Дайшло да таго, што неяк пад вечар знікла мая Фіса, як у ваду канула. Сыны ў мяне тады, як ты ведаеш, абодва ў Ленінградзе вучыліся, і, калі я ім напісаў, яны былі рады і раілі маці пайсці ў лікбез... Добрыя сыны былі, ды захапіла іх вайна ў Ленінградзе. Яны там на заводзе працавалі інжынерамі. Ну, і загінулі... Дык вось, сказалі мне суседзі, што Фіса мая вельмі расхваляваная нечага да чыгункі пабегла. І верылася мне, і не верылася. Бо ж вельмі яна цягніка баялася тады, калі ён нашу кароўку зарэзаў. Як, бывала, затрубіць, дык яна пабялее ўся і вушы заткне пальцамі. Усё ж вырашыў пайсці пашукаць...

—Не слухай ты гэтага старога балбатуна, — звярнулася да мяне бабка, перабіваючы мужа. — Лепш я схаджу ды вішнёвачкі вам ці рабінаўкі прынясу. Яны старэй, чым слівянка будуць.

— Правільна, Фіса, акурат, як у той самы дзень атрымаецца, — страпянуўся дзед, але Анфісы Данілаўны ўжо не было ў хаце. Ён паглядзеў на дзверы, потым падмяргнуў мне і працягваў.

— Пабег я напрасткі, праз ахоўныя елачкі прадзёрся, шукаю жонку вачамі. Сонца ўжо зайшло, але яшчэ добра відно было. Прыгледзеўся я і бачу: сядзіць мая жонка на рэйцы, у бок станцыі паглядае, у цёплую хустку хутаецца, хоць на вуліцы горача. Хацеў было падысці, улагодзіць, ды раздумаў. Лёг за кустом бур'яну ля самай каляіны, чакаю. Хутка і цягнік паказаўся. Ужо цемнавата было, і ліхтары, як два воўчыя вокі, на пад'ёме ўспыхнулі. Але Анфіса мая не звяртае на гэта аніякай увагі, а толькі прымерваецца, паклала галаву на рэйкі, потым падняла, потым зноў паклала, а цягнік ужо прэ і не так далёка грукоча. Ну, паглядзім, думаю, што далей будзе, калі ён перад выемкай з'явіцца. Там ён заўсёды сігнал перасцерагальны падаваў. Ляжу, чакаю, а цягнік ужо да моста падышоў, ад якога да пачатку выемкі метраў трыста. І тут ён я-як зараве, а Фіса мая я-як ускочыць, я-як затрасецца ды хутчэй у елачкі! Ледзь мне на галаву не наступіла. Ну, я, вядома, таксама ўстаў і следам за ёй назіркам пайшоў...

— Усё яшчэ балбочаш? —незадаволена сказала старая, уваходзячы ў хату і ставячы на стол бутэльку рабінаўкі.

— Дай жа дагаварыць, Фісачка, — ласкава звярнуўся да яе дзед.— Самы канец застаўся... Дык вось, заходжу я ў хату, а Фіса мая лямпу запальвае, рукі ў яе трасуцца, твар бялейшы, чым палатно, у вачах дзікасць нейкая ці жах. Ці гэта зразумела яна ўсё, ці адразу не здагадалася, што я ўсё бачыў, а толькі раптам як закрычыць ды як кінецца да мяне і давай усё расказваць... З таго часу ў нас ніколі больш скандалаў не было. А Фіса стала з ахвотай на лікбез хадзіць, а потым і дахаты да настаўніцы. Дзякуй мне потым гаварыла, калі змагла першае пісьмо ад сына сама прачытаць. Ці ж не праўда, Фіса?

— Ды ўжо ж праўда, праўда, — усміхнулася старая. — Паспытай во лепш рабінаўкі ды госця пачастуй.

— Гэта можна, — узяўшы бутэльку, пагадзіўся Дарафей Ягоравіч і звярнуўся да мяне: — Ты ў вялікім горадзе жывеш, у вас там усяго шмат. Калі ўбачыш гэта самае лякарства, якое для амалоджвання людзей павінна з'явіцца, купі і прышлі. Я, браце, у даўгу перад табой не застануся. Мянтузікаў дзесятка паўтара ці два прышлю. Няма нічога смачнейшага, чым вэнджаныя ментузы, асабліва калі іх у малацэ ды ў расоле патрымаць, не вымаючы пячонкі...

Я не магу зараз дакладна ўспомніць, да якой гадзіны мы прагаварылі ў тую ноч. Памятаю толькі, што калі я паспрабаваў пайсці на аўтобусны прыпынак, Анфіса Данілаўна пакрыўдзілася, прыгразіла мне качаргой, а потым узяла на кручок дзверы. Ды яшчэ і пінжак, які вісеў на спінцы крэсла, у камору схавала.

Раніцой яны ўдваіх пасадзілі мяне ў аўтобус і доўга развітальна махалі рукамі. А я глядзеў на іх праз акно і думаў:

«Мілыя мае старэнькія! Каб жа я мог, то вось зараз дастаў бы вам амаладжальны сродак, каб жылі вы яшчэ сто гадоў, каб маладыя сем'і вучыліся ў вас вернай дружбе і каханню, сямейным радасцям, міру і спакою ў хаце. І каб зразумелі яны, якое трэба цярпенне, якую мужнасць трэба праявіць для замацавання ўсяго гэтага, каб прайсці па жыцці вось так, побач, як прайшлі па ім вы, мае мілыя старэнькія!»

САМАДЗЕЙНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

ДАПАМАГЧЫ ДЗІЦЯЧАМУ ХАРЭОГРАФУ

ПАНЯЦЦЕ «ХАРЭАГРАФІЯ» — аб'ёмнае, але я спынюся толькі на адным з яе раздзелаў — дзіцячым самадзейным харэаграфічным мастацтве. Ёсць неабходнасць пагаварыць аб развіцці танцавальнай творчасці менавіта ў сістэме народнай асветы.

Пэўным дасягненням яе спрыялі такія значныя мерапрыемствы, як фестывалі самадзейнай мастацкай творчасці, агляды і конкурсы мастацкіх калектываў, прысвечаныя 110-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, XXVI з'езду КПСС і XXIX з'езду Камуністычнай партыі Беларусі. Аб поспехах у развіцці жанру і якасным росце калектываў гаворыць тое, што толькі за адзін год за высокае выканаўчае майстэрства было прысвоена званне «Узорны мастацкі калектыў» ансамблю песні і танца «Зорачка» Рэспубліканскага Палаца піянераў і школьнікаў (мастацкі кіраўнік і балетмайстар Я. Гутман), ансамблю песні і танца Гомельскага абласнога Палаца піянераў і школьнікаў (харэограф В. Матрос), ансамблю песні і танца Бабруйскага гарадскога Палаца піянераў і школьнікаў (харэограф В. Сафонава).

Шырокае развіццё самадзейнае харэаграфічнае мастацтва сярод школьнікаў атрымала і ў іншых абласцях. Вялікай папулярнасцю карыстаецца ансамбль танца «Мара» Гродзенскага Палаца піянераў і школьнікаў. Дарэчы, у адзінаццаці агульнаадукацыйных школах гэтага абласнога цэнтра вядзецца выкладанне рытмікі. Вялікую канцэртную дзейнасць вядуць узорны ансамбль песні і танца Магілёўскага абласнога Палаца піянераў і школьнікаў, танцавальны калектыў «Малышок» Лясянскай школы Брэсцкай вобласці, харэаграфічныя калектывы Тураўскай гарпасялковай і Верасніцкай сельскай школ Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Гэтыя калектывы — адны з нямногіх, якія ў сваёй творчасці звяртаюцца да народных крыніц, ствараюць свае творы на мясцовым матэрыяле.

Слоў удзячнасці заслугоўвае Рэспубліканскі Палац піянераў і школьнікаў. Мастацкім выхаваннем тут ахоплена каля дзвюх тысяч дзяцей, з іх больш за 550 — харэаграфічным. Найбольш яскравы прыклад — дзейнасць піянерскага народнага ансамбля песні і танца (мастацкі кіраўнік В. Яловік, галоўны балетмайстар Н. Супрына). Адной з апошніх значных работ калектыву з'яўляецца вакальна-харэаграфічная кампазіцыя «Мы пачынаем юнацтва палёт», прысвечаная XXVI з'езду КПСС. Яна паклала пачатак новаму напрамку ў развіцці дзіцячай мастацкай самадзейнасці — тэматычнаму музычна-харэаграфічнаму спектаклю.

І ўсё ж аналіз апошніх аглядаў, конкурсаў, канцэртных праграм і асобных выступленняў танцавальных калектываў сістэмы народнай адукацыі выяўляе і шмат недахопаў. Як высветлілася, недастатковая ўвага надаецца фарміраванню рэпертуару (як правіла, адсутнічае дзіцячая і школьная тэма, кампазіцыі на казачныя сюжэты, танцы з цыкла «У нас у двары» і г. д., якія спрыяюць развіццю дзіцячай фантазіі). Асобныя рэпертуарныя творы проста малазмястоўныя і носяць у большасці інфармацыйны характар. На жаль, не надаецца пакуль і належнай увагі прыцягненню дзяцей, асабліва хлопчыкаў, у школьныя танцавальныя калектывы. Так, напрыклад, у мінскім гарадскім конкурсе танцавальных калектываў дамоў піянераў і школьнікаў прыняло ўдзел 435 чалавек і з іх усяго толькі 20 хлопчыкаў.

Агульнай праблемай, якая яшчэ існуе ў калектывах дзіцячай харэаграфічнай самадзейнасці, з'яўляецца імкненне кіраўнікоў да «рэпертуарнай дарасласці». Я маю на ўвазе перш за ўсё сачыненне танцаў, якія не адпавядаюць фізіялагічным і псіхалагічным матчымасцям школьнікаў. У выніку мы бачым на сцэне маленькіх «хлопцаў» і «дзяўчат», пазбаўленых характэрнай для іх дзіцячай непасрэднасці, радзсці сцэнічнага быцця, — бачым антымастацкасць. Як прыклад гэтага, можна назваць рускі танец «Субацея» ў выкананні танцавальнага калектыву школы № 67 г. Мінска, так званы беларускі танец «Вязальшчыцы» (танцавальны калектыў школы № 116 г. Мінска), «Беларускія напевы» (школа № 7 г. Мазыра) і інш.

Аналізуючы выступленні дзіцячых танцавальных калектываў, мы прыходзім да вываду, што яны не ідуць па шляху творчага пошуку і ўзбагачэння, не вылучаюцца ні арыгінальнасцю рэпертуару, ні індывідуальнасцю яго вырашэння. Наменклатура танцаў, якая складае рэпертуарную афішу, не багатая: яна не перавышае дваццаці назваў.

Негатыўным момантам у фарміраванні мастацкіх праграм дзіцячых харэаграфічных гурткоў і ансамбляў танца з'яўляецца абязлічванне харэаграфічных твораў: паўсюль можна сустрэць бязадрасныя сачыненні абагульненага тыпу накшталт «беларускі танец», «украінскі танец», «рускі танец», «казахскі танец» і г. д.

Не вылучаецца арыгінальнасцю і мелодыка-рытмічным багаццем музычная аснова многіх харэаграфічных пастановак. Хацелася б, каб канцэртмайстры глыбей унікалі ў сутнасць таго, што іграюць, бо атрымліваецца так: характар выканання музыкі не дапасуецца да характару танца. У музычным акампанеменце неабходны незвычайная выразнасць нюансаў і інтанацый, дакладныя акцэнты. Трэба і кіраўнікам калектываў больш дыферэнцыравана падыходзіць не толькі да выбару адпаведных тэм, але таксама да музычнага матэрыялу. Не часта даводзіцца бачыць у якасці суправаджэння танцаў аркестры або аркестравыя групы. А магчымасці ж такія ёсць і ў спецыялізаваных школах, і ў дамах піянераў і школьнікаў.

Прымушае сур'ёзна задумацца і паслабленне цікавасці да беларускага танца. Напрыклад, беларускія творы, якія выконваліся на мінскім гарадскім конкурсе танцавальных калектываў агульнаадукацыйных школ, склалі ўсяго трэць, а на конкурсе калектываў пазашкольных устаноў і таго менш — чацвёртую частку.

У сцэнічных беларускіх танцах часта адсутнічае, на жаль, самабытная нацыянальная аснова, тое зерне, якое дазваляе беспамылкова пазнаць і класіфікаваць танец, г. зн. аднесці яго да культуры пэўнага народа. Тлумачыцца гэта слабай дасведчанасцю дзіцячых харэографаў у галіне нацыянальнай мастацкай творчасці. Больш таго, адзін кіраўнік дзіцячага калектыву спрабаваў нават даказваць, што ў Беларусі няма танцавальнага фальклору, а гульняў дзіцячых і зусім не захавалася. Яму і падобным трэба было б ведаць, што наша рэспубліка — край, у якім найбольш поўна можна сустрэць аўтэнтычны фальклор ва ўсёй яго шматстайнасці. Пра гэта сведчаць і шматтомныя акадэмічныя выданні па фальклоры (дзіцячым, у прыватнасці), і палявыя назіранні нашых фалькларыстаў і этнографаў. Трэба толькі хацець і ўмець убачыць.

І яшчэ. Патрабуе абавязковага і сур'ёзнага разгляду пытанне аб касцюмах калектываў. Пра якое эстэтычнае выхаванне ў цэлым можа ісці гаворка, калі кіраўнікам танцавальных гурткоў даводзіцца свядома ўносіць у выяўленчую частку танцаў элементы эклектыкі? З-за адсутнасці патрэбных касцюмаў ім даводзіцца, інакш не скажаш, «упрыгожваць» беларускі танец рускімі касцюмамі або «фарміраваць» маляўнічы вобраз з касцюмаў украінскага і прыбалтыйскіх народаў...

Такім чынам, ёсць падстава гаварыць, што ў многіх гарадах і раёнах рэспублікі не надаецца пэўнай увагі развіццю гэтага жанру, адсутнічае кантроль за работай дзіцячых танцавальных калектываў з боку кіруючых органаў і адпаведных устаноў народнай асветы. На сённяшні дзень ні ў аддзелах народнай асветы, ні ў вышэйстаячых арганізацыях не вядзецца пажанравы ўлік калектываў, не кантралюецца іх канцэртная і конкурсная дзейнасць. Напрыклад, у гарадскім аглядзе-конкурсе, прысвечаным XXVI з'езду КПСС і XXIX з'езду Кампартыі Беларусі, чамусьці не ўдзельнічалі танцавальныя калектывы гарадскога Дома піянераў і школьнікаў і дамоў піянераў і школьнікаў Маскоўскага і Цэнтральнага раёнаў г. Мінска. Не было на гэтым конкурсе і харэаграфічных калектываў школ Першамайскага і Савецкага раёнаў.

Вынікам нізкага ўзроўню самадзейнага харэаграфічнага мастацтва школ і пазашкольных устаноў, на наш погляд, з'яўляецца адсутнасць сістэмнага падыходу да перападрыхтоўкі кадраў — кіраўнікоў танцавальных калектываў, педагогаў рытмікі і танца. Таму, думаецца, вырашыць шэраг праблем у галіне дзіцячай мастацкай творчасці дапамог бы метадычны сектар, у адкрыцці якога ёсць вострая неабходнасць. Сектар ажыццяўляў бы арганізацыйна-метадычнае кіраўніцтва мастацкай творчасцю ў сістэме Міністэрства асветы рэспублікі.

І яшчэ. Наспела патрэба ў планавым павышэнні кваліфікацыі спецыялістаў па харэаграфіі менавіта ў сістэме адукацыі, дзе пакуль што гэтаму пытанню не надаецца ніякай увагі. На наш погляд, гэтую місію могуць і павінны ўзяць на сябе рэспубліканскі, абласныя, мінскі гарадскі інстытуты ўдасканалення настаўнікаў. Прафесійную метадычную дапамогу ў падрыхтоўцы і правядзенні курсаў, семінараў і іншых форм вучобы закліканы аказваць таксама адпаведныя навукова-метадычныя цэнтры народнай творчасці і культурна-асветнай работы.

Мы лічым неабходным паставіць на парадак дня абмеркаванне пытання аб павелічэнні набору студэнтаў на харэаграфічнае аддзяленне Мінскага інстытута культуры. Пакуль што існуе вострая патрэба ў кадрах. Першы выпуск спецыялістаў па харэаграфіі вышэйшай кваліфікацыі адбыўся толькі сёлета. Нават калі інстытут штогод будзе выпускаць 25 харэографаў, дык кожны са 117 раёнаў рэспублікі атрымае аднаго такога спецыяліста толькі праз 5 гадоў. А як быць цяпер? На маю думку, справе фарміравання рэпертуару самадзейных танцавальных калектываў значную дапамогу можа аказаць кафедра харэаграфіі Мінскага інстытута культуры. У яе багажы ёсць цікавыя і таленавіта вырашаныя харэаграфічныя пастаноўкі, створаныя студэнтамі ў сценах інстытута, якія не атрымалі яшчэ свайго ўвасаблення на самадзейнай сцэне.

Ёсць неабходнасць арганізаваць пры абласных палацах піянераў і школьнікаў пастаянныя семінары, дзе кіраўнікі змогуць не толькі набыць тэарэтычныя і практычныя навыкі, але і абмяняцца вопытам, атрымаць кваліфікаваную кансультацыю.

М. КАЗЕНКА,
загадчык аддзела харэаграфічнага мастацтва Рэспубліканскага навукова - метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы.

«КРЫНІЦА», «НЁМАН», «ПОЛЫМЯ» — СЯРОД ПЕРАМОЖЦАЎ

У Маскве, на ВДНГ СССР закончыўся агляд-конкурс лепшых калектываў мастацкай самадзейнасці «Пяю маю Айчыну!», які працягваўся больш за чатыры месяцы. У творчым спаборніцтве ўдзельнічала 45 ансамбляў песні і танца, народных хораў і мастацкіх агітбрыгад, выступілі 2000 таленавітых выканаўцаў з усіх саюзных рэспублік.

У ліку пераможцаў — тры калектывы, якія прадстаўлялі самадзейнае мастацтва Беларусі. Гэта народны хор «Крыніца» Юнішчанскага сельскага клуба Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, народны ансамбль песні і танца «Нёман» з Гродна і стаўбцоўскі народны агіттэатр «Полымя» Мінскай вобласці.

Конкурсная праграма «Крыніцы» — аднаго з лепшых сельскіх калектываў Брэсцкай вобласці — адкрылася выкананнем песні «Спявай, маё Палессе», напісанай яго мастацкім кіраўніком, хормайстрам Мікалаем Вайцяхоўскім. А потым гучалі народныя і сучасныя песні роднага краю. Журы высока ацаніла выступленне хору «Крыніца».

Ансамбль «Нёман» за дваццаць пяць гадоў творчага жыцця заваяваў шырокую папулярнасць не толькі на Гродзеншчыне, а і ў многіх гарадах РСФСР, Літвы, Малдавіі, Украіны і за мяжой. Яму апладзіравалі ў ГДР, Польшчы і Шры Ланка. У Маскве конкурсная праграма «Нёмана» цалкам адпавядала ўмовам агляду і атрымала высокую ацэнку журы — 23 балы. На прафесійным узроўні прагучалі ў выкананні хору і салістаў В. Ярошынай, О. Кінцурашвілі і Л. Ігнатавай карагодныя песні і творы савецкіх кампазітараў, такія, як «Песня пра Нёман» (Н. Сакалоўскага і А. Астрэйкі), «Беларусь — мая песня» (Ю. Семянякі і М. Браўна). Упрыгожаннем канцэрта былі вакальна - харэаграфічныя сюіты, створаныя на аснове фальклорнага матэрыялу, запісанага ў раёнах Гродзенскай вобласці. Гэта «Ой, зелена-зелена» і «Рассыпухі-полькі», у якіх асабліва ярка праявіліся талент мастацкага кіраўніка ансамбля А. Чопчыца, майстэрства вакалістаў (хормайстар А. Стрыха), артыстычнасць салістаў танцавальнай групы (балетмайстар Л. Ляшэнка).

Стаўбцоўскі агіттэатр «Полымя» — добра вядомы калектыў, удастоены прэміі абкома камсамола, пераходных сцягоў ВЦСПС і Міністэрства культуры СССР за выдатнае абслугоўванне працаўнікоў сяла.

«Час. Радзіма. Мы» — так называецца агітспектакль, паказаны на конкурсе (сцэнічная кампазіцыя і пастаноўка Марыі Грэсь). Выканаўчае майстэрства ўдзельнікаў і рэжысура Лідзіі Кузняцовай асабліва ярка праявіліся ў фрагментах агітспектакля «Беларусь — Расія», «Юнацтва прадаўжае эстафету», «Імя нам — камсамол».

Усе калектывы Беларусі — удзельнікі агляду-конкурсу «Пяю маю Айчыну!» — удастоены дыпломаў галоўнай выстаўкі краіны, а лепшыя салісты і кіраўнікі прадстаўлены да ўзнагароджання медалямі ВДНГ СССР, якія ўручаюцца пераможцам, звычайна, у канцы года.

Цяпер да лаўрэацкіх званняў, якія ёсць у пераможцаў агляду, дабавілася яшчэ адно — «Дыпламант ВДНГ СССР 1981 года».

В. БЕЛЯКОЎ,
рэжысёр, член Усерасійскага тэатральнага аб'яднання.
Фота аўтара.

Стаўбцоўскі народны агіттэатр «Полымя». Сцэна са спектакля «Час. Радзіма. Мы».

Выступае народны ансамбль песні і танца «Нёман».

ПРЫРОДА І МЫ

Вярніце Дняпру ластавак

Яшчэ ў сівую даўніну, недзе на стыку VIII і IX вякоў, высозная круча, пад якой у мнагаводны Дняпро шырока ўлівала свае воды чыстая Дубравенка, закурылася дымамі вогнішчаў. Нашы прашчуры-радзімічы ведалі, дзе разбіваць гарадзішча. Больш зручнага і бяспечнага месца ў наваколлі не было. Усе абшары адсюль, з кручы, якую пасля перайначылі і пачалі зваць Валам, — як на далоні. Вораг не падступіцца, не нападзе знянацку. Галоўная ж выгода — бацюхна-Дняпро. І кармілец ён, і паілец, і ахоўнік надзейны.

Магутная і прыгожая рака дала прытулак на сваім беразе паселішчу, адгарадзіла яго з тыльнага боку глыбокімі рэчышчамі-ярамі сваіх прытокаў Дубравенкі, Струшні, Дзебры, выпеставала, выняньчыла і нават не пашкадавала свайго імя. Стала гэта паселішча звацца Магілёвам на Дняпры.

І пацяклі, пакаціліся гады, цэлыя вякі. Рака давала гораду ўсё, што магла. Горад, з свайго боку, шанаваў раку, славіў яе ў песнях, паданнях, былінах.

Першыя хмурынкі на чале Дняпра з'явіліся ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. Магілёў станавіўся прамысловым горадам. Невялікія фабрычкі, заводзікі, саматужныя майстэрні раслі, як грыбы ў прыдняпроўскіх лясах пасля спорнага летняга дажджу. Хутка іх ужо налічвалася пад дзве сотні. А дзе прамысловая вытворчасць, там і адыходы, забруджаныя сцёкі. Куды іх? А ў Дняпро. Балазе, усюды крутыя схілы і можна без клопату рабіць самацечныя канавы. Так замест згоды і ладу паміж горадам і ракой пачаўся зацяжны канфлікт. Дняпро па-ранейшаму карміў і паіў Магілёў, быў надзейнай транспартнай артэрыяй. Горад жа пачаў «аддзячваць» рацэ атрутай.

Усё гэта пакуль што прыказка, якая патрэбна, каб паказаць нашай гісторыі сувязныя ніці. Век навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ўнёс у адносіны паміж горадам і ракой рашучыя карэктывы. І не ў лепшы бок. Праблема паглыбілася і расшырылася. Калі раней Дняпро хмурыўся, але спраўляўся з параўнальна дробнымі порцыямі атруты, то сёння яму ўжо самому не пад сілу перамалоць, растварыць і абясшкодзіць усю тую каламутную плынь, якую скідвае ў раку прамысловы горад.

Слова наша — у абарону ракі, а значыць — і ў абарону горада Магілёва.

АБРЫСЫ ГЕНПЛАНА

Магіляўчан не назавеш Іванамі, якія не помняць, адкуль яны родам. Не, яны цудоўна разумеюць, што значыць для іх Дняпро, якая роля належыць яму ў жыцці горада. Таму ўсе свае планы, праекты, перспектыву развіцця Магілёў знітоўвае з Дняпром, прымярае да Дняпра.

Ужо ў першым генеральным плане забудовы Магілёва, які набыў сілу перад самай вайной, Дняпро разглядаўся як галоўная кампазіцыйная вось развіцця ўсёй гарадской гаспадаркі. Пасляваенны генплан грунтаваўся на той жа ідэі. Не адмовіліся ад яе і складальнікі трэцяга генплана, зацверджанага ў 1969 годзе. Цяпер і гэты план скарэкціраваны, у яго ўнесены істотныя дапаўненні і змены. Акрэсліваецца, уласна кажучы, новы, чацвёрты па ліку, генеральны план.

Мнагавата генпланаў, зашмат карэнных перавёрстак. Але не пра гэта наша гаворка. Тым больш, што карэктывы, зробленыя зараз, падказаны самім жыццём. Яны, можа, нават як ніколі раней, зроблены ў інтарэсах Дняпра.

Мяркуйце самі.

Дагэтуль па Дубравенскім, Струшненскім і Дзебранскім ярах планавалася пракладка скарасных магістралей. Гэта азначала новую пагрозу для Дняпра. Уявіце сабе ажыўленыя, забітыя транспартам вуліцы, якія пракладзены па дне яраў і даволі прыкметна нахілены ў бок рачнога абалонішча. Не толькі буйны лівень, а і звычайны дождж лёгка змые з такіх магістралей увесь бруд, рэшткі гумы, усялякіх там салярак, нігролаў і тавотаў і бесперашкодна панясе ў раку. Такім чынам, у самім генеральным плане развіцця Магілёва, які дзейнічаў дасюль, была закладзена небяспечная экалагічная міна.

Цяпер міну абясшкодзілі. Узяўшы пачатак ад Пячэрскага лесапарку, па Дубравенскім і Струшненскім ярах праляжа зялёны пояс Магілёва. У спецыяльным рашэнні выканкома абласнога Савета народных дэпутатаў абумоўлены тэрміны расчысткі і паглыблення Дубравенкі, прывядзення ў належны парадак усёй наваколь-най тэрыторыі.

І ўвогуле праект новага генплана, які, дарэчы, ужо разгледжаны і ўхвалены на сесіі гарадскога Савета народных дэпутатаў — з перспектывай развіцця на шмат гадоў, прасякнуты высакароднай ідэяй беражлівых адносін да прыроды, аховы навакольнага асяроддзя. Асаблівае месца ў ім адведзена закладцы зялёнай зоны.

Высвятляецца, што зялёная зона для Магілёва — вельмі балючае месца. Парадаксальная з'ява! Цэнтр ляснога краю бедны на паркі, скверы, вулічныя і дарожныя прысады.

— Робім круты паварот! — галоўны архітэктар Магілёва Юрый Сяргеевіч Іўжанка з прыкметным задавальненнем глядзіць на вялізны план-схему, разгорнуты на доўгім стале. — Тут уся наша перспектыва. Вось Дубравенскі пояс... Вось Падніколле — тут будзе цэнтральны парк... А вось задняпроўскі зялёны масіў, зона адпачынку хімікаў...

З перспектывай Дубравенскага пояса нам што-нішто ўжо ясна. А от якія планы наконт славутага Падніколля? Нават сама непрыпарадчаная падніколльская лукавіна — неацэнны дар ракі гораду. Яна выгінаецца ад чыгуначнага да цэнтральнага моста і ахоплівае вялікую тэрыторыю — і ўдоўж, і ўшыркі. Раней тут быў раўнюткі багаты поплаў. Цяпер трава далёка не тая, дый прызначэнне Падніколля іншае. Яно — зона адпачынку. Мяккія пясчаныя пляжы, пругкі шаўкавісты мурог. Адно што тэрыторыя амаль зусім не абсталявана, не ўпарадкавана. Ды вось суцяшальная вестка: Падніколле стане галоўным паркам Магілёва.

Чакайце, а ці не вабілі магіляўчан такой абяцанкай у мінулым? Даўнавата гэта было— ці не два дзесяткі гадоў назад, але тут ужо развешваліся на слупах рэкламныя шыльды, якія абяцалі, што зашуміць Падніколле густымі шатамі, парадуе ў спякоту цяністымі алеямі. Пасля панаўтыкалі дзе-нідзе гонкіх дубцоў. Зараз ад тых дубцоў нават пянькоў не засталося.

Здаецца, сумная гісторыя, у якой было больш гаманы і абяцанак, чым няхітрай справы, на новым вітку не паўторыцца. Інстытут «Магілёўграмадзянпраект» распрацаваў неблагую схему добраўпарадкавання Падніколля. Насыпная дамба аддзеліць пляжную зону ад асноўнай часткі парку і заступіць дарогу паводкам. На колішнім поплаве размесцяцца бытавыя і гандлёвыя павільёны, спартыўныя пляцоўкі, атракцыёны. Хопіць тут месца і для новага стадыёна.

Ну, а наконт задняпроўскага зялёнага масіву, дык яго абрысы яскрава акрэсліваюцца ўжо зараз. Асобна — дзіцячая зона плошчай каля 60 гектараў. Тут вам і гідрапарк, і востраў з казачным гарадком, і фантан-каскад. Заўважце: гідрапарк, востраў, фантан... Усё гэта водныя збудаванні, яны— ад Дняпра.

Для больш поўнай абмалёўкі антуражу назавём яшчэ водную спартыўную базу з вяслярным каналам, шыкоўнастрогую набярэжную.

Расказваю пра ўсё гэта, а самога гняце думка, — ці не здарыцца, што гідрапарк перасохне, вяслярны канал застанецца без вады, а гранітна-чыгунная набярэжная апынецца з абодвух бакоў на сухім беразе? Калі не ў блізкай, то не ў такой ужо і далёкай будучыні? Няма для гэтага падстаў? Паглядзім.

МАГІЛЁЎСКІ ВАКУУМ

Што Дняпро ў межах Магілёва абмялеў, ні для кога не сакрэт. Этапы гэтага абмялення доўгімі пісягамі-зарубкамі адзначаны па берагах. Зірнеш — і становіцца не вельмі весела.

Называюцца тры асноўныя прычыны, якія вядуць да абяскроўлівання Дняпра: недаравальнае абыходжанне з яго прытокамі, неразумная меліярацыя і неабачлівая высечка лясоў. Усё гэта правільна. Спажывецкае абыходжанне з зямлёй і яе натуральнымі багацтвамі, якое дапускалася і дапускаецца многімі гаспадаркамі, арганізацыямі і прадпрыемствамі, нанесла непапраўны ўрон і Дняпру, і іншым рэчкам.

Але ёсць у Дняпра і свая ўласная балячка, мясцовая, так сказаць, закавыка. Вышэй Магілёва ўзровень дняпроўскіх вод куды вышэйшы, чым у самім горадзе. Што ж гэта за такая загадка? Павінна быць наадварот, а тут — нейкая анамалія. Калі б ложа ракі праходзіла па карсту, трэба было б шукаць гіганцкія варонкі ці якія правалы, куды знікае вада. Але ж не, рэчышча ў Дняпра трывалае, без усялякіх таямніц.

Разгадка простая. Перад Магілёвам на дняпроўскіх берагах прыладзіліся магутныя помпавыя станцыі і, быццам прагавітыя цмокі, бясконца п'юць рачную ваду. А вады прадпрыемствам хімічнай прамысловасці трэба вельмі шмат.

Вытворчасць увесь час расшыраецца, адпаведна расце і спажыванне вады. Дык што ж урэшце стане з Дняпром у Магілёве пры такіх адносінах? Ці не паўторыць ён лёс некалі паўнаводнай Дубравенкі, якая цяпер стала гарадской сцёкавай канавай? Бачыце, меркаванне, што задняпроўская набярэжная можа апынуцца далёка-далёка ад вады, не такое ўжо і беспадстаўнае.

Дзе ж выйсце?

Па-першае, у зваротным водазабеспячэнні. Скарысталі ў вытворчасці ваду — прапусцілі яе праз ачышчальныя збудаванні — зноў пусцілі ў абарот. Так,напрыклад, робяць на металургічным заводзе. На замкнуты водазварот пераведзены і сталеліцейны цэх аўтамабільнага завода імя Кірава. Многае ў гэтых адносінах могуць зрабіць і астатнія прадпрыемствы горада. Але не робяць. Усё цудоўна ведаюць і разумеюць, але, на вялікі жаль, не робяць.

Па-другое, у магчымасці рэгуляваць узровень ракі. Для гэтага трэба плаціна. Савецкія органы горада пасля старанных разлікаў і падлікаў выказаліся за будаўніцтва плаціны ніжэй Магілёва. Але ў гарадскім бюджэце сродкаў на плаціну няма. Хто ж павінен у такім выпадку раскашэліцца? Логіка падказвае: той, хто без усякага абмежавання чэрпае ваду з Дняпра вышэй горада. У першую чаргу гэта Магілёўскае вытворчае аб'яднанне «Хімвалакно». Яму, як гаворыцца, і карты ў рукі.

Толькі з дапамогай плаціны можна запоўніць вакуум, які ўтварыўся ў дняпроўскім рэчышчы каля самога Магілёва.

КРОПЛІ ДЗЯЎБУЦЬ КАМЕНЬ

Не выпадкова Магілёў стаў пабрацімам балгарскага горада Габрава, славутага сваімі фестывалямі смеху. Тут таксама маюць схільнасць да гумару і жартаў.

Вось радкі з дакумента, напісанага галоўным санітарным урачом Магілёва Н. Ф. Жыгуновым: Днепр у межах горада забруджваецца ліўнеспускамі, у тым ліку размешчанымі вышэй гарадскіх пляжаў, выкідамі «ўмоўна-чыстай» вытворчай вады, водамі Струшні, Дзебры, Дубравенкі, а ніжэй горада...

Даруйце, наконт «ніжэй горада» мы і пагаворым ніжэй. А пакуль вернемся ўверх па цячэнні Дняпра і спынімся ў Шклове.

Дзесяць гадоў — з 1964-га па 1974-ы — магілёўская басейнавая інспекцыя па скарыстанні і ахове водных рэсурсаў вяла сапраўдную вайну з дырэкцыяй шклоўскай папяровай фабрыкі «Спартак». Фабрыка без аніякай ачысткі спускала вытворчыя адыходы ў Дняпро. Штраф набягаў на штраф. Але ці такі ўжо страшны гэты штраф, калі дырэкцыя плаціла яго не з уласнай, а пераважна з дзяржаўнай кішэні? Нарэшце фабрыка ўзвяла ачышчальныя збудаванні, цяпер толькі зрэдку са шклоўскіх берагоў у Дняпро прарываецца моцна забруджаная вада. Але сляды засталіся і будуць яшчэ доўга значыцца. Шкоду, якую папераробы нанеслі рацэ ў мінулым, цяжка будзе выправіць.

Шмат гадоў каламуцілі Дняпро розным брудам прадпрыемствы Магілёва. І яны нарабілі рацэ, а праз яе ўсяму навакольнаму расліннаму і жывёльнаму свету нямала ран, якія ніяк не могуць загаіцца. І чаго толькі не скідвалі ў Дняпро, дый цяпер цішком скідваюць. Камбінат шаўковых тканін штрафаваўся за зліванне ў каналізацыю шкодных фарбавальнікаў. Вагоннае і лакаматыўнае дэпо «падкінулі» рацэ дзесяткі тон мазуту. Ды ці пералічыш усё. Басейнавая інспекцыя толькі сёлета за яўныя парушэнні аштрафавала 62 кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый вобласці і зрабіла 85 заключэнняў аб пазбаўленні іх прэмій — гэта ўжо за невыкананне ўзгодненых мерапрыемстваў па ахове і рацыянальным скарыстанні водных рэсурсаў. Ну, проста коціцца па Магілёўшчыне нейкая масавая эпідэмія абыякавасці, безадказнасці. Іначай не назавеш.

Але ўсё сказанае пакуль яшчэ не самы апагей дняпроўскіх мітрэнгаў. У гэтым пераконваешся, калі ўведаеш, як абстаяць справы ніжэй Магілёва, за той рысай, дзе ў Дняпро вяртаецца вада, засмактаная помпавымі станцыямі перад горадам. Па тэхналогіі яна, прайшоўшы ачышчальныя збудаванні вытворчага аб'яднання «Хімвалакно», павінна быць ледзь не крышталёва чыстай. Але ж тэхналогію трэба захоўваць, а на прадпрыемствах не ўсе з ёю ў ладах.

У 1979 годзе з-за неахайнасці работнікаў камбіната тут здарылася вытворчая аварыя. Паток хімічнай сыравіны рынуўся на ачышчальныя збудаванні, перапоўніў іх і абрынуўся ў Дняпро. Што тварылася ў той дзень на рацэ ад Магілёва да Быхава, відавочцы расказваюць па-рознаму. Таму давайце звернемся да афіцыйнай асобы — начальніка басейнавай інспекцыі М. Алейнікава.

— Аналізы паказалі тады, — дае даведку Мікалай Іосіфавіч, — што забруджанасць вады перавышала дапушчальныя нормы.

Што з жывога магло застацца ў Дняпры пасля такой навалы на гэтым участку?

А такую навалу Дняпро перанёс апошнім часам неаднойчы. Каб не быць галаслоўным, прывяду радок з загада па «Хімвалакне»: «Сістэматычна дапускаюцца звышнарматыўныя выкіды забруджванняў у сцёкавыя воды цэхамі...» (называецца адразу пяць вялікіх цэхаў). Калі перакласці гэту канцылярскую мову, аздобленую тэхнічнымі тэрмінамі, на звычайную, то чытацца будзе так: «Сістэматычна цэхамі прадпрыемства забруджваюцца і Дняпро, і яго наваколле». Называюцца ў загадзе прычыны ўсяго гэтага нядбайства: парушэнне тэхналагічных рэжымаў і нездавальняючы стан тэхналагічнага абсталявання. Карацей кажучы, самі ва ўсім і вінаваты.

Лёс Дняпра абцяжарваецца тым, што кожны выкід хімічнай сыравіны выводзіць са строю ачышчальныя збудаванні, у першую чаргу біялагічныя. А імі зараз карыстаецца амаль увесь Магілёў. Колькі ж гэта бруду трапляе ў раку пасля кожнай, нават невялікай аварыі ў хімікаў?

Аб'яднанне «Хімвалакно» мае свой аддзел аховы прыроды. Што-нішто аддзел робіць. А калі ўлічыць, што ён не надта населены (на камбінаце «Лаўсан» — 4, а на заводзе імя Куйбышава — 2 чалавекі), то можна гаварыць і аб пэўнай загружанасці работнікаў аддзела. Праўда, іхняя работа пераважна канцылярская, папяровая. Але і пэўны кантроль за станам вытворчасці і навакольнага асяроддзя яны па магчымасці вядуць.

Насцярожвае іншае — зацятае імкненне работнікаў аддзела схаваць, замаскіраваць хібы. Яны самі выступаюць на розных нарадах, рыхтуюць матэрыял для праваздач кіраўнікам аб'яднання. Толькі апошнім часам пра арганізацыю аховы прыроды службамі «Хімвалакна» гаварылася на выканкоме гарадскога Савета народных дэпутатаў, на пасяджэнні абласнога савета Беларускага таварыства аховы прыроды, за «круглым сталом» газеты «Магілёўская праўда». І кожны раз чуліся варыяцыі вядомай песенькі — «все хорошо...».

Мы гаварылі пра небяспечныя прарывы хімічнай сыравіны. А гэта ж яшчэ не ўсё. Камбінат «Лаўсан» размешчаны на левабярэжнай надабалоннай тэрасе, і ўсе сцёкі адсюль скочваюцца і прасочваюцца ў Дняпро. А разам з вадой сплывае і тое, што асядае на зямлю з заводскіх комінаў, вентыляцыйных установак і іншых выкідных прыстасаванняў. Перагарадзіць шкодным рэчывам дарогу ў раку павінна санітарна-ахоўная зона. З уводам першай чаргі камбіната павінна была дзейнічаць кіламетровая зона, потым — пяцікіламетровая. Ідзе ўжо другое дзесяцігоддзе з часу пуску камбіната, а зоны няма. Спрабавалі для адчэпнага там-сям саджаць дрэўцы, і то палавіна іх загінула.

Вялікія сродкі адпускаюцца дзяржавай камбінату «Хімвалакно» на мерапрыемствы, звязаныя з аховай прыроды. Ён у Магілёва па ўсіх параметрах — галаўное прадпрыемства. Тут можна было б прыводзіць цэлыя калонкі лічбаў, аперыраваць сотнямі тысяч і мільёнамі рублёў, гаварыць пра іх вельмі маруднае асваенне хімікамі. Але вазьму толькі дзве, зусім невялікія лічбы, іх лягчэй уявіць, супаставіць і зрабіць на гэтай аснове недвухсэнсоўны вывад. Для завяршэння недаробак на другой чарзе ачышчальных збудаванняў камбінату на гэты год адпушчана 80 тысяч рублёў. Асвоена... паўтары тысячы.

Вось вам і ўвесь клопат магілёўскіх хімікаў пра гордасць нашу — старажытны Дняпро.

ДУБРАВЕНКА, ДУБРАВЕНКА...

У свой час Магілёў наведаў польскі мастак Юзаф Пешка. Пісаў ён алегарычныя кампазіцыі, партрэты, пейзажы. І от шчаслівая выпадковасць. На адным з пейзажаў — магілёўская Дубравенка.

Выкладчык Беларускага політэхнічнага інстытута Юрый Нікадзімавіч Кішын спецыяльна прывёз копію гэтага малюнка ў Магілёў, каб паказаць, якімі на рубяжы XVIII і XIX стагоддзяў былі Дубравенка і навакольныя мясціны. Перад намі сапраўдная рака шырынёй ці не за дваццаць метраў.

А можа, Юзаф Пешка перабольшаў? Ды не, на малюнку — сама рэальнасць. Гэта ж факт, што яшчэ ў пачатку стагоддзя ў Дубравенку заходзілі з Дняпра баржы і разгружаліся ля купецкіх лабазаў, размешчаных паабапал рэчкі.

Потым Дубравенка заняпала. І магіляўчане з гэтым змірыліся. Аднак апошнім часам слова «Дубравенка» зноў ва ўсіх на вуснах. Гэта звязана з праектам стварэння Дубравенскага зялёнага пояса, які ў агульных рысах нам ужо знаёмы. Цудоўны праект, перспектыўны. Але ж усё гэта будзе яшчэ вунь калі. А што робіцца ў Дубравенскім яры зараз?

Я прайшоў па дне яра ад высока ўзнятага над Дубравенкай моста па праспекце Міру да самага Дняпра. Ісці давялося іншым разам затыкаючы хусцінкай нос — гэтак патыхала ад некалі чыстай Дубравенкі, якую зараз, добра разагнаўшыся, можна перескочыць. Не рэчка, а звілістая канава для сцёкаў, смецця, рознага бруду.

Як нейкі здзек. успрымаюцца папрыбіваныя да дрэў жоўтыя шыльдачкі, якімі самым найстражэйшым чынам забараняецца скідваць у Дубравенку смецце. Ёсць такая шыльдачка і каля перакіднога моста, што вядзе да вучэбна-вытворчага прадпрыемства. Над левай парэнчай моста — шыльдачка, а пад правай — шырэзная гарлавіна каналізацыйнай трубы. Вакол іншых шыльдачак — кучы бытавога смецця, будаўнічага друзу, жалезнае ламачча. Акурат як гарадская звалка.

Ну, няўжо нельга цяпер вось, не чакаючы, пакуль той праект стварэння зялёнага пояса пачне набываць рэальныя абрысы, узяцца ўсёй грамадой і навесці элементарны парадак у Дубравенскім яры, хоць трошкі пачысціць саму рачулку? Ды для гэтага магіляўчанам хопіць аднаго-двух суботнікаў.

Тое ж самае дзеецца і ў Дзебранскім яры. Краявіды тут, бадай, яшчэ прыгажэйшыя, чым над Дубравенкай і Струшняй. Хвалепадобныя схілы — пакатыя і крутыя, глыбіня такая, што глянеш зверху — і ажно галава кружыцца. У бакі ад галоўнага яра разбягаюцца звілістыя атожылкі. Ды тут жа курортную ці запаведную зону можна рабіць. Замест гэтага — тая ж сцёкавая канава і той жа смётнік.

БЛАКІТНАЯ МАРА: БЕЛЫ ПАРАХОД

Магілёўскі журналіст Вацлаў Гільбурд, які, дарэчы, актыўна займаецца праблемамі экалогіі і з'яўляецца членам прэзідыума абласнога аддзялення Таварыства аховы прыроды, прыгадвае, што да вайны на дняпроўскай прыстані можна было ўбачыць плывучы дом адпачынку. Бегаў ён па маршруце «Магілёў — Кіеў — Магілёў» і карыстаўся вялікай папулярнасцю ў магіляўчан. Пуцёўкі на белы параход былі нарасхват.

Хадзілі па Дняпры і звычайныя параходы. Воднае падарожжа заўсёды прываблівала людзей: едзеш сабе па справе і адным часам адпачываеш.

Цяпер рэдка ўбачыш каля Магілёва звычайную баржу — няхітрую пасудзіну, якая некалі свабодна праходзіла нават у вусце Дубравенкі. У летнія ж месяцы, калі Дняпро зусім мялее, нават баржы становяцца ў затоку. Нічога не зробіш: магілёўскі водны вакуум робіць сваю справу.

Ніжэй горада — іншая сітуацыя. Тут зноў павышаецца ўзровень вады і могуць хадзіць не толькі буксіры з баржамі, а і рачныя трамваі, цеплаходы. Але пуста на рацэ, толькі зрэдку прабяжыць якая маторка з рыбакамі. Зрэдку таму, што рыба ў тутэйшых вірах і затоках амаль не водзіцца.

Да Магілёўскага рачнога порта цяпер прыпісана паўдзесятка буксіраў-штурхачоў. З такім, даруйце, флотам жыццё ў рачнікоў вольнае і спакойнае. Ці не таму яны і прыдумалі версію, быццам аднаўленне руху пасажырскага транспарту па Дняпры нерэнтабельнае. Чаму нерэнтабельнае? Хто рабіў такія падлікі? Канцоў знайсці ніяк не ўдалося. Нерэнтабельнае — дый годзе!

Мець пад бокам такую раскошу, як водны шлях, і не карыстацца ім — дык гэта ж не па-гаспадарску. Аднаўленне нармальнага руху па Дняпры ў ваколіцах Магілёва — таксама немалаважная праблема, і яна павінна разглядацца ў комплексе з іншымі праблемамі ракі.

●

З выступу Вала, на якім размясціўся мемарыяльны помнік барацьбітам за Савецкую ўладу на Магілёўшчыне, развінаюцца шырокія далягляды. Можа, акурат тут, на Валу, у магілёўскага паэта Васіля Матэвушава і нарадзіліся некалі вось гэтыя лірычныя радкі:

Коцяць рэчкі спакойныя воды,
Правады загулі над сялом.
Сенажаці, прапахлыя мёдам,
Дыванамі ляжаць за Дняпром.

Цяпер задняпроўскія сенажаці, на вялікі жаль, не пахнуць мёдам. Дый у ваколіцах Магілёва ўвогуле мала іх засталося, колішніх поплаўных сенажацей.

І ластаўкі сёлета ў Магілёў не прыляталі.

Вы, відаць, ведаеце, што ластаўкі вельмі любяць гняздзіцца ў прырэчных паселішчах. Іх вабіць блакіт вады і вышыня неба над гэтым вільготным блакітам. Магілёў не быў выключэннем. Пад стрэхамі гарадскіх хат, асабліва на Машэкаўцы і Дубравенцы, ляпіліся сотні, тысячы ластаўчыных гнёздаў. Імклівыя птушкі пагодлівымі днямі чарцілі неба над Дняпром, вялікімі чмялямі жвікалі над самай вадой, радаваліся свайму блакітнаму жыццю і людзей таксама радавалі.

А вось сёлета ластаўкі ў Магілёў не прыляталі. Зусім...

Барыс СТРАЛЬЦОЎ,
спецкар. «Літаратуры і мастацтва».

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

З БРЫГАДЫ ЗАСЛОНАВА

Споўнілася шэсцьдзесят гадоў вядомаму татарскаму паэту Закі Нуры. Яго жыццё цесна звязана з нашай рэспублікай. Ён служыў у арміі ў Беларусі, у Беластоцкай вобласці, на самай граніцы. Там яго застала вайна. Пагранічнікі першымі прынялі на сябе агонь ворага, першымі кінуліся ў атаку. Першымі давялося адчуць ім боль і горыч цяжкіх адступленняў. Закі Нуры трапляе ў партызанскую брыгаду пад камандаваннем легендарнага Канстанціна Заслонава. Спачатку быў падрыўніком, затым камандзірам партызанскай разведкі.

Вершы ў той суровы час пісаліся ў хвіліны зацішша. На іх ляжыць адбітак таго трагічнага часу. Закі Нуры займае асаблівае месца сярод татарскіх паэтаў-франтавікоў: ён прынёс у татарскую савецкую паэзію полымя партызанскіх кастроў Беларусі. У многіх сваіх вершах ён выказвае нязгасную любоў да нашай рэспублікі.

Пасля вызвалення Беларусі Закі Нуры працаваў некалькі гадоў намеснікам старшыні выканкома гарсавета ў Оршы, — аднаўляў разбураную вайной гаспадарку. З 1975 года ён — Ганаровы грамадзянін горада Оршы. Закі Нуры — аўтар зборнікаў паэзіі «Вершы», «Шлях славы», «Шчырая размова», «Узыходжанне», «Спяваюць закаханыя», «Поглядам простым», «Гэта наша кніга», «Дарогі і гады». Зборнік апавяданняў «І мёртвыя помсцілі» пісьменнік прысвяціў партызанскай барацьбе на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Творы Закі Нуры часта выходзяць у выдавецтвах Татарыі і Масквы. У 1973 годзе беларускія чытачы пазнаёміліся з кнігай лірыкі паэта на роднай мове «Радасць сустрэч». Пераклаў гэты зборнік вялікі атрад беларускіх паэтаў. Нядаўна да юбілею Закі Нуры маскоўскае выдавецтва «Художественная литература» выпусціла кнігу выбраных твораў паэта «Азоранасць». Закі Нуры актыўна выступае і як перакладчык. Ён пераклаў на татарскую мову зборнік вершаў Я. Коласа «На шляху» і кнігу «Беларускія паэты». Тэма дружбы савецкіх народаў, інтэрнацыяналізму займае адно з галоўных месц у творчасці паэта. Яна арганічна выцякае з усёй яго біяграфіі, з яго лёсу, з яго дарог, і яна поўная глыбокай перакананасці і жыццёвай праўдзівасці.

Закі НУРЫ

МАЁ БАГАЦЦЕ

Мае скарбы ў трох сховах сабраны,
Песні — ў першым,
А вершы — ў другім,
А ў трэцім — братэрства, яднанне —
Парадніліся ў сэрцы маім.

Песні Волгі, быліны і казкі
Салаўі падарылі мне.
І таму я лічу абавязкам
Завяшчаць іх маёй старане.

Ну, а вершы
Не дзеля славы
Сабіраў іх на полі я сам.
І таму карыстаюся правам
Раздаваць іх сваім землякам.

А багацце, што ў трэцім схове,
Набываць памагалі сябры,
І таму я не выпадкова
Хачу сыну свайму падарыць.

Няхай ён беражэ з любоўю,
Памнажае чужынцам на страх
Змацаваную дружбу крывёю
У беларускіх дрымучых лясах.

ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

Не, не схлушу ні вершам, ні прызнаннем
Табе, Радзіма. Мой з табою лёс...
Тваё дыханне — як маё дыханне.
І дні свае я ўсе табе прынёс.

З табой дзялюся радасцю і горам.
У тваёй працы — бачу я сваю.
Мацнееш ты — які для сына гонар!
Таму і старасць я не прызнаю.

Па ўсіх шляхах ты разаслала годы.
Дарожны вецер — спадарожнік мой.
Як добра, што, заручаны з паходам,
Дзень сустракаю снежаньскай парой!

Дзень нараджэння — стынь ідзе у госці:
Мароз рыпіць, нябёсаў хрусткі звон, —
Іскрыцца снегам, дражніць маладосцю
І старасць адкідае пад адхон.

У РАЗЛУЦЫ

Ты не кажы, што твой пагаснуў дзень,
Што адзінота мне набавіць сілы,
Святло ад зоркі сотні год ідзе,
Хаця, магчыма, зорка ўжо астыла.

Агонь любві — ярчэйшага няма,
Як зорка не згасае ён, высокі.
З ім і тады сустрэнешся сама,
Калі забудзеш, дзе яго вытокі.

Пераклаў Юрась СВІРКА.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯ «ЛіМа»

«ШТО МЫ ПАКІНЕМ У СПАДЧЫНУ»

Пад такой назвай у «ЛіМе» за 7 жніўня г. г. быў надрукаваны артыкул Я. Крамко, у якім аўтар справядліва наракаў на тое, што ў Карэліцкім раёне браканьеры адчуваюць сябе вельмі свабодна.

Рэдакцыя атрымала пісьмы ў адказ з Карэліцкага лясгаса і Дзяржкамітэта БССР па ахове прыроды.

Як паведаміў дырэктар лясгаса Я. Пешкур, артыкул Я. Крамко быў абмеркаваны на сумесным сходзе лясной аховы лясгаса і прэзідыума Карэліцкага раённага савета таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Было прызнана, што факты, выкладзеныя ў артыкуле, мелі месца і што аўтар правільна ставіць пытанне аб устанаўленні рэгламенту збірання грыбоў, ягад, арэхаў.

Адстрэл дзікіх звяроў праводзіўся па ліцэнзіях згодна з інструкцыяй. Разам з тым, трэба прызнаць, мелі месца і выпадкі незаконнага палявання. У мінулым годзе лясной аховай было затрымана 22 браканьеры, якія панеслі заслужанае пакаранне.

Распрацаваны мерапрыемствы па больш эфектыўнай барацьбе з браканьерамі.

У сваім пісьме в. а. старшыні Дзяржкамітэта БССР па ахове прыроды М. Дубавец адзначыў, што «аўтарам артыкула правільна закранута праблема рацыянальнага выкарыстання аховы і ўзнаўлення прыродных рэсурсаў у рэспубліцы. Сапраўды, на жаль, яшчэ маюць месца парушэнні, пра якія гаворыцца ў артыкуле. У краіне прыняты заканадаўчыя акты, якія рэгулююць парадак і нормы прыродакарыстання. У адпаведнасці з артыкулам 44 «Лясного кодэксу Беларускай ССР» выканаўчымі камітэтамі абласных Саветаў народных дэпутатаў устанаўліваюцца тэрміны карыстання лясными багаццямі, кантроль за якімі на месцах ажыццяўляюць органы Міністэрства лясной гаспадаркі БССР. У прыватнасці, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 6 жніўня 1980 года «Аб адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне лясного заканадаўства» вызначана, што асобы, вінаватыя ў самавольным зборы дзікарастучых пладоў, арэхаў, грыбоў, ягад на ўчастках, дзе гэта забаронена, падвяргаюцца штрафу. У памеры да 50 рублёў штрафуюцца асобы, вінаватыя ў парушэнні правіл палявання, або якія займаюцца незаконнай перапрацоўкай, продажам або скупкай пушніны.

Аднак Міністэрства лясной гаспадаркі БССР і Белрыбвод, якія ажыццяўляюць кіраўніцтва паляўнічай гаспадаркай і аховай рыбных запасаў у рэспубліцы, на жаль, не праяўляюць патрэбнай прынцыповасці і аператыўнасці ў арганізацыі аховы, рацыянальнага выкарыстання і ўзнаўлення рэсурсаў жывёльнага свету.

Заслугоўвае ўвагі і далейшага вывучэння пытанне аб стварэнні на асобных участках рэк месцаў, якія б асоба ахоўваліся, гэта б спрыяла захаванню і ўзнаўленню рыбных запасаў».

ПА ТОЙ БОК

БАГАТЫЯ БАГАЦЕЮЦЬ

Сацыяльныя кантрасты ў ЗША праяўляюцца больш рэльефна, чым у якой-небудзь іншай капіталістычнай краіне. 29,3 мільёна амерыканцаў, або 13 працэнтаў насельніцтва ЗША, жыве на даходы ніжэй афіцыйнай рысы беднасці. Сярод моладзі беспрацоўных 13,6 працэнта, а сярод неграў — да 20.

Гэта — адзін полюс. А вось другі: 20 працэнтаў амерыканцаў прысвойваюць амаль палавіну ўсяго нацыянальнага даходу краіны. Па дадзеных эканаміста Роберта Хейлбронера, трэцяя частка нацыянальнага багацця ЗША належыць аднаму працэнту насельніцтва, а 0,2 працэнта сем'яў — уладальнікі дзвюх трэціх гэтай уласнасці. 100 самых буйных фірмаў кантралююць 49 працэнтаў прамысловай вытворчасці краіны. А «заробкі» мультыміліянераў могуць толькі прысніцца рабочым. Так, прэзідэнт аўтамабільнай кампаніі «Форд мотар» Генры Форд II, па дадзеных друку, штогод атрымлівае звыш мільёна долараў. Кіраўнік другой аўтамабільнай карпарацыі «Джэнерал мотарс» Томас Мэрфі «зарабляе» крыху менш — усяго... 975 тысяч долараў.

Гіганцкі эканамічны патэнцыял, здольны ствараць велізарныя матэрыяльныя даброты, змог бы забяспечыць высокі ўзровень жыцця кожнаму грамадзяніну ЗША. Але ён служыць толькі багатым. Сямействы і дынастыі мультыміліянераў і міліярдэраў не толькі валодаюць багаццямі краіны, яны кантралююць і яе ўрад, вызначаюць (у сваіх інтарэсах, вядома) заканадаўства, падпарадкоўваюць сабе сродкі масавай інфармацыі.

У краіне «свабоды» і «роўных магчымасцей» дамінуе «свабода» багатых жыць за кошт бедных. На варце гэтай святой «свабоды» і стаіць капіталістычная дзяржава з усімі сваімі атрыбутамі. З дапамогай дзяржаўнага апарата буйны капітал перакладае на плечы працоўных увесь цяжар эканамічных няўвязак і крызісаў.

Важным сродкам абароны класавых інтарэсаў буржуазіі служыць падаткавая палітыка ЗША. Сістэма падаткавых ільгот і крэдытавання яўна служыць інтарэсам манаполій. Так, сем'і, чый штогадовы даход не перавышае 5 тысяч долараў, у працэнтных адносінах плацяць больш высокія падаткі, чым тыя сем'і, даходы якіх вышэйшыя. Падаткамі не абкладваюцца аблігацыі займаў, выпушчаных урадам, уладальнікамі якіх, як правіла, з'яўляюцца не працоўныя, а капіталісты ўсіх рангаў.

Велізарным цяжарам ціснуць на рабочых і фермераў ускосныя падаткі, якія з'яўляюцца адной з асноўных крыніц даходаў дзяржавы. Гэтыя падаткі распаўсюджваюцца на ўсе тавары і паслугі, прычым галоўным чынам на прадукты і прадметы паўсядзённага ўжытку. У выніку інфляцыі з году ў год зніжаецца жыццёвы ўзровень амерыканскіх працоўных. За перыяд з 1973 па 1980 год рэальная заработная плата амерыканскіх працоўных скарацілася, па афіцыйных дадзеных, на 10 працэнтаў, а па дадзеных друку — на 15 працэнтаў.

Велізарныя сродкі трацяцца на мілітарысцкія мэты, што яшчэ больш зніжае жыццёвы ўзровень шырокіх мас. Цяперашняя рэспубліканская адміністрацыя Рэйгана ў гэтых адносінах пабівае ўсе рэкорды. Каласальнае павелічэнне ваенных асігнаванняў і драконаўскае скарачэнне выдаткаў на сацыяльныя праграмы — такая аснова ўнутранай палітыкі Рэйгана. У гэтым фінансавым годзе Пентагону выдзяляецца 226,3 мільярда долараў. У той жа час 200 сацыяльна-эканамічных праграм дапамогі малазабяспечаным сем'ям будуць скарочаны або цалкам ліквідаваны. Выдаткі на ахову здароўя, жыллёвае будаўніцтва, народную адукацыю будуць моцна зрэзаны.

У інтарэсах «вялікага бізнесу» пабудавана і падаткавая рэформа, распрацаваная адміністрацыяй Рэйгана. Яна прадугледжвае скарачэнне падаткаў з карпарацый і найбольш забяспечаных слаёў насельніцтва ў агульным на 25 працэнтаў. У выніку, па падліках агенцтва ЮПІ, багатыя за кошт дзяржаўнай казны атрымаюць падарунак у 750 мільёнаў долараў.

«Рэйган аказаўся вельмі шчодры ў адносінах да багатых», — заявіў кангрэсмен Дж. Ліч. Асудзіў палітыку бясконцых скарачэнняў сацыяльных праграм і сенатар Эдвард Кенэдзі, які заявіў, што «яна забірае сродкі ў сярэдніх пластоў і бедных для таго, каб даць найбольш тым, хто і без таго багаты».

ПАСЫНКІ «ШВЕЙЦАРСКАГА РАЮ»

...К. працуе ў адным з лазанскіх рэстаранаў. За сваю катаржную працу — без выхадных, па 10 гадзін у дзень — яна атрымлівае 800 франкаў у месяц, крыху больш за палавіну «афіцыйнай аплаты». 375 франкаў К. аддае за жыллё, яшчэ 300 за месца для дачкі ў дзіцячым садзе...

...С. працавала на працягу некалькіх гадоў у адной з кустарных майстэрань таго ж горада. Яе рабочы тыдзень складаў 60 гадзін. Непасільная праца ў шкодных для здароўя ўмовах прывяла да цяжкага захворвання. Доктар парэкамендаваў ёй... пакінуць работу.

Гэтыя людзі, пра якіх паведаміла газета «Трыбун дэ Лазан-матэн», — толькі двое з 25 тысяч нелегальных імігрантаў, якія прыбылі ў «багатую Швейцарыю» ў пошуках сродкаў для існавання.

Становішча замежных рабочых, якіх тут сотні тысяч, наогул цяжкае. Але нават яно можа падацца сапраўдным «раем» нелегальнаму імігранту. Пазбаўленыя ўсялякай юрыдычнай або прафсаюзнай аховы, яны жывуць у пастаянным страху перад звальненнем і высылкай з краіны. Іх цяжкае становішча прыносіць казачныя барышы прадпрыемцам. Гаспадары «выціскаюць» літаральна ўсё з бяспраўных чужаземцаў, якія не маюць ніякай магчымасці дабіцца хоць бы нештаватай аплаты сваёй працы, дапамогі пры выпадку захворвання і г. д. «Улады пра ўсё гэта ведаюць, але заплюшчваюць вочы», — піша газета «Базлер цайтунг». Калі ж справа чамусьці даходзіць да «афіцыйнага расследавання», прадпрыемец, адзначае друк, адкупляецца толькі невялікім штрафам. Так што бізнесмен нічым не рызыкуе — страта ад гэтага чыста сімвалічнага «пакарання» літаральна непрыкметная на фоне велізарных прыбыткаў, якія дае эксплуатацыя бяспраўных рабочых.

ДЗЕЦІ ГУЛЯЮЦЬ... У НАРКАМАНАЎ

Нядаўна жыхары аднаго з кварталаў французскага горада Кальмара сталі сведкамі страшнага відовішча: з падвалаў некалькіх жылых дамоў адзін за другім літаральна выпаўзалі дзеці, якія задыхаліся, стагналі, былі адурманены нейкім зеллем. Паліцыя, што прыбыла на месца здарэння, знайшла мноства флаконаў і цюбікаў з рэшткамі таксічных прэпаратаў, якія прымяняюцца ў бытавой хіміі, розных растваральнікаў, упаковак з-пад медыкаментаў.

Як паказала следства, тут на працягу многіх месяцаў збіраліся дзеці ва ўзросце ад 10 да 14 гадоў для таго, каб «пагуляць у... наркаманаў» — удыхаць пару высокатаксічных рэчаў, глытаць лекі, якія моцна дзейнічаюць.

Выпадак гэты, на жаль, далёка не адзіны.

У маі гэтага года ў адну з бальніц дэпартамента Падэ-Кале быў дастаўлены ў цяжкім стане адзінаццацігадовы хлопчык, які на працягу доўгага часу ўдыхаў пару бензіну. Яго сябрукі гаварылі яму: «Ад гэтага робішся вясёлым, а потым засынаеш». У выніку ён страціў прытомнасць, затым упаў у каматозны стан. Выратаваць яго не ўдалося.

А што молацзь старэйшая? Юнакі і дзяўчаты ў Францыі, як і ў іншых буржуазных краінах, становяцца першай ахвярай эканамічнага крызісу — беспрацоўнымі. У самым пачатку самастойнага жыцця яны ператвараюцца ў «лішніх людзей», да якіх нікому няма справы. Многія, страціўшы надзею знайсці работу, вырашыць іншыя важныя жыццёвыя праблемы, адчайваюцца, шукаюць забыцця ў наркотыках.

У апошнія гады ў Францыі колькасць маладых людзей, якія захапіліся наркотыкамі, значна ўзрасла, піша газета «Юманітэ». І даволі паказальна, што ў той самы час, калі паліцыя абшуквала падвалы дамоў у Кальмары, перад мясцовым судом прадстала 15 юнакоў, якія абвінавачваліся ў захаванні і распаўсюджанні гераіну, гашышу, марыхуаны і ЛСД.

ПЕРАСТАНЬЦЕ ГЛЫТАЦЬ ШПАГІ

Француз М. Лаціта за 15 дзён з'еў веласіпед: раму і іншыя металічныя дэталі — у выглядзе стружкі, а гуму парэзаў на часткі і зварыў. Пастараўся не адстаць ад яго амерыканец Джо Сволтні, які за 89 гадзін расправіўся з трохметровым бярозавым бервяном, якое дасягала амаль 12 сантыметраў у дыяметры. Другі жыхар Злучаных Штатаў К. Дэсманд праглынуў 13 шпаг.

Іх «дасягненні» занесены ў «Кнігу рэкордаў» «Гінеса», якую выдае з 1955 года ірландская піваварная кампанія «Гінес». Публікацыя ўяўляецца як дапаможнік для ўладальнікаў устаноў, якія гандлююць прадукцыяй фірмы і не церпяць бітага посуду. Бо сярод наведвальнікаў, якія захапляюцца цёмным півам «Гінес», часта ўзнікаюць спрэчкі па самых нечаканых пытаннях, і «кніга рэкордаў», кажуць, дапамагае іх мірнаму вырашэнню.

Па словах аднаго з заснавальнікаў і галоўных рэдактараў «кнігі рэкордаў» Норыса Маквітара, яна на 3—4 працэнты складаецца з «рэкордаў дурасці», падобных на глытанне шпагаў і веласіпедаў, на 25 працэнтаў — са спартыўных дасягненняў, а астатняе — «амаль акадэмічныя рэкорды» з галіны навукі, мастацтва, жыцця людзей і г. д. Зборнік штогод перавыдаецца з улікам новых самых разнастайных рэкордаў тыражом амаль 44 мільёны экземпляраў на 23 мовах народаў свету.

У будучым выданні, падкрэслівае Н. Маквітар, свядома будуць апушчаны «рэкорды дурасці, якія пагражаюць здароўю і жыццю людзей». «Па тэлебачанні, — гаворыць ён, — і без таго паказваюць дастаткова дурных рэчаў, каб мы яшчэ больш падагравалі страсці». «Акрамя таго, — дадае Маквітар, — імкненне трапіць у нашу кнігу можа ўрэшце прывесці да няшчасных выпадкаў. Канечне, людзі могуць рабіць тое, што хочуць, але нам зусім неабавязкова пра гэта пісаць».

Новая рэдакцыйная палітыка не азначае, што аўтары «Кнігі рэкорлаў» «Гінеса» надалей адмаўляюцца наогул публікаваць «рэкорды дурасці». Забарона распаўсюджваецца на «рэкардсменаў», гатовых ахвяраваць здароўем або нават жыццём дзеля таго, каб трапіць у «кнігу рэкордаў».

А колькасць прэтэндэнтаў пастаянна расце, і цяпер выдаўцы атрымліваюць больш за 200 тысяч пісем штогод ад людзей, якія жадаюць зафіксаваць свае «дасягненні». У апошнім канверце быў знойдзены ліст паперы з прыпіскай, што аўтар дасылае «самага маленькага ў свеце папяровага «голуба». «Магчыма, — гаворыць Маквітар, — гэта і быў рэкорд, але самыя старанныя пошукі ў канверце не далі ніякіх вынікаў».

АГЛЯД ТЭАТРА

«Панарама тэатра ў XX стагоддзі» — назва, якую Луі Міньён даў сваёй кнізе. З'яўляючыся на працягу доўгага часу сакратаром Міжнароднага Тэатральнага Таварыства, будучы непасрэдна звязаны з тэатральнай дзейнасцю Францыі, Поль-Луі Міньён затраціў шмат часу і сіл, каб напісаць гэтую кнігу.

— Я быў шчаслівы тым прыёмам, які быў аказаны гэтай кнізе крытыкай і публікай, — сказаў аўтар. — Кніга атрымала дзве прэміі: прэмію Французскай Акадэміі і прэмію Таварыства крытыкаў. Цяжкасць заключалася ў тым, каб унесці ў кнігу дакладныя дакументальныя звесткі, якія раскрываюць даволі аб'ёмную тэму. Назва? Яна задавальняе мяне, таму што я даю ў маёй кнізе панарамны агляд тэатра. Я пастараўся вылучыць галоўнае ў драматургіі нашага часу. Людзі з лёгкасцю гавораць аб аўтарах і п'есах, аб пошуках рэжысёраў. Аднак мы жывём у багатую на новыя праявы эпоху, якая садзейнічае творчасці. Іншы раз людзі забываюцца, што існуюць грамадскія супярэчнасці. Тэатр — гэта адлюстраванне жыцця. Ён адлюстроўвае ўсе праявы паўсядзённага жыцця.

Найбольш складаным для мяне ў рабоце над кнігай быў расказ аб сучаснай тэатральнай творчасці. Складана вылучыць самыя знамянальныя падзеі ў тэатральным жыцці эпохі, у якой ты жывеш. Напэўна, некаторыя драматургі будуць незадаволеныя. Яны скажуць: «Кніга дрэнная, таму што ў ёй не гаворыцца пра мяне!» Але, на жаль, гэтага пазбегнуць немагчыма. Немагчыма сказаць у адной кнізе аб усіх дасягненнях тэатра.

Я шмат падарожнічаў. Паўсюль, разам з традыцыйным тэатральным мастацтвам, назіраюцца тэндэнцыі празмернай «мадэрнізацыі» тэатра. Каб вырашыць гэтую праблему, неабходна знайсці «залатую» сярэдзіну паміж неабходным наватарствам і дастаткова традыцыйнымі тэатральнымі густамі...

Цяпер Поль-Луі Міньён рыхтуе да выдання новую кнігу, якая абяцае быць не менш цікавай. У гэтай кнізе ён падзеліцца з чытачамі ўражаннямі аб сваіх сустрэчах з вядомымі дзеячамі тэатра Францыі.

(Па матэрыялах ТАСС).

На блакітным экране

З 29 снежня па 3 студзеня
29 снежня, 19.20

«СУСТРЭЧЫ І РОСТАНІ»

Пра М. Багдановіча ўспамінае З. Верас.

29 снежня, 19.40

СТУДЫЯ «ЭФІР» ПАКАЗВАЕ. «ВЯНОК». Літаратурная кампазіцыя па вершах М. Багдановіча. Рэжысёр Б. Бахціяраў. Вядучыя аператары Г. Соладаў і В. Леановіч. У ролях: С. Журавель і артысты мінскіх тэатраў.

29 снежня, 20.15

«ЛЯ РАСКРЫТАЙ ПАРТЫТУРЫ»

Прагучыць араторыя У. Дарохіна «Зямля Беларусі» ў выкананні Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра БССР і хору Беларускага тэлебачання і радыё. Салісты: Т. Пячынская і заслужаны артыст БССР А. Падгайскі.

30 снежня, 18.35

«У ЖЫВАПІСЕ, ГРАФІЦЫ, СКУЛЬПТУРЫ»

Перадача расказвае аб творчасці мастака кіно Ю. Альбіцкага. Гаворка пойдзе таксама пра яго жывапісныя палотны і акварэлі. У перадачы прымаюць удзел заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Я. М. Ганкін і лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі мастак А. І. Чартовіч.

30 снежня, 21.35

«ТВОРЧЫЯ ПАРТРЭТЫ. НАРОДНАЯ АРТЫСТКА СССР А. І. КЛІМАВА».

Актрыса раскажа аб сваім творчым шляху, успомніць сваіх любімых герояў. Вы сустрэнецеся з Камісарам з «Аптымістычнай трагедыі», прынцэсай Касманаполіс з «Салодкагалосай птушкі юнацтва», гераіняй спектакля «Рэтра» — Розай Аляксандраўнай, з лэдзі Макбет.

31 снежня, 22.55

«БЕЛАРУСКІЯ КАРЦІНКІ»

Музычная праграма з удзелам калектываў мастацкай самадзейнасці.

1 студзеня, 11.10

КАНЦЭРТ АБ'ЯДНАНАГА ХОРУ БЕЛАРУСКАГА ТЭЛЕБАЧАННЯ І РАДЫЁ І БЕЛДЗЯРЖКАНСЕРВАТОРЫІ. У праграме творы класічнай музыкі і беларускіх кампазітараў. Дырыжор — народны артыст БССР, прафесар В. Роўда.

1 студзеня, 19.20

«ФАНТАЗІЯ НА ТЭМЫ... «Пе[illegible] Я. Глебава». Прэм'ера музычна[illegible]песні ма Беларускага тэлебачання [illegible] фільма

1 студзеня, 22.55

«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ [illegible]АДЗІНАЦЦАЦІ». Першая конкурсная [illegible]праграма на тэму «Мой родны кут», [illegible]падзеная тэлегледачамі. У ёй прымаю[illegible] удзел вакальна-інструментальныя [illegible]ансамблі «Песняры», «Сябры», «Верасы» і Святлана Кульпа.

2 студзеня, 10.15

КАНЦЭРТ ДЗЯРЖАЎНАГА НАРОДНАГА ХОРУ БССР. У праграме песні і танцы народаў СССР.

2 студзеня, 15.05

«НАТХНЕННЕ». Перадача знаёміць з літаб'яднаннем гумарыстаў пры Белдзяржфілармоніі.

2 студзеня, 22.45

«СОЛЬ У МАЖОРЫ». Новая музычная эстрадная праграма. Сярод яе ўдзельнікаў — вакальна - інструментальныя ансамблі «Верасы» і «Самацветы»; эстрадна-харэаграфічны ансамбль «Чараўніцы», спявак і кампазітар Юрый Антонаў, выканаўца эстрадных песень Надзея Мікуліч, артысты цырка.

3 студзеня, 10.05

КАНЦЭРТ ДЗЯРЖАЎНАГА НАРОДНАГА АРКЕСТРА БССР ІМЯ ЖЫНОВІЧА з удзелам народнага артыста СССР А. Вядзернікава. У праграме класічныя творы, народныя мелодыі і песні.

У «Кнігарні пісьменніка»

Г. БУРАЎКІН. Веру поўдню. Пераклад з беларускай. М., «Молодая гвардия», 1981. — 80 к.

В. ДЗЯМЕНЦЬЕЎ. Мой лейтэнант. На рускай мове. М, «Советский писатель», 1981. — 60 к.

А. ЗЛОБІН. Сустрэча, якая не канчаецца. На рускай мове. М., «Советский писатель», 1981. — 1 р. 20 к.

І. МАЛАКОВІЧ. Партрэт маці. На рускай мове. М., «Молодая гвардия», 1981. — 30 к.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856
АТ 06421.

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва — 33-22-04, аддзела культуры — 33-19-65, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае празаічныя творы аб'ёмам не больш як друкаваны аркуш, артыкулы, нарысы — да 15 старонак, вершаваныя творы не больш як 100 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.